№ 37 (347) 10 кастрычніка 2003 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Ахмед Закаеў
Адказвае на пытаньні «НН».
старонка 11

Джозэф Кутзэе
Эсэ пра цэнзуру.
старонка 15

Эх, каб цёмен ня быў...

АЛЕКСАНДР ЧАРОЎКА

КАМЭНТАР

Краіна адольвае злом

Нешта мяняецца ў грамадзтве. Паволі, але няспынна, няўхільна, але ці заўважна. Назіраеш за навакольлем — нібыта разам крыху памяняліся, паярчэлі адценьні ўсіх колераў, ці ўсе звыклыя гукі паступова зьмянілі танальнасьць. Магчыма, восень, а магчыма, сапраўды краіна марудна адольвае чарговы злом. Параўнаць, да прыкладу, свае ўражаньні двухгадовае даўніны ад тэленавін ці перадавых артыкулаў дзяржаўных газэт — карцела калі не крычаць, дык стагнаць у бясьсільны кулак. Без рыўкоў і перакосаў нешта крыху памянялася. Навіны ўжо можна глядзець, і гэта рэдка бывае шкодна для здароўя! Слухаць нецікава: абяцанай беларускай мовай на тым жа БТ у зьмененым фармаце навін і ня пахне. Але некуды падзеліся зьедлівыя рэпартажы пра прадажных апазыцыянэраў, зьніклі, дзякуй Богу, патугі на аналітычныя выпускі а-ля Зімоўскі.

Працяг на старонцы 2.

Дажынкі ў маленькім Багдадзе

Езьдзіць па Пружанах машынай сёлета было сапраўднаю прыгодай, асабліва ў жніўні. Дарогі перакопваліся вокамгненна. Любы кампутарны квэст адпачывае: выехаўшы з двара, ужо ня ведаеш, якой дарогай будзеш вяртацца назад, колькі часу змарнуеш на гэтае вяртаньне і ўвогуле ці трапіш ва ўласны двор.

Будаўнічыя краны, здавалася, сагналі сюды з паловы Беларусі (другую палову адправілі на будаўніцтва бібліятэкі). Дом, дзе мае бацькі жывуць, у шляхетны выгляд прыводзілі дзьве брыгады: уздоўж фасаду на лябёдцы каталіся будаўнікі з Баранавіч, а з боку двара ўзьвялі магутныя рыштаваньні слонімцы. Сьпяшаліся, працавалі цэлы сьветлавы дзень. **Старонка 3.**

● НАВІНЫ ●

Хто такія жыды

Расейскі пасол Аляксандар Блахін рэзка выступіў супраць спыненьня трансьляцыі расейскага каналу «Культура» з 18 кастрычніка. Міністар інфармацыі Беларусі Ўладзімер Русакевіч адказаў, што Беларусь павінна наладжваць уласную інфармацыйную прастору. «Трэба жыць як братам, а гандлявацца як жыдам. Жыды па-беларуску — гэта габрэі. Гэта народная прымаўка. І гэта павінна быць пакладзена ва ўсе прынцыпы дачыненьняў, і мы да гэтага цяпер прыйшлі і ў эканоміцы».

Рэкордны рост эўра

Вартасьць эўра адносна даляру ЗША б'е рэкорды росту. 1 эўра каштуе ўжо 1,18 даляра. Гэта б'е па эўрапейскай эканоміцы і ўскосна — па беларускім экспарце, значная доля якога прыпадае на краіны ЭЗ. Экспэрты мяркуюць, што эўра можа вырасьці да 1,30 даляра.

Самыя чэсныя

У 2003 г. Беларусь засталася самай некарумпаванай краінай СНД (53-е месца ў рэйтынгу «Transparency International»). Расея на 86-м месцы, Украіна на 106-м.

Выйшаў слоўнік мовы «НН»

Дбаньнем выдавецтва «Тэхналёгія» выйшаў першы том «Слоўніка мовы «Нашай Нівы». Мноства варыянтаў, напісаньняў і прыкладаў, зручная, ясная сыстэма спасылак. Усе, хто дбае пра сваю мову, замаўляйце праз «Кнігі — поштай» (т.: 8-029-643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by).

СМ; БелаПАН

Польскія дамы і беларускія закуточкі

У Лідзе Саюз палякаў мае двухпавярховы катэдж, пабудаваны ў сярэдзіне 90-х. Зь мясцовых беларускіх арганізацыяў толькі ў Таварыства беларускай мовы ёсьць маленькі, нерамантаваны пакойчык. У Баранавічах мясцовы «Клюб польскі» займае ўласны двухпавярховы дом у цэнтры гораду. Зь беларускіх арганізацый мае арандаваны пакойчык у гатэлі «Гарызонт» мясцовая філія Фонду братоў Луцкевічаў. Іншыя і таго ня маюць. Такія ж дыспрапорцыі ў дзясятку іншых заходнебеларускіх гарадоў і мястэчак — тых «культурных мястэчак», зь якіх, у спадзяваньнях актывістаў беларускага руху і іхных дабрадзеяў, мелі распачацца нацыянальнае адраджэньне і рост грамадзянскай супольнасьці.

У Рэдакцыю «НН» прыйшоў чытач паходжаньнем з Івянца і прапанаваў напісаць пра Польскі Дом у яго на радзіме. Гэтак выйшла, што падрыхтоўка матэрыялу супала з прыездам праф.Пастусяка на адкрыцьцё помніка Міцкевічу ў Менску. Зьбег выпадковы, але высокі візыт непалітычнага характару — такога не было ад 1996 г. — быў насычаны перадусім сустрэчамі з прадстаўнікамі польскай меншасьці, што стварае адпаведны кантэкст для тэмы нашага сёньняшняга нумару (старонка 7).

У беларускай палітыцы Польшчы заўважныя дзьве лініі, спрошчана назавём іх лініяй Гедройца і лініяй эндэкаў. Прыярытэты, сфармуляваныя ў коле парыскай «Культуры», — гэта ўмацаваньне незалежных і добрасуседзкіх нацый у Беларусі, Літве і Польшчы. Польшчы ня трэба, каб Горадня, Вільня, Львоў былі польскімі, ёй важна, каб яны належалі сяброўскім — і моцным — дзяржавам, пры непарушных паваенных межах. Так разумеў польскія нацыянальныя інтарэсы народжаны ў Менску Ежы Гедройц. Лінія нацыянал-дэмакратаў прадугледжвае падтрымку «польскасьці» скрозь, дзе гэта магчыма, ды разглядае тутэйшых каталікоў як палякаў, а беларускі рух і беларускую дзяржаўнасьць — не як партнэра ці хаўрусьніка, а як канкурэнта і праціўніка.

Умацаваньне польскіх уплываў нават там, дзе гэта на шкоду беларускаму станаўленьню, — гэта супярэчнасьць з прынцыпамі кола «Культуры». Хоць на словах у польскай дыпляматыі дамінуе лінія Гедройца, у рэальных справах, як паказвае разбудова Дамоў польскіх з усёй іхнай дзейнасьцю, пераважае ўтапічная лінія эндэкаў.

Псыхалягічна такая сытуацыя моцна гняце беларускіх актывістаў.

Нацыяналізм асобных прадстаўнікоў польскае меншасьці — такіх, як кіраўнік Саюзу палякаў Тадэвуш Кручкоўскі зь ягонай славутай ацэнкай колькасьці палякаў у Беларусі ў 1,5 млн (г.зн. працягам атаесамленьня каталіцкага веравызнаньня з польскай нацыянальнасьцю, нягледзячы на Купалу, Гадлеўскага, Пазьняка і нягледзячы на самавызначэньне людзей), — гэты нацыяналізм вялікіх статыстычных эфэктаў ня робіць, нават калі на тых жа пазыцыях стаіць пара дзясяткаў ксяндзоў-ірэдэнтыстаў.

Працяг на старонцы 6.

Краіна адольвае злом

Працяг са старонкі 1.

Палітычнае зацішша дало магчымасьць журналістам папрацаваць не на палітычны заказ, а на гледача. Мяняецца тэлевізія, мяняецца сьвядомасьць.

Вось-вось адкрыецца новы тэлеканал, галоўнай умовай якога ёсьць беларуская мова асноўнай часткі этэру. Ужо цяпер на абласных каналах пусьцілі першых паставак гэтага каналу — па-беларуску агучаныя сэрыялы й мультфільмы. У Магілёве кінавідэааб'яднаньне «Позірк» распачало акцыю: адзін дзень на тыдні — беларускае кіно ці сусьветнае, але па-беларуску. Па-беларуску аформленая новая шыльда аптэкі, па-беларуску — мэню ў рэстаране, абязковая частка дзіцячага нядзельнага гуртку для чатырох—пяцігадовых — вучым родную мову. Гэта ўсё атачае нас, існуе і нараджаецца бяз нас, а значыць, жыве само. Тыя ж два гады таму здавалася: яшчэ крыху русіфікацыі, яшчэ крыху ігнараваньня з боку ўлады катастрафічнасьці стану беларускай мовы — і яна згіне, выпадзе асноватворны стрыжань з усёй культуры. Здавалася — калі палітычнымі захадамі не памяняць сытуацыю *цяпер*, будзе пяройдзеная тая мяжа, за якой у мовы, культуры ўжо не застанецца сілы выжываць. Палітычна не памянялася нічога. Эсхаталягічны лямант прыціх. Мова жыве.

Часам узьнікае думка, што беларуская культура — гэткая выразная гравюра, на якую гісторыя кладзе лісты паперы з малюнкамі. Мінае трохі часу, папера асядае, малюнкі бляклуць, і на паверхні праступаюць абрысы ўсё той, пачатковай гравюры.

Аляксей Бацюкоў

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

І Зносак адчуе

Дзяржаўныя СМІ ахвотна даюць слова апазыцыянэрам. Праўда, толькі тым, якія маюць рахункі зь пяціпартыйнай дэмакратычнай кааліцыяй. Якіх толькі дзівосаў не сустрэнеш на старонках «органаў»: тут і камплімэнты Севярынцу як «несастарэламу», Пазьняку як «пасьлядоўнаму», і галашэньне аб няшчаснай долі камуністаў, якім прыйдзецца агітаваць за БНФ.

А вось узяла б апазыцыя ды публічна стварыла аўтарытэтную пагаджальную камісію на чале не з палітыкам, а з партыйна незаангажаваным, усімі шанаваным чалавекам. Дробязь — але было б салідна, па-буйному. Тады й Зносак адчуў бы: зь пяціпартыйным кулаком у краіну вяртаецца вялікая палітыка. Такая, пры якой не раскідаюцца ніводным голасам. Такая, пры якой грамадзтва разглядаюць ня ў якасьці аб'екту, а ў якасьці арбітра.

Андрэй Дынько

Варшава гатовая, Менск не сьпяшаецца

Візыт Лёнгіна Пастусяка зноў прымусіў гаварыць пра пэрспэктывы паляпшэньня адносінаў Менску з эўраструктурамі. Сп.Пастусяк сказаў, што Польшча магла б стаць «адвакатам» Беларусі ў яе дачыненьнях з Эўразьвязам. Польшча і Літва сапраўды маглі б стаць своеасаблівымі «адвакатамі» Беларусі. Пастусяк — ня першы польскі палітык, які выступае з такімі заявамі. Сёньня можна гаварыць пра гатоўнасьць польскай палітычнай эліты (прычым і левых, і цэнтрыстаў, і правых) прадстаўляць Беларусь у Эўразьвязе і прабіваць там яе інтарэсы. Але Польшча хацела б спачатку пабачыць імкненьне да гэтага афіцыйнага Менску, і ня ў выглядзе пустых дэкларацый, але ў форме канкрэтных крокаў, якія робяць украінцы (у іх ёсьць нават Міністэрства ў справах эўраінтэграцыі!).

Дарэчы, Польшча ўжо выконвала такую ролю ў дачыненьні да Літвы, Латвіі і Эстоніі, калі стаяла пытаньне пра іх уступленьне ў NATO. Цяпер яна сур'ёзна займаецца Ўкраінай. Ёсьць дамоўленасьць паміж прэзыдэнтамі Квасьнеўскім і Кучмам, а таксама іх замежнапалітычнымі ведамствамі наконт таго, што Польшча будзе прадстаўляць інтарэсы Ўкраіны ў Эўразьвязе.

Беларускія ж улады не сьпяшаюцца рабіць рэальныя крокі насустрач аб'яднанай Эўропе, і Польшчы ў прыватнасьці. Хоць Генадзь Навіцкі ў прысутнасьці сп.Пастусяка заяўляе, што пэўныя крокі насустрач ужо робяцца, і як прыклад прыводзіць «актывізацыю дзейнасьці на ўзроўні парлямэнтаў». Зь вясны дзейнічае сумесная беларуска-польская парлямэнцкая «працоўная група». Найпазьней у пачатку лістапада адбудзецца яе пашыранае паседжаньне, на якім будзе разглядацца «канкрэтная праграма двухбаковых адносінаў, як у палітычных, так і ў эканамічных сфэрах». Падобныя кантакты наладжваюцца ў беларускіх парлямэнтаў і зь іх літоўскімі калегамі. Праўда, сярод літоўскіх палітыкаў у гэтым пытаньні няма адзінства. Аднак польскім палітыкам зразумела, што ніякія «намаганьні» дэпутатаў ня зьменяць сытуацыі. Яны чакаюць канкрэтных захадаў кіраўніка беларускай дзяржавы, які, відаць, канчатковага рашэньня яшчэ не прыняў.

Алег Тачоны

Шкодны экспарт

Пачалася актыўная экспансія беларускіх вытворцаў харчовых прадуктаў на рынак Расеі. Барысаўскі мясакамбінат адчыняе фірмовыя крамы ў Падмаскоў'і, «Савушкаў прадукт» выйграў тэндэр на права паіць малачком маскоўскіх школьнікаў, а хлебапекары Гомелю будуць прадаваць свой хлеб у суседняй вобласьці Расеі.

Добра гэта ці кепска? З аднаго боку, трэба ганарыцца тым, што ў нашай краіне нарэшце зьявіліся моцныя дынамічныя прадпрыемствы, здольныя прадукаваць канкурэнтаздольныя тавары і выходзіць зь імі на рынкі іншых краінаў. Але ці выйграе ад гэтага нашая дзяржава?

Мінулі тыя часы, калі галоўным фактарам сельскагаспадарчай вытворчасьці была зямля. Цяпер у сабекошце прадукцыі дамінуюць кармы, угнаеньні, газ, электрычнасьць, амартызацыя тэхнікі. Ніхто ня ведае напэўна, колькі харчовыя прадукты каштуюць насамрэч. Айчынная сельская гаспадарка атрымлівае вялізарныя субсыдыі. Прадаючы расейцам субсыдаваную прадукцыю, бюджэт Беларусі субсыдуе іх. За апошнія гады толькі 70% грашовых паступленьняў калгасаў і саўгасаў складалася з выручкі за рэалізаваную прадукцыю. Астатнія ж 30% займалі разнастайныя субсыдыі і крэдыты. І гэта толькі тое, што адлюстроўваецца ў бухгальтэрыі! Зразумела, што бясплатная праца жаўнераў у гэтыя разьлікі не ўваходзіць. Паводле розных ацэнак, ад 60% да 80% сельскагаспадарчых прадпрыемстваў стратныя. У сярэднім для выпуску прадукцыі на тысячу рублёў калгасу трэба выдатковаць больш за 1100 руб. Чым больш такія прадпрыемствы прадукуюць, тым горш для Беларусі ў цэлым. Калі танныя субсыдаваныя прадукты спажываюцца ў межах краіны, дык у гэтым, прынамсі, ёсьць нейкая лёгіка. Калі ж яны экспартуюцца, выходзіць, што не такія заможныя беларусы субсыдуюць куды больш заможных масквічоў.

Дамінік Міхайловіч

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Як стаць дон Хуанам

Наведаў пярэднюю лінію эўрапейскага drang nach Osten — памежны Тэрэспаль. Мястэчка за Бугам моцна нагадала дэкарацыі да фільмаў з удзелам Джона Вэйна: бары, забітыя падазронымі асобамі, бутлегеры, бездапаможныя паліцыянты — адным словам, атмасфэра дзікага-дзікага захаду…

Фэномэн пашырэньня (Enlargement, Verweitung) дасюль ня вывучаны, аднак, як дэманструе флёра і фаўна Тэрэспалю ў часы капіталізму, пашырэньне ў любой форме — гішпанская канкіста, пакарэньне Сібіру, уварваньне ў Кітай і г.д. — дзейнічае адпаведна адзінаму альгарытму.

Лепш за ўсё вывучаць тэхналёгію пашырэньня на прыкладзе калянізацыі Амэрыкі. Мяжа рухалася з Усходу, пажываючы ўлусы індзейскіх плямёнаў, пакуль ня ўперлася ў Ціхі акіян. Першымі ішлі бізнэсоўцы (у той час купцы, сёньня чаўнакі), якія падсаджвалі абарыгенаў на стандарты спажываньня ў мэтраполіі (у той час на сьпірт і пацеркі, у наш час на мабілы, жуйкі з укладкамі Ды Капрыё). Потым ішла чарга лаўцоў душ. Місіянэры (у наш час адукацыйныя цэнтры) ахмуралі тубыльцаў новымі ідэаламі (раней абяцалі выратаваньне душы, сёньня — макраэканамічную стабільнасьць).

Нарэшце зьяўляліся палітыкі і падпісвалі з касікамі трактаты аб міры на вечныя часы, каб праз пару гадоў перагледзець іх на сваю карысьць. Праект Канстытуцыі ЭЗ, прыняты ў Ніцы, адмаўляе сябрам Эўразьвязу ў праве вэта, гарантуючы панаваньне краінам-мастадонтам.

У кантэксьце эўрапейскага go east Беларусы нагадваюць племя сіў пачатку XIX ст., калі амэрыканцы выйшлі на мяжу іх папуляцыі — раку Місысыпі. Спачатку яны абвясьцілі Місысыпі натуральнай мяжой Саюзу. Аднак не прайшло і пары гадоў, як, пакутуючы на геапалітычную кляўстрафобію, янкі пачалі, як сёньня прынята казаць, наступны этап інтэграцыі.

Паколькі з тых часоў закон капіталістычнай фармацыі не зьмяніўся (калі ёсьць рынак, трэба яго захапіць), нас чакае прыблізна той жа сцэнар разьвіцьця. Магчыма, гэта значыць, што мадэлі паводзінаў Лукашэнкі і апазыцыі можна шукаць у архетыпах індзейскага супраціву.

Што да Лукашэнкі, дык яму сьвеціць паўтарыць лёс кагосьці з наступных сахемаў.

Мантэсума. Правадыр ацтэкаў. Намагаўся дамовіцца з канкістадорамі па-добраму. Скончылася гэта трагічна: яго ўсё роўна шпокнулі. Такі сцэнар бацьку абсалютна не падыходзіць.

Сядзячы Бык, правадыр сіў. Падняў паўстаньне, зрабіў сабе імя на мэдыя-рынку, а потым зваліў у шоўбізнэс да Буфала Біла. Заводзіў публіку тым, што корчыў на арэне крыважэрнага забойцу. Гэта больш прывабны для Лукашэнкі варыянт. Разам з Утай Цапф можна зрабіць супэрвідовішча.

Жэраніма, правадыр апачаў. Узьняў апрыёры прырэчаны на паразу мяцеж, затое пасьля сьмерці стаў любімым пэрсанажам Галіводу. Калі Лукашэнка ў душы трошкі экзыстэнцыяліст, ён, як і Жэраніма, здольны забясьпечыць сабе несьмяротнасьць у кінэматографе.

Калі ў бацькі яшчэ ёсьць з чаго выбіраць, то ўсе вядомыя прыклады індзейскай партызанкі адводзяць апазыцыі вартую жалю ролю здраднікаў і калябарантаў. У найлепшым выпадку можна паўтарыць жыцьцё Чынгачгука, які не згубіў годнасьці, дапамагаючы брытанцам здымаць скальпы з суродзічаў-гуронаў. Праўда, і той скончыў жыцьцё альканаўтам.

Каб ня стаць новымі Малінчэ (гэтак у Лацінскай Амэрыцы называюць здраднікаў ад імя курвы Малінчэ-Маліцін, якая дапамагала Картэсу калянізаваць суайчыньнікаў), беларуская апазыцыя павінна прапанаваць Эўропе новыя правілы інтэграцыі, дзе замест універсальных лібэральна-капіталістычных правілаў сусьветнага руху тавараў будуць дамінаваць ідэі эўрапейскай сацыяльнай салідарнасьці. Тады ў памяці народу мы пакрыем сябе гучнай славай, як той кастанэдаўскі індзеец Хуан — папулярызатар галюцыногенных грыбоў.

Лёлік Ушкін

ПРАВЫМ ВОКАМ

Канстытуцыйны факт

За газавымі жарсьцямі мы дружна прамінулі факт велізарнага геапалітычнага значэньня, для Беларусі ня менш важны за расейскі рубель. Эўропа прымае Канстытуцыю.

Ужо праз некалькі месяцаў лёзунг «Беларусь у Эўропу» будзе заклікам не адно да культурнага адзінства, высокіх эканамічных стандартаў і дэмакратычных прынцыпаў, але і да супольнага канстытуцыйнага ладу. Увесну наступнага году краіны Эўразьвязу плянуюць падпісаць Асноўны закон, а ўвосень яго ратыфікаваць. Эўропа на вачох ператвараецца ў адзіны гіганцкі арганізм, аб якім мы маем вельмі прыблізнае ўяўленьне.

Колькі галасоў гіпатэтычна можа мець у Эўразьвязе Беларусь? Як мы ставімся да ўключэньня ў Зьвяз Турцыі, а ў тэкст Канстытуцыі — радка пра хрысьціянскія каштоўнасьці Эўропы? Як мы плянуем адстойваць у ЭЗ нацыянальныя інтарэсы?.. Пакуль беларуская эліта насьцярожана прыглядваецца да Ўсходу, нашыя суседзі на Захадзе поўнай хадой займаюцца *сваімі ўнутранымі эўрапейскімі справамі!*

Самы час вызначацца.

Спэктар расшыфровак лёзунгу «Беларусь у Эўропу!» сярод апазыцыйных сілаў вагаецца ад эўраскептычнага «Абы не ў Расею!» да звышаптымістычнага «Ў Эўропу любым коштам!». Але гэта настроі. А сам панятак беларускіх інтарэсаў, які зьяўляецца ключавым крытэрам стаўленьня, на шляху да Эўропы патрабуе ўжо цяпер сфармуляванае канкрэтыкі.

Дазволю сабе канспэктыўна накідаць пытаньні, якія *мусяць цікавіць* Беларусь у справе эўраінтэграцыі:

— аб'ём паўнамоцтваў, якія Беларусь павінна будзе перадаць Брусэлю;

— прэфэрэнцыі нацыянальным вытворцам;

— квоты галасоў падчас прыняцьця рашэньняў на ўсіх узроўнях;

— эўра;

— эміграцыйныя правілы;

— выплаты ў супольны бюджэт і датацыі зь яго;

— агульнаэўрапейскія культурныя, адукацыйныя й сацыяльныя праграмы.

Калі гэтага не ўсьвядоміць цяпер — можа атрымацца як з той «саюзнай дзяржавай». Такая ўжо штука гэтая інтэграцыя.

P.S. А ўвесьці ў Эўраканстытуцыю згадку пра хрысьціянскія карані ўсё-такі трэба. І не пускаць у ЭЗ ані Турцыі, ані Расеі.

Павал Севярынец

Дажынкі ў маленькім Багдадзе

Працяг са старонкі 1.

Ля нашага дому зруйнавалі старыя «графскія» стайні (карысьці яны не прыносілі і на помнік мінуўшчыны падобныя не былі). Да іх пацягнуліся цугам аўто: гаспадары набівалі багажнікі старажытнаю цэглай, вельмі ўжо добраю. Тады я ўпершыню пачула пра тое, што Пружаны — гэта маленькі Багдад: «Спачатку разбурылі, а цяпер дабро расьцягваюць».

Горад прычасалі і нават пагалілі. У пераддажынкавай гарачцы выразана каля 300 дрэваў: старых каштанаў, таполяў, клёнаў, ліпаў. Горад нібы аблысеў. Казалі, калісьці, гледзячы зь верталёта на Пружаны, не адразу можна было здагадацца, што ляціш над горадам: дахі дамоў хаваліся ў зеляніне. А вось з таго верталёта з чырвона-зялёнымі колерамі на бартах, што зрабіў кола над горадам у самы разгар сьвята, «пасажыру нумар адзін», напэўна, былі добра відаць сьвежая дахоўка і новы брук на ходніках.

А вось помнік «Зьліцьцё рэкаў Мухі і Вецу», пастаўлены напярэдадні сьвята, на думку мясцовых жыхароў, ня надта цнатлівы. Ракадзяўчына, здаецца, і адхіснулася, і рукі адвяла за сьпіну ў характэрным жэсьце «не замай!», але грудкі ўверх тырчаць і твар дзёрзкі-дзёрзкі...

Сьвяткаваць Пружаны пачалі ў пятніцу. Здавалася, у цэнтар гораду прыйшлі ўсе дваццаць тысяч пружанцаў і чаканыя пяць тысяч гасьцей сьвята. На эстрадзе лавіў «птушку шчасьця» вечна малады Гнацюк. Прычым я ўпершыню пабачыла сьвята бяз п'яных. Стыхійныя дыскатэкі проста на дварэ доўжыліся да сярэдзіны ночы.

Зранку ў суботу стомлены горад хутка ачуняў, падбадзёрыўся. І пачаў жартаваць. Бар, які я ўсё сваё жыцьцё памятаю пад назваю «Палескія легенды», нечакана ператварыўся ў «Палескія паданьні». Манэкены, што ўпрыгожвалі павільён сталічнага «Дому на Нямізе», былі зробленыя, відаць, яшчэ ў 80-я. Вытанчаныя, далікатныя, з блакітнымі вачыма, утаропленымі ў сьветлую камуністычную будучыню, яны нечакана пераапрануліся ў сялянскія строі і пачалі няўлоўна нагадваць Алеся Загорскага на дзядзькаваньні.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

На подыюме «Дажынак».

Асабліва сымпатычныя лёзунгі мелі гандляры мясам з Камянецкага раёну, куды, відаць, яшчэ не дабраліся актывісты «Грынпісу»:

Учора бегаў парсючок,
Сёньня — добры шашлычок.

І сапраўды, шашлыкамі Пружаны прапахлі на некалькі месяцаў наперад. І ня толькі шашлыкамі, як сьведчыў наступны сьлёган:

Сёньня будзе вам ня лішак
І гарэлачкі кілішак.

Апроч «буслоў» алькагольных, былі прэзыдэнцкія. У адпаведны момант выступу Лукашэнкі над сцэнаю на бела-блакітных балёніках узмыў бусел. Ён драпежна пакалыхваў белымі крыламі і зьнізу быў болей падобны да каршуна. З даху рэстарану падхапілася стая галубоў і, зьбіўшыся ў купку, пачала спалохана намотваць колы...

Нават калі на цэнтральныя вуліцы Пружан нарэшце пусьцілі машыны, каб вывозіць сталы, крэслы, лядоўні, недараспраданыя тавары, народ ня верыў у сканчэньне сьвята. Толькі была сярод тых дваццаці пяці тысяч людзей ладная частка, для якой сьвята сталася цяжкімі працоўнымі буднямі. Некалькі сур'ёзных штацкіх падыходзяць да групы мясцовых міліцыянтаў: «Ну што, «адстраляліся»?» — «Ды не, «адстраляемся», толькі як вы зьедзеце».

А наступнага дня горад ізноў стаў самім сабою — ціхім і нялюдным, толькі трошкі чысьцейшым і прыгажэйшым.

Марына Шода

«Мэрсэдэс» у замкавым рове

Невялічкі мураваны мост ля этнаграфічнага музэю ў Воршы зьяўляецца бадай што самым небясьпечным месцам для руху транспарту ды пешаходаў. Пабудаваны ў 1902 г. побач з млыном над глыбокім замкавым ровам, ён абвешчаны помнікам архітэктуры. Дзеля рэзкіх паваротаў аварыі здараюцца тут даволі часта. Апошняя адбылася пры канцы верасьня. Малады ўладальнік «Мэрсэдэсу» ня змог справіцца з кіраваньнем на сьлізкай пасьля дажджу дарозе і апынуўся пад мостам. І хоць глыбіня рову дасягае сямі мэтраў, небарака застаўся жывы, а вось машына рамонту ўжо не падлягае. Небясьпечна й хадзіць па мосьце, бо ён надта вузкі і ня мае ходнікаў — толькі праезную частку. Драўляны масток, які месьціўся некалі побач, быў разабраны пяць гадоў таму. А новы ўлады ўсё абяцаюцца пабудаваць. І таму, ідучы на замчышча, трэба мець добрыя зрок, слых і хуткасьць.

Маскоўская «гасьціннасьць»

Сярод аршанскіх прадпрыемстваў, якія ўдзельнічалі ў Днях Беларусі ў Маскве, быў і прыватны гандлёвы дом «Фаварыт». І хоць ягонае кіраўніцтва сьцьвярджае, што гандлявалі там выключна вырабамі айчыннай вытворчасьці, сярод тавараў, прапанаваных масквічам, былі заўважаныя чэскія крышталёвыя жырандолі. Праўда, ніхто на іх не паквапіўся. Аднак ня гэта запомніцца працаўнікам «Фаварыту». Пасьля кірмашу ўладальнік гандлёвага дому вырашыў прэміяваць прадаўцоў за добрую працу экскурсіяй па сталіцы Расеі. Але ля храму Хрыста Збавіцеля машыну аршанцаў спыніў дарожны інспэктар. Даведаўшыся, што пасажыры ня маюць міграцыйных картаў, ён адвёз іх у пастарунак. Пра свае нечаканыя прыгоды тыя паведамілі на мабільнік гаспадару. Той не разгубіўся і патэлефанаваў у службу даверу ДІБДР. Пасьля некалькіх гадзінаў знаходжаньня ў камэры тры маладыя прадаўшчыцы і шафёр былі адпушчаныя на волю. Пратакол затрыманьня «падазроных асобаў» на іх вачох парвалі. Але настрой у аршанскіх гандляроў быў надоўга сапсаваны.

Ня тое схавалі

Каб схаваць ад удзельнікаў І Рэспубліканскага экалягічнага форуму, які ладзіцца 11 кастрычніка ў Воршы, закансэрваваны трохпавярховы будынак па вул.Міру, яго абгарнулі вялікай зялёнай маскіровачнай сеткай. Незразумела толькі навошта. На той жа вуліцы месьціцца будынак былога кляштару базыльянаў зь дзіравым дахам і бяз шыбаў. Калі ўжо што і трэба хаваць ад гасьцей Воршы, дык менавіта гэты занядбаны помнік архітэктуры XVII ст., што «знаходзіцца пад аховай дзяржавы».

Яўген Жарнасек, Ворша

Стогадовым — прадуктовыя наборы

Трыццаць сяброў бабруйскага клюбу пэнсіянэраў «Яшчэ ня вечар» былі запрошаныя на вечарыну да Дня пажылых людзей. Песьні іх маладосьці сьпявалі падлеткі з студыі эстраднай песьні «Сугучча», выхаванцы тэатру моды «Галятэя» дэманстравалі адзеньне. Бабруйскіх доўгажыхарак сацыяльныя работнікі віншавалі дома. Стогадовая Ганна Рымашэўская, стопяцігадовая Аўдоцьця Лескавец і найстарэйшая ў горадзе Марыя Краўчанка, якой у сакавіку споўнілася 107 гадоў, у якасьці падарункаў атрымалі прадуктовыя наборы.

Віктар Качан, Бабруйск

Палітфутбол

5 кастрычніка ў Берасьці незарэгістраваная філія «Маладога фронту» і АГП сумесна правялі міні-футбольны турнір. Апроч камандаў маладафронтаўцаў (яна завецца «Пагоня») і агэпоўцаў, у гульнях узялі ўдзел маладыя сацыял-дэмакраты, Партыя камуністаў і аб'яднаная каманда «Сябры NATO»— «БСДГ». Мерапрыемства мусіла паказаць магчымасьць сумеснай працы партый Берасьцейшчыны. На футбольным полі перамогу атрымала каманда маладых сацыял-дэмакратаў. Калі турнір быў скончаны, усе яго ўдзельнікі атрымалі прызы.

Берасьцейскі Фронтавец

Tušonka dla pabracimaŭ

Baranavickija pradpryjemstvy napiaredadni Dzion Biełarusi ŭ Maskvie naviedali z vystavaj-prodažam horad-pabracim Myciščy. Asablivym popytam u rasiejcaŭ karystalisia kanservy i kiłbasy Baranavickaha miasakanservavaha kambinatu. Tolki pačuŭšy, što tušonka z Baranavič, la pałatki ŭźnikali čerhi. Heta pry tym, što biełaruskaja kanserva amal u dva razy daražejšaja za rasiejskuju. Žychary Myciščaŭ raschvalvali biełaruskuju tušonku i skardzilisia na svajich vytvorcaŭ, jakija pichajuć u miasnyja vyraby ŭsialakuju brydu. Za niekalki dzion kanservy i kiłbasy jak vymieła.

Adnak ubicca ciapier na rasiejski rynak vielmi ciažka — jon uvieś padzieleny. Hurtovyja pakupniki pahadžajucca, što biełaruskaja tušonka jakasnaja, ale zamaŭlać jaje nie śpiašajucca. Darečy, cikava, čamu nie arhanizujucca takija vystavy-prodaży ŭ jinšych haradach-pabracimach Baranavič — Hejnole, Hdańsku i h.d. Što b z hetaha vyjšła?

Trahiedyja na brykietnym zavodzie

Supracoŭnica Baranavickaj sanstancyji zahinuła na torfapradpryjemstvie ŭ vioscy Torbałava. Padčas zamieru zapylenaści pavietra kabieta astupiłasia i pavaliłasia ŭ pryjamak pryvadu brykietnaha presa. Žančynu paciahnuła ramiennaj pieradačaj i, pakul zdoleli pres adklučyć, ciažka pakalečyła — adarvała ruku. Supracoŭnica sanstancyji skanała na aperacyjnym stale. Siratom zastaŭsia 6-hadovy syn. Letaś, mienavita kab bolej być ź dziciem, jaho maci pieraviałasia z bolnicy ŭ sanstancyju.

Rusłan Raviaka, Baranavičy

Прымусовая падпіска ў Буйнічах

У сярэдняй школе вёскі Буйнічы (Магілёўскі раён) дырэктарка падчас выдачы заробку настойліва «дае зразумець» настаўнікам, што неабходна аформіць падпіску на «Прыдняпроўскую ніву», трыбуну мясцовай «вэртыкалі». І гэта не адзінкавы выпадак на Магілёўшчыне.

Ільля Заранок, Горкі

Дзесяць гадоў без Эўразьвязу

1. Калі б у 1994 г. Зянон Пазьняк ці Станіслаў Шушкевіч выйгралі прэзыдэнцкія выбары, ці ўвайшла б Беларусь у 2004 г. у Эўразьвяз?
2. Чаму ў беларускім грамадзтве не абмяркоўваецца праблема ўступленьня ў Эўразьвяз?

PHOTO.BYMEDIA.NET

Анатоль Лябедзька, кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

1. Для перамогі ў тых умовах патрэбнае было аб'яднаньне камандаў Пазьняка, Шушкевіча і Карпенкі. Калі б перамог нехта з дэмакратычных кандыдатаў, дык імавернасьць уступленьня нашай краіны ў Эўразьвяз была б вельмі высокай. Вядома, спатрэбіліся б лібэральныя рэформы.

2. У нас цяпер пераважная бальшыня насельніцтва жыве іншымі праблемамі. Калі ўвесь заробак сыходзіць толькі на харчаваньне, дык прыярытэты карэктуюцца. Да таго ж, прыхільнікам далучэньня да Эўразьвязу не даюць слова ў СМІ.

Аляксандар Фядута, журналіст:

1. Не, бо ў нас няма нацыянальнага кансэнсусу ў гэтым пытаньні. Хаця, калі б палітычная эліта выбрала такі вэктар разьвіцьця, мы маглі б наблізіцца да сяброўства ў Эўразьвязе. Але гэта вымагала б ахвяраў, як у нашых балтыйскіх суседзяў. У іх сапраўды былі халодныя зімы. Мы не былі гатовыя да гэтага, і выбраньне Лукашэнкі гэта выразна паказала.

Магчыма, наступнае кіраўніцтва Беларусі (ці, у фантастычным варыянце, цяперашняе) зноў вернецца да гэтай праблемы. Але цяпер мы адсталі ад Эўропы не на дзесяць гадоў, а на ўсе дваццаць. Адзіная магчымасьць, якая нам яшчэ засталася, — увайсьці ў Эўропу разам з Расеяй. Расея цяпер да Эўропы значна бліжэй, чым Беларусь.

2. Абмеркаваньне ідзе. Прыклад гэтага — спроба стварэньня эўрапейскага руху на чале з Марынічам і іншых падобных рухаў. Але тут ёсьць свая праблема. Усім так хочацца прыйсьці ў Эўропу першымі, што ніхто ня хоча быць другім. Але так у Эўропу не ідуць! Літоўцы — левыя, правыя, сіняя, зялёныя — усе аб'ядналіся дзеля адной мэты: славай, маўляў, парахуемся пасьля, як ужо будзем у Эўропе. І ні на сэкунду раней! Нашыя ж палітыкі ніяк ня могуць зразумець, што далучэньне да Эўропы дасьць шмат болей ня толькі Беларусі, але і кожнаму зь іх асабіста. Ім, напэўна, гэта кепска тлумачылі. І Лукашэнку, мабыць, кепска тлумачылі.

Васіль Лявонаў, экс-міністар сельскай гаспадаркі:

1. З Шушкевічам краіна магла б увайсьці ў Эўразьвяз. З Пазьняком — не: ён бы пачаў чарговую ўнутраную вайну — з намэнклятурай, бальшавікамі... Я падзяляю ідэі Зянона Станіслававіча, але не магу пагадзіцца зь ягонымі мэтадамі — яны нэабальшавіцкія.

2. А чаму павінна весьціся абмеркаваньне? Нашыя людзі — рэалісты. Навошта абмяркоўваць нерэальныя магчымасьці? Хто такую краіну з такім рэжымам прыме ў Эўразьвяз? Нашага кіраўніка хутка і ў Маскве прымаць ня будуць.

Віталь Сіліцкі, палітоляг:

1. Не, бо кожны зь іх вельмі хутка згубіў бы ўладу.

2. Як казаў мой сябра-цынік, гэта — каханьне, непадзеленае абодвума бакамі.

Віктар Чарноў, палітоляг:

1. У Беларусі былі неблагія стартавыя ўмовы на пачатку 90-х, у эканамічных паказчыках мы былі на роўных зь Літвой, Чэхаславакіяй. У нас былі ўсе шанцы выйсьці на траекторыю эканамічнага росту... Думаю, Беларусь цяпер магла б быць напярэдадні ўваходу ў Эўразьвяз. Магчыма, у 2004 г. мы б яшчэ не ўвайшлі ў гэтую супольнасьць, але недзе праз 5—6 гадоў — пэўна. Былі б на чарзе недзе паміж Украінай і Баўгарыяй (бліжэй да Баўгарыі). Не забываймася, што Беларусь першая з былых рэспублікаў СССР падала заяўку ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю. Мы б даўно былі ў гэтай арганізацыі, каб не адкат.

Пры Кебічу краіна пачынала «запаўзаць» у намэнклятурны капіталізм, як Украіна і Расея. Аднак у нас ён бы ня меў такога разьвіцьця: іншыя памеры, іншыя эканамічныя магчымасьці. У краіны ўжо аднялі 10 гадоў жыцьця, і ніхто ня ведае, колькі яшчэ гадоў мы згубім.

2. Пытаньне не абмяркоўваецца, бо яно неактуальнае: жорсткі аўтарытарны рэжым у вызначэньні свайго курсу не зважае на меркаваньні эканамічных і палітычных элітаў. Беларусь скіроўваецца да самаізаляцыі. Як кажуць, не да пацераў, калі хата гарыць: апынуцца б у складзе Рады Эўропы…

Вінцук Вячорка, кіраўнік Партыі БНФ:

1. Для мяне прынцыповым ёсьць не разважаць пра вірутальную гісторыю Беларусі. Ані Пазьняк, ані Шушкевіч ня выйгралі выбараў, бо не было адпаведных умоваў. Калі разважаць пра віртуальную гісторыю Беларусі, дык варта разглядаць яе ад часоў Вітаўта. Што калі б Вітаўтаву карону прывезьлі ў Беларусь?.. Вось тады б мы пэўна былі ў Эўразьвязе.

2. Праблема не абмяркоўваецца хіба на старонках прэсы, перадусім афіцыёзнай. Але калі меркаваць па тым, што 70% жыхароў Беларусі за тое, каб уступіць у Эўразьвяз, дык цяжка сказаць, што яна не абмяркоўваецца. Калі не на старонках прэсы, то на кухнях, у галовах яна абдумваецца і абмяркоўваецца.

Сямён Букчын, публіцыст:

1. Я б паставіў пытаньне інакш: ці здолелі б гэтыя людзі — ці адзін, ці другі — стварыць каманду, якая б магла стварыць пэўныя эканамічныя ўмовы? Я ведаю пэўную насьцярожанасьць Пазьняка да рынку… Можа, таму і прыйшла параза, што час гэтых людзей сышоў, а самі яны не саступілі месца новым.

2. Зноў некарэктнае пытаньне. Выглядае так, нібы ў нас ёсьць свабодная прэса, нармальнае грамадзтва... У гэтых людзей, якія ляжаць тварам уніз, можна гэтаксама пытацца, чаму яны не ляцяць на Месяц. У нас грамадзтва не сфармавалася, нацыя не дафармавалася.

Уладзімер Вялічка, галоўны рэдактар часопісу «Беларуская думка»:

1. Гэта не тэлефонная размова, трэба прыходзіць і сур'ёзна размаўляць.

2. Чаму мала? У нас у часопісе артыкул ідзе. Вы ня сочыце за навуковай думкай, за прэсай.

Міхаіл Марыніч, старшыня грамадзкага аб'яднаньня «Грамадзкія ініцыятывы»:

1. Калі б Шушкевіч стаў прэзыдэнтам — так, мы былі б цяпер разам з прыбалтамі. А наконт Пазьняка... Усё ж ягоная перамога выглядае нерэальнай на той момант. Я яго вельмі паважаю, але ігнараваньне Расеі непрымальнае для беларускага грамадзтва.

2. Праз дзеяньні прэзыдэнта ў нас цалкам страчаныя кантакты з Эўропай. Таму і ў дзяржаўных СМІ накладзенае табу на гэтую тэму. Але большасьць народу ўсё адно за ўступленьне ў Эўразьвяз — пра гэта сьведчаць вынікі апытаньняў, у якіх прыхільнікі Эўразьвязу налічваюць больш за 50%.

Міхаіл Чыгір, экс-прэм'ер-міністар:

1. Увайшла б.

2. Пакуль што гэта ніяк немагчыма: краіна знаходзіцца ў ізаляцыі. Калі й гаварыць пра ўваходжаньне ў Эўразьвяз, дык мы туды можам патрапіць разам з Расеяй. І калі будуць нейкія складанасьці пры ўваходжаньні, дык не ў Расеі, а ў Беларусі.

Аляксей Кароль, сябра выканкаму Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады:

1. Пры Шушкевічу — гарантавана, пры Пазьняку маглі б быць пэўныя складанасьці ў сувязі зь ягонымі поглядамі на ролю Захаду...

2. Я не пагадзіўся б, што ў нас малая ўвага надаецца гэтаму пытаньню. Усе дэмакратычныя сілы, незалежна ад пазыцыі зьлева направа, прымаюць як аксіёму лёзунг «Беларусь у Эўропу!». Але сёньня сама стратэгія выглядае аддаленай пэрспэктывай. Надзённая — гэта абарона незалежнасьці, умацаваньне дзяржаўнасьці, недапушчэньне інкарпарацыі ў склад Расеі, недапушчэньне трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну і перамога на выбарах.

Алесь Лагвінец, палітоляг:

1. Хутчэй за ўсё — не, але нашыя стасункі з Эўразьвязам былі б лепшыя, чым цяпер мае Украіна. Прычынаў неўваходжаньня ў ЭЗ некалькі. Найперш расейскі фактар. Па-другое, Захад і тады, і цяпер не ўспрымае нашай краіны як часткі, асобнай ад Расеі (зусім інакш, чым у выпадку з балтыйскімі краінамі). Ну і, па-трэцяе, нам бы спатрэбіліся больш жорсткія, больш балючыя рэформы, чым тыя, што былі ў Польшчы ці Літве.

Магчыма, мы мелі б асацыяванае сяброўства. Не прайшоўшы ў «першай хвалі», мы, тым ня менш, маглі б увайсьці ў Эўразьвяз разам з Румыніяй і Баўгарыяй.

2. Думаю, варта крыху пачакаць: у наступным палітычным сэзоне, асабліва ў сувязі з парлямэнцкімі выбарамі, тэма далучэньня да Эўразьвязу будзе вельмі папулярная.

Апытваў Зьміцер Дзядзенка

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОГЛЯД З ПОЛЬШЧЫ

Праект эўрапейскай канстытуцыі

4 кастрычніка пачалася завяршальная фаза працы над праектам эўрапейскай канстытуцыі. Плян амбітны: асноўны закон Эўропы мае быць прыняты ў пэрыяд італьянскага старшынства на сьнежаньскім саміце ў Брусэлі. Таму кожны з удзельнікаў дэбатаў мусіць ужо цяпер ясна акрэсьліць сваю пазыцыю, прыярытэты й межы кампрамісаў.

У мінулы аўторак гэта зрабіў польскі ўрад. Ён мяркуе, што эўрапейскі Канвэнт зрабіў шмат і што над праектам можна працаваць далей. Ніводзін з 25 суаўтараў праекту ня выкінуў эўрапейскай канстытуцыі на сьметнік. Гэта прадракае пасьпяховае завяршэньне, але шлях да яго будзе няпросты.

На сёньня ўжо можна заўважыць выразныя разыходжаньні й спрэчныя моманты. Францыя й Нямеччына націскаюць, каб хутчэй завяршыць працу. Яны разьлічваюць, што папраўак да праекту ня будзе. А тых, хто прапануе папраўкі, адразу вінавацяць ледзь не ў сабатажы супольных дзеяньняў.

Аднак нядаўнія праскія кансультацыі больш як дзясятка малых і сярэдніх дзяржаваў паказалі, што такія націскі не дапамогуць Францыі зь Нямеччынай. У канстытуцыі ёсьць некалькі надзвычай важных пунктаў, дыскусія па якіх несумненна ўзновіцца.

Фундамэнтальнае значэньне ў Эўрапейскім Зьвязе мае прапорцыя сілаў і ўплываў. Ніцкі трактат — адыходзячы ад чыстай дэмаграфіі — даў голас малым і сярэднім дзяржавам. Напрыклад, Польшча мела б столькі ж галасоў у Радзе Эўропы, колькі Гішпанія, і толькі на два галасы меней за Нямеччыну ці Францыю. А цяперашні праект канстытуцыі аслабляе сярэднія й малыя дзяржавы, адначасова ўзмацняючы вялікія. Гэта істотна, бо ў Эўразьвязе штораз больш рашэньняў будзе прымацца большасьцю галасоў. Таму польскі ўрад вырашыў рашуча бараніць пастановы ніцкага трактату. Па гэтым пытаньні ў Польшчы ніякіх рознагалосьсяў няма.

Польшча крытычна ставіцца таксама да адмовы ад практыкі, згодна зь якой кожная краіна мае пераменнага камісара і ўсе краіны па чарзе кіруюць Зьвязам. Калі ад гэтага адысьці, многія краіны зь меншым даверам будуць успрымаць эўрапейскія структуры.

Польшча й Вялікая Брытанія стараюцца, каб пастановы канстытуцыі не аслабілі лучнасьці Эўропы з NATO. Разам з Італіяй і Літвой Польшча імкнецца да таго, каб у дакумэнце згадалі пра хрысьціянскія карані Эўропы.

Пазыцыі 25 дзяржаваў акрэсьленыя. Дыктат з боку вялікіх краінаў не пройдзе. Таму трэба будзе шукаць кампрамісу. Гісторыя Эўрапейскага Зьвязу — гэта паласа несупынных кампрамісаў. Хоць ніколі дагэтуль кампрамісы ня тычыліся такой далікатнай матэрыі, як эўрапейская канстытуцыя. Тут нельга сьпяшацца, бо якасьць канчатковага твору значна важнейшая за тое, пры старшынстве каго будзе прыняты праект.

Мацей Лэнтоўскі,
радыё «Палёнія»

Залаты пыл над Масквой

Як паслухаеш афіцыйныя СМІ, дык складаецца ўражаньне, што ўся Масква на апошнім тыдні верасьня толькі і гаварыла, што пра Дні Беларусі. На жаль, гэта далёка ня так.

Рэклямы Дзён Беларусі ў маскоўскіх СМІ было прыкладна столькі, колькі яе бывае, калі сюды прыяжджаюць на гастролі найлепшыя беларускія тэатры, — г.зн. ніколькі.

Я даведалася пра Дні Беларусі зь беларускіх сайтаў. Зразумела, што масквічы не сядзяць каля кампутараў дзеля таго, каб даведацца пра падзеі ў Беларусі: іх беларускія навіны зусім не цікавяць. З нашай галоўнай крыніцы інфармацыі — тэлебачаньня — пайшлі паведамленьні пра Дні Беларусі толькі ў дзень прыезду Лукашэнкі 30 верасьня, калі цікавыя насельніцтву кірмашовыя дні ўжо скончыліся. Ну нельга, вядома, сказаць, каб зусім не было ніякіх абвестак пра Дні Беларусі — у некаторых акругах віселі невялікія плякаты, якія затуканыя жыцьцём масквічы звычайна рэдка заўважаюць; напэўна, пару разоў узгадалі на радыё.

Гандлёвымі і самымі насычанымі зь Дзён Беларусі ў Маскве, згодна з праграмай, разьмешчанай амбасадай Беларусі на сваім сайце, былі два выходныя — 27 і 28 верасьня. Крыху болей часу выпала Берасьцейскай вобласьці, якая распачала свой кірмаш у Заходняй адміністрацыйнай акрузе Масквы, у скверы каля кінатэатру «Берасьце», яшчэ 25-га, у чацьвер. У небагатых грамадзян гэтай акругі было на два дні болей, чым у іншых, каб накупляць беларускай бульбы, танных тавараў, асабліва трыкатажу.

Я наведала кірмаш у Цэнтральнай акрузе, дзе была пляцоўка беларускай сталіцы. З водгукаў знаёмых зразумела, што Менскі кірмаш у цэнтры і быў найлепшым. Акрамя тавараў зь менскіх крамаў і ўнівэрмагаў тут усе дні з адкрытай сцэны гучалі беларускія песьні ў выкананьні такіх майстроў, як «Палац», «Сьвята», «Неруш». У іншых акругах выступалі пераважна самадзейныя калектывы.

Добра спрацавала разьмеркаваньне абласных кірмашоў па адміністрацыйных акругах Масквы, у людных месцах адпачынку. У выходны дзень у любым выпадку людзі патрапяць на кірмаш, што непадалёку ад іх жытла, ці даведаюцца аб ім. Не чутно было, каб хто купіў «саюзны тэлевізар» ці лядоўню, а вось бялізна, адзеньне, дзіцячыя тавары, касмэтыка, абутак, нават бульба і цыбуля карысталіся попытам. Усяго сапраўды было шмат і вельмі танна. Небагатыя масквічы і нават сярэдняя кляса, як кажуць, атавараліся.

Ня трэба толькі спадзявацца, што пасьля гэтых кірмашоў жыхары Масквы стануць вельмі чакаць беларускіх прадуктаў. Расейскае тэлебачаньне любіць час ад часу падтрымаць страх і нагадаць насельніцтву пра забруджанасьць беларускіх прадуктаў. Не ўстрымалася ТБ нават у дзень прыезду Лукашэнкі. Акурат адразу пасьля тэледамовы кіраўнікоў Масквы і Беларусі пра пастаўкі беларускай бульбы ў расейскую сталіцу пайшоў ўдвая даўжэйшы рэпартаж пра нелегальны завоз зь Беларусі дробнымі гандлярамі забруджаных прадуктаў.

Але як бы там ні было, а беларусам, што жывуць у Маскве, прыемна і купіць сваё роднае, і пабачыць, і паслухаць. Таму кожны зь землякоў, хто своечасова пачуў пра Дні Беларусі, штосьці наведаў: ці кірмаш, ці канцэрт. Тэатральную культуру Беларусі прадстаўляў Берасьцейскі абласны тэатар. Адзін спэктакль тэатар прывёз для маскоўскіх беларусаў на беларускай мове (для масквічоў было два на расейскай).

Перад спэктаклем у невялікай залі тэатру «Эрмітаж» была заплянаваная сустрэча дзяржаўных дзеячоў Беларусі з дыяспарай. Сустрэча, праўда, атрымалася чыста візуальная. Дзеячы прамовілі належнае, заля ціха і абыякава сядзела, ня верачы ніводнаму слову. Залі слова не прапанавалі, на адзіную цыдулку-пытаньне з залі адказваць не сталі. З прамоўцаў толькі сп.Буко з Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў быў беларускамоўным. Ён жа ўзнагародзіў граматамі за спрыяньне захаваньню і развіцьцю беларускай мовы і культуры ў Расеі ды абдарыў «Ілюстраванай гісторыяй Беларусі» кіраўнікоў інтэгратарскіх нацыянальна-культурных аўтаномій «Беларусы Расеі» і «Беларусы Масквы», якія ў свой час былі створаныя «зьверху». Кіраўнікі ў адказ «поблагодарили и заверили», што будуць старацца яшчэ больш. Спадар пасол, нам.міністра інфармацыі спн.Ананіч, віцэ-прэм'ер Цюцюноў усё пераконвалі залю ў неабходнасьці яднаньня Беларусі і Расеі. А заля моўчкі чакала спэктаклю.

Спэктаклем «Саламея Русецкая» засталіся задаволеныя. А для яшчэ большага задавальненьня публікі пасьля спэктаклю раздавалі падарункі. Увесь гардэроб тэатру быў застаўлены плястыкавымі пакетамі з падарункамі, якіх было нашмат болей, чым гледачоў. Кожнаму — вялікая бутэлька добрай «Бярозавай» гарэлкі, кіляграмовая скрынка цукерак «Белавеская пушча» і квіток на хакейны матч каманды прэзыдэнта Беларусі ды мэры Масквы. Дарэчы, спартовыя мерапрыемствы — футбольныя, хакейныя, валейбольныя, гандбольныя матчы паміж беларускімі і маскоўскімі камандамі, спаборніцтвы братніх каманд у конным спорце і гімнастыцы — праходзілі па ўсіх адміністрацыйных акругах Масквы, таксама як і выступы беларускіх самадзейных дзіцячых і дарослых калектываў, музычных аркестраў у раённых дамах культуры.

Як падумаю, колькі гэта ўсё каштавала беднаму беларускаму бюджэту, робіцца жахліва ад такой бязглуздзіцы. Навошта нашай маленькай краіне так напружвацца, каб камусьці падацца вялікай і багатай? Гэта нават не ў характары беларусаў, больш схільных да таго, каб грошы лічыць і ашчаджаць. Калі ўзімку не хапае паліва, ня варта было б траціць столькі грошай на залаты пыл у вочы масквічам.

30 верасьня «на дэсэрт» Дзён Беларусі адбыўся гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі ў галоўнай маскоўскай канцэртнай залі «Расея». Білетаў на яго зусім не прадавалі, гледачоў адабралі толькі супэрнадзейных па запрашальніках, распаўсюджаных беларускім пасольствам. Чакалі Лукашэнку...

Знаёмец на хаду паказаў мне новенькую кніжку «Нашествие», спытаў, ці трэба мне, а то яго сябры зь Беларусі купіць прасілі, і паляцеў далей, спадзеючыся патрапіць на канцэрт без запрашальніка. І праўда трапіў — купіў лішні запрашальнік з рук усяго за 50 рублёў (3500 беларускіх).

Таіса Мішчанка

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Вэлкам у дзяржаўныя рукі

Прэзыдыюм Саўміну даручыў міністэрствам сувязі, эканомікі ды юстыцыі да 1 студзеня аднавіць кантрольны пакет дзяржавы ў супольным прадпрыемстве «БелСел», першым апэратары сотавай сувязі ў Беларусі. Доля дзяржавы зьмяншалася па меры прыцягненьня інвэстыцый. Тое самае плянуецца зрабіць і з кампаніяй «Velcom». Мінсувязі з падыходам прэзыдыюму Саўміну нязгоднае. У «БелСеле» сытуацыю не камэнтуюць.

Цукровыя інвэстыцыі

Гарадзейскаму цукроваму камбінату дадуць крэдыт «Беларусбанку» на 19,5 млрд, а Скідзельскаму цукроваму — на 14,1 млрд руб. да 2009 г. А зь бюджэту за кошт рэзэрвовага фонду прэзыдэнта будзе выдзелена 22 млрд на рэканструкцыю і выплату працэнтаў за карыстаньне гэтымі крэдытамі. Прадпрыемствы вызваленыя ад мыта на ўвоз буракаўборачных камбайнаў. Вызваленыя сродкі павінны накіроўвацца на павелічэньне дзяржаўнай долі ў статутных фондах камбінатаў.

Ня думай і ня мысьлі

Беларусь ня будзе здаваць Бярозаўскую ДРЭС у арэнду РАТ «АЭС Расеі». Пра гэта заявіў намесьнік міністра энэргетыкі Аляксандар Сівак. Два з шасьці блёкаў ДРЭС выдзеленыя для работы з Эўропай, а для надзейнага забесьпячэньня Берасьцейшчыны неабходныя тры блёкі. «Значыць, пра арэнду гаворкі ісьці ня можа», — заявіў А.Сівак.

Павялічацца выдаткі на абарону

Праект дзяржбюджэту на 2004 г. прадугледжвае павелічэньне выдаткаў на абарону на 33%. Гэта больш за гадавы ўзровень інфляцыі. Сума складзе 399 млрд руб. — 1% ад ВУП. У прыватнасьці, супрацоўнікам «сілавых ведамстваў» будуць замест харчовага пайка плаціць 58 тыс. руб. кампэнсацыі ў месяц.

ТНК сыходзіць

Цюменская нафтавая кампанія (ТНК) ліквідавала сваё прадстаўніцтва ў Беларусі. Ліквідацыя адбылася ў рамках рэструктурызацыі актываў падчас стварэньня аб'яднанай кампаніі «ТНК-British Petroleum». У ліпені ТНК падпісала кантракт з ААТ «Белтрансгаз» на пастаўку ў Беларусь 250 млн куб.м газу па 37 даляраў за тыс.куб.м. Пакуль невядома, ці працягнецца супрацоўніцтва ТНК-ВР і Беларусі ў 2004 г. ТНК-ВР, трэцяй па велічыні недзяржаўнай нафтагазавай кампаніі ў Расеі і дзясятай у сьвеце, належаць пяць нафтаперапрацоўчых заводаў у Расеі і Ўкраіне. Яна актыўна пашырае прысутнасьць на ўкраінскім рынку.

Рост цэнаў на збожжа

Цэны на збожжа на польскім рынку вырасьлі на чвэрць. Гэта зьвязана з рэкордна нізкімі зборамі зерня ў Польшчы і Эўропе ў цэлым. Ураджай ва Ўкраіне ўвогуле склаў 4 млн тонаў проці леташніх 20. Экспэрты чакаюць росту цэнаў на збожжа, камбікармы й муку і на беларускім рынку.

Ратаваньне Слуцкага бровару

Менскі аблвыканкам вылучыў 150 млн руб. на ўвод лініі для вытворчасьці піва ў ПЭТ-бутэльках на Слуцкім бровары. Пакуль случчакі працуюць толькі на адну шостую магутнасьці.

СП; БелаПАН

Фрагмэнт вялікага палатна

Гары Паганяйла

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

6 кастрычніка Вярхоўны суд вынес свой вэрдыкт у справе «Праваабаронцы супраць праваахоўнікаў». Беларускі Хельсынскі камітэт абскарджваў правамоцнасьць папярэджаньня ад 15 жніўня. Мінюст вынес яго за... адсутнасьць двукосься у назьве арганізацыі на блянку і няправільнае афармленьне пячаткі БХК. Падчас перарэгістрацыі БХК у 1999 г. аніякіх прэтэнзіяў да пячаткі Мінюст ня меў.

Пазыцыі БХК у судзе адстойвалі намесьнік старшыні аб'яднаньня Гары Паганяйла і адвакат Алег Гулак. Іх довады: пунктуацыйная памылка ў блянку мае тэхнічны характар, выносіць за яе папярэджаньне — занадта суровае пакараньне (два папярэджаньні — ужо падстава для ліквідацыі арганізацыі). Мінюст у асобе Аляксандра Харытона стаяў на тым, што гэты дзяржаўны орган мае права выносіць папярэджаньне грамадзкім арганізацыям за ўсялякае парушэньне любога закону.

«Прыйдзе да нас прадстаўнік Дзяржкамархіву, знойдзе ў справаводзтве парушэньні, выпіша прадпісаньне — а Мінюст, скарыстаўшыся матэрыяламі праверкі, вынесе нам пісьмовае папярэджаньне! — кажа Г.Паганяйла. — Вось у нас толькі скончылася праверка з падатковай. Яны зьвярталіся ў міністэрства з пытаньнем, ці мусім мы мець ліцэнзію на тое, каб аказваць прававую дапамогу грамадзянам. Калі будзе даказана, што мы займаемся неліцэнзаванай дзейнасьцю, Мінюст можа зьвярнуцца ў суд з пазовам пра ліквідацыю нашай арганізацыі».

Судзьдзя Ала Сакалоўская падтрымала Мінюст: скарга БХК прызнаная беспадстаўнай. Г.Паганяйла гатовы абскарджваць рашэньне суду ў вышэйшых інстанцыях — аж да Камітэту ААН па правах чалавека.

Папярэджаньне БХК — фрагмэнт вялікага палатна. 8 верасьня рашэньнем Менскага гарсуду ліквідаваная «Прававая дапамога насельніцтву». 1 кастрычніка ўпраўленьне юстыцыі Менгарвыканкаму падало ў суд пазоў пра ліквідацыю «Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў». На чарзе разгляд ліквідацыйнай справы «Фонду імя братоў Луцкевічаў» — 14 кастрычніка. 21 кастрычніка адбудзецца суд па закрыцьці «Праваабарончага цэнтру «Вясна». У Вярхоўным судзе Беларусі распачаліся таксама працэсы ліквідацыі двух жаночых аб'яднаньняў — фонду «Касьяпэя» на чале з Валянцінай Сьвяцкай і Галінай Самдзянавай ды арганізацыі «Жаночы адказ» на чале зь Сьвятланай Каралёвай.

Аркадзь Шанскі

Міцкевіч пад Валадаркай

Урачыстае адкрыцьцё помніка Міцкевічу ў Менску праходзіла пад знакам гістарычных аналёгій. Прамоўцы — як з польскага, так і зь беларускага бакоў — нямала гаварылі пра тое, колькі гора і няшчасьцяў прынесьлі гэтай зямлі акупанты. У кантэксьце асобы Міцкевіча выходзіла, што маюцца на ўвазе якраз акупанты з усходу. Характэрна і тое, што месца, дзе праходзіла мерапрыемства, шчыльна ачапілі дзясяткі спэцслужбістаў у цывільным. Нібыта гаварыць пра свабоду і акупацыю можна было толькі там — за ачапленьнем…

Помнік мусілі паставіць яшчэ ў 1998-м, на 200-годзьдзе Адама Міцкевіча. Але фінансавыя цяжкасьці (што ўзьніклі, напэўна, з палітычных прычынаў — калі хто ня памятае, гэта былі гады замяталіншчыны) зацягнулі працу і ўсталяваньне аж на пяць гадоў. У мінулую суботу, 4 кастрычніка, твор скульптараў Андрэя Засьпіцкага і Аляксандра Фінскага, пры ўдзеле архітэктара Рыгора Фёдарава, зьявіўся ў сквэры на скрыжаваньні Гарадзкога Валу і Нямігі.

У дзень адкрыцьця ў скверы сабраліся сотні людзей, сярод якіх былі вядомыя палітыкі, грамадзкія і культурныя дзеячы, дыпляматы. Дзясяткі агентаў спэцслужбаў пільнавалі бясьпеку грамады.

Адкрыў мерапрыемства старшыня Менскага гарсавету Ўладзімер Пашкоўскі, беларускамоўны выступ якога быў досыць арыгінальны. Чыноўнік разважаў над праблемай, каму ж належыць спадчына паэта, ды прыйшоў да высновы, што «Адам Міцкевіч найперш належыць польскаму народу, на мове якога ён пісаў, гаварыў і думаў, за волю якога ён змагаўся». Але пры гэтым нагадаў, што Міцкевіч належыць таксама беларускаму і літоўскаму народам... «Збыўся зварот Міцкевіча да Маці Божай — ён вярнуўся ў родны край!» — так скончыў сваю прамову сп.Пашкоўскі. І разам з Генадзем Навіцкім ды маршалкам польскага Сэнату Лёнгінам Пастусякам адкрыў помнік.

Навіцкі выступаў па-расейску. Ён адзначыў сымбалічнасьць моманту, «у сьвятле паглыбленьня нашых адносінаў», ды выказаў спадзяваньне, што недалёкі й час, калі будзе ўсталяваны помнік яшчэ аднаму Міцкевічу — Якубу Коласу, толькі ня ў Менску, а ў Варшаве. Аказваецца, беларускі пасол Павал Латушка з прэзыдэнтам Варшавы Лехам Качыньскім ужо абмяркоўвалі гэты праект.

Прафэсар Пастусяк у сваёй прамове шмат казаў пра супольнае, часта трагічнае, мінулае польскага і беларускага народаў, згадваў пра свабоду і яе каштоўнасьці. Пакуль ён гаварыў, за яго сьпінай ажывіўся генэрал-сэнатар Мікалай Чаргінец, штосьці пачаў эмацыйна тлумачыць Навіцкаму... Тым часам сп.Пастусяк казаў пра страты, якія панесла беларуская зямля ад шматлікіх войнаў і акупацыяў, пра скарбы, якія яна згубіла, пра тое, як акупанты выкрэсьлівалі гістарычную памяць народу, зьнішчалі сьвятыні. Слова «акупацыя» неаднаразова паўтаралася ў ягоным выступе, але часьцей ён згадваў пра свабоду. «Свабода — гэта дар, безь якога ня можа разьвівацца ніводзін народ», — гаварыў маршалак. Ён нагадаў, што палякі ўжо зрабілі свой выбар і ўступаюць у аб'яднаную Эўропу, а «беларусы знаходзяцца напярэдадні гэтага выбару». Больш за тое, Пастусяк сказаў пасьля журналістам, што ў выпадку, калі б Беларусь выконвала эўрапейскія стандарты ў справе дэмакратыі і правоў чалавека, Польшча б магла б стаць яе «адвакатам» перад эўраструктурамі.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Маршалак Пастусяк (зьлева) заклікаў беларусаў павярнуцца тварам на Захад, але Міцкевіч і Навіцкі пакуль глядзяць у розныя бакі

Польскі пасол сп.Тадэвуш Паўляк выступаў па-беларуску. Ён таксама зьвярнуўся да гісторыі, згадаў яе трагічныя старонкі, часы, калі Эўропай «была забытая і кінутая на зьядзеньне захопнікам гэтая зямля». Пасьля гэтага да мікрафона выклікалі паэта Ўладзімера Карызну, які пачаў з таго, пра што забыўся сказаць Генадзь Навіцкі: «Узнос першы ў падмурак унёс наш прэзыдэнт». А скончыў свой выступ Карызна нацыяналістычна. «Гэта наш паэт! — выгукнуў ён. — І сам Міцкевіч лічыў сябе беларусам!» — «Ён паходзіў з этнічнага мяшаньня і быў палякам паводле свайго выбару», — пярэчыў кіраўнік Саюзу палякаў Тадэвуш Крукоўскі. На ягоную думку, прызнаньне Міцкевіча ў любові да Літвы — гэта ня што іншае, як «падкрэсьліваньне, што ён — паляк, але ня з Кракава ці Варшавы, а адсюль — «паляк з крэсаў». Многіх зьдзівіў сваёй прамовай і архітэктар Фёдараў, які гаварыў на трасянцы. З выступу стала зразумела, што афармленьне сквэру будзе працягвацца і з часам ён атрымае імя Міцкевіча.

Не абышлося і без кур'ёзаў. Ужо пасьля цырымоніі да сьпікера Навіцкага падышоў граф Прушынскі — хацеў даведацца, чаму яго колішняя прапанова ў справе зьмяншэньня энэргаспажываньня рэспублікі сабатуецца. Навіцкі, які ўжо даўно не прэм'ер, ад яго адмахнуўся як ад надакучлівай мухі. А да маршалка польскага Сэнату падышоў Пятро Краўчанка. І Навіцкі зь цікавасьцю сачыў за іх дыялёгам. Чаго ня скажаш пра Чаргінца, які быў не ў гуморы.

Сяргей Ёрш

Насалода Міцкевічам

Адам Міцкевіч. Выбраныя творы. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003.

Так здарылася, што перад самым выхадам у сьвет новае кнігі выбраных твораў Адама Міцкевіча мне далі пачытаць працу польскага літаратуразнаўца Багдана Ўрбанкоўскага «Адам Міцкевіч: таямніцы веры, каханьня і сьмерці» (1999). Я ўпэўнены, што кніжку гэтую пісаў нашчадак дашчэнту апалячаных «kresowiaków», бо яшчэ да першае сусьветнае вайны Антон Луцкевіч адзначаў іх хваравіты нацыяналізм, мацнейшы за нацыяналізм палякаў з Мазоўша ці Велікапольшчы. І пісаў, што сярод тутэйшых «палякаў» прыхільнікаў ідэяў, «дзеля каторых здаўна працавалі Чачоты, Міцкевічы, Канарскія і ім падобныя», значна меней.

Працяг на старонцы 13.

Польскія дамы і беларускія закуточкі

Працяг са старонкі 1.

Тым ня менш, пазыцыя Кручкоўскага — знаходка для антызаходне настроеных русафілаў. Для такіх, як Кручкоўскі, — беларусы ня нацыя. Нездарма за такія тэорыі яшчэ ў 1910 г. ухапіўся Саланевіч з чарнасоценцамі. Ім валей было, каб усе каталікі перарабіліся ў палякаў, а праваслаўныя — у расейцаў, чым каб каталікі і праваслаўныя разам усьведамлялі сябе беларусамі. Падзяляй і ўладар — пра тое пісала «НН» яшчэ 93 гады таму. Што лепш на руку русафілам, чым такое дзяленьне, пры якім зь беларускае нацыі адрынаецца яе заходняя складовая? Што лепш для іх, як ператварэньне каталікоў у *іншых*? Дык вось, гэтая пазыцыя знаходзіць падтрымку і за Бугам.

Пабудова больш чым дзясятка Польскіх дамоў не магла адбыцца без маўклівае санкцыі афіцыйнага Менску. Інвэстыцыі ў меншасьць не ўяўляюць палітычнае пагрозы для рэжыму, яны не нясуць таго патэнцыялу, які маюць інвэстыцыі ў большасьць. Гэтаксама рэжым церпіць разбудову габрэйскае інфраструктуры. Беларускага ж руху цяперашняя адміністрацыя баіцца як агню — забараняе Ліцэй, газэты, арганізацыі. Каб ліцэісты маглі зь дзяржаўнага будынку А перайсьці ў недзяржаўны будынак Б, не забаранялі б — разумелі б бессэнсоўнасьць такіх захадаў. (Думаю, пасьля гэтага прыкладу ня трэба тлумачыць, чаму я не разглядаю беларускую дзяржаўную ін-фраструктуру — музэі, школы і г.д. — як *беларускую* ў гэтым кантэксьце. На яе незалежнай беларускай супольнасьці няма як абаперціся.)

Івянец цяпер мае два касьцёлы з ухілам у пальшчызну, царкву з ухілам у расейшчыну, польскі дом культуры і расейскамоўную — вось ён, вынік небеларускае сьвядомасьці пры чысьцюткай беларускай мове ў побыце — школу. А беларускасьць па-ранейшаму перахоўваецца і гартуецца найбольш у хатах. Каб хоць адзін з элемэнтаў жыцьця мясцовае супольнасьці быў зьбеларушчаны, многае пайшло б інакш у мястэчку. Дастаткова параўнаць, колькі дзеячоў незалежнага грамадзтва і беларускай культуры выйшла з Ракава, дзе школа ў савецкі час была беларускаю і цяпер застаецца такой, і колькі з Івянца.

Узьнімаючы гэтую праблему, газэта ні на кога не наракае, проста канстатуе горкія для беларускага руху факты.

Не віна Польшчы, і тым больш Саюзу палякаў Беларусі, што беларусы нічога ня маюць. Прашу клеўрэтаў не турбавацца: «Наша Ніва» ня з тых, каму для шчасьця трэба, каб сусед пагарэў. Нічыя не віна, але супольная бяда.

Стварэньне такіх асяродкаў, як Польскія дамы, праца зь мясцовымі супольнасьцямі — гэта ўзор для беларускага нацыянальнага руху. Каб пераняць гэты ўзор, патрэбныя грошы. Цяпер іх няма на пабудову нават аднаго, ня тое што шаснаццаці Беларускіх дамоў. Можна доўга пералічаць прычыны, чаму беларускі рух цяпер такі бедны. Аднак жа некалі лёс усьміхнецца й беларусам.

Вялікае сэрца мусіць мець тая нацыя, што дзеля падтрымкі культуры іншага народу, якой пагражае небясьпека, гатовая адрачыся падтрымкі свайго, але то была б сапраўды вялікая нацыя.

Барыс Тумар

У Івянцы між касьцёлам і царквою

Івянец ляжыць далёка ад галоўных шляхоў, на ўскрайку Налібоцкай пушчы. Гэта каштавала яму раённага статусу, але захавала яго ў першароднай чысьціні ад чужых уплываў. Мястэчка пераважна каталіцкае, тут дзейнічаюць два касьцёлы. Адзін зь іх, францішканскі, — дыямэнт беларускага барока. Івянецкая кафля, івянецкія цукеркі-«кароўкі», музэй Дзяржынскага. Праваслаўная царква, пабудаваная на месцы трэцяга касьцёлу. І новая славутасьць мястэчка — вялізны «Dom Polski», перароблены з былога ўнівэрмагу.

Новая славутасьць Івянца — «Дом Польскі», перароблены з ардынарнага ўнівэрмагу

Як Пясэцкі вярнуўся

У касьцёле сьвятога Міхала ў нядзелю парафіяльнае сьвята. Многія івянецкія каталікі адразу пасьля фэсту кіруюцца ў Польскі дом. Гэты прыгожы двухпавярховы будынак стаіць у цэнтры гораду, паміж касьцёлам і царквой. А 14-й там пачынаецца імпрэза, прысьвечаная Сяргею Пясэцкаму — пісьменьніку, шпіёну і авантурысту. Падобная імпрэза ў Менску, у Нацыянальнай бібліятэцы, была забароненая, а ў Івянцы не сустрэла ніякіх перашкодаў. Канфэрэнц-заля перапоўненая. Паслухаць госьця зь Менску, **Юзафа Тараня**, прыйшлі пераважна людзі сталага веку. Тарань распавядае аб прыналежнасьці Пясэцкага да партызанаў-«зяленадубаўцаў», да беларускага аддзелу польскага войска. Слухачы дзеляцца ўражаньнямі і ўспамінамі. Тут жа, у Польскім доме, фотавыстава, прысьвечаная пісьменьніку.

Польскі дом адкрыўся 20 ліпеня. Пад яго перарабілі былы, тае савецкае пары, пры якой Івянец нейкі час быў райцэнтрам і існаваў авіярэйс Івянец—Менск, унівэрмаг.

Кіраўніца мясцовага аддзяленьня Саюзу палякаў **Тэрэза Собаль** на цудоўнай — здаецца, толькі тутака, на Валожыншчыне, такую пачуеш — беларускай мове расказвае, што «ня ўсё яшчэ пасьпелі тут зрабіць, не хапае мэблі. Але дзе няма мэблі, мы ставім вазоны». Паводле яе словаў, фінансавыя праблемы не дазваляюць пакуль зьдзейсьніць усё задуманае, але арганізацыя працуе. «Мы хацелі адчыніць у Польскім доме і польскую клясу, але нам сказалі, што школьнікі павінны вучыцца ў школе. Мы з гэтым згадзіліся, тут займаюцца гурткі…»

У музэі Фэлікса Дзяржынскага ў Івянцы ўласна Дзяржынскаму прысьвечаны толькі адзін пакой. Экскурсаводка кажа, што экспазыцыя ў ім не мянялася з 1977 г. У астатніх пакоях можна пабачыць багатыя зборы керамікі, творы мясцовых разьбяроў па дрэве, карціны. Побач з музэем яго філія — «Цэнтар рамёстваў». Ганчара **Уладзімера Сасноўскага**, нягледзячы на выходны дзень, я засьпеў за працай. Ён наракаў, што значна менш сталі прыяжджаць да іх турысты, больш езьдзяць у раскручаныя Дудутки. Але «Цэнтар» пашыраецца, нядаўна яму перадалі былы панскі маёнтак, які загадкава згарэў пару гадоў таму.

Аляксандар Солтан — цесьляр і кіраўнік суполкі БНФ

Дзяржынскі і ягоныя землякі

Тэма Дзяржынскіх вельмі папулярная, асабліва сярод людзей старэйшага веку. Галоўны інжынэр аднаго зь мясцовых прадпрыемстваў распавядае, што ягоны бацька, асуджаны пасьля вайны як «памагаты» «лясных братоў», у савецкім канцлягеры ня мог пераканаць сяброў па няшчасьці, што Дзяржынскі ня быў бедняком. А пра тое, што «жалезны Фэлікс» забіў сваю сястру, людзі і слухаць не хацелі. Ніхто ня мог паверыць, што яшчэ адна сястра Дзяржынскага ў вайну супрацоўнічала зь немцамі — была перакладчыцай. А расстралялі яе за супрацу з Арміяй Краёвай, аддзелы якой базаваліся тут, у Налібоцкай пушчы.

У Івянцы я пазнаёміўся зь яшчэ адным **Фэліксам** — 75-гадовым спадаром **Паплаўскім**, краязнаўцам зь вёскі Кульшычы. Ён спрабуе разабрацца зь «белымі плямамі» апошняй вайны на Івянеччыне. «Загадка, чаму наша моладзь так актыўна пайшла ў польскую партызанку, удзельнічала ў Івянецкім паўстаньні 1943 г. Відаць, сказалася прапаганда польская патрыятызму ў міжваенны час», — разважае ён. Жыхар вёскі Камень 76-гадовы **Ян Вярбіцкі** распавядае пра тое, як сваякі трапілі ў розныя партызанкі: хто ў рускую, а хто ў польскую. У гэтай вёсцы на могілках каля касьцёлу ёсьць помнік 21 жаўнеру Арміі Краёвай — палякам і беларусам. Яны загінулі ў траўні 1944-га ад куль савецкіх партызанаў.

А беларусы нічога ня маюць

Адзін з самых вядомых людзей Івянца — **Аляксандар Солтан**, знаменіты цесьля і кіраўнік мясцовай суполкі БНФ. Ягоны бацька Вікенці ў 1939 г. апынуўся ў нямецкім палоне. У Бэрліне пазнаёміўся зь беларускімі дзеячамі, сярод іншых — з паэтам Янкам Палонным. Па вайне вырашыў вярнуцца на Радзіму, каб, гаворачы яго словамі, будаваць незалежную Беларусь...

У апошнія гады значна парадзелі шэрагі сябраў БНФ у Івянцы, кажа Аляксандар Солтан. Яшчэ колькі партыяў маюць тут хіба па аднаму чалавеку. А Аляксандар з сынам Алесем і сябрамі ў канцы 2001 г. пачаў выдаваць івянецкі рэгіянальны бюлетэнь «Сутокі». Цікава, што ў бюлетэні ўбачыла канкурэнтаў валожынская «раёнка». Адтуль прыяжджала на перамовы намесьніца рэдактара, прапаноўвала замест бюлетэню рабіць старонку ў «Працоўнай славе».

Солтан марыць набыць у мястэчку дамок і адкрыць беларускую кавярню. Але праект гэты спыняецца на фінансах, дакладней, на іх адсутнасьці. Напаўразбураны стаіць дом, дзе жыла паэтка Натальля Арсеньнева…

На імпрэзе, прысьвечанай Сяргею Пясэцкаму

Ганчар Уладзімер Сасноўскі працягвае ўнікальную традыцыю івянецкай керамікі

І прыкра гэта, і дзівосна, і незразумела: у самым сэрцы Беларусі, дзе бруіць беларуская мова, палякі маюць свой вялізны дом, а «беларусы нічога ня маюць», як і сто гадоў таму. Адно бюлетэнь, і таму радыя. Прычым такога «Беларускага дому» няма ў краіне ніводнага. Любая недзяржаўная беларуская ініцыятыва глушыцца, а каб пабудаваць дом прыватна — гэта ж колькі золата трэба. Палякам дае Польшча, беларусам жа не дае ніхто, а самі яшчэ не зарабілі.

…Затое ёсьць у Івянцы прадпрыемства па добраўпарадкаваньні дарог — «Крыніца». У пачатку 90-х на даху яго офісу зьявіўся вялізны надпіс «Жыве Беларусь». Ужо пры Лукашэнку фірма мела нямала клопатаў праз яго. Але ён і цяпер застаецца на даху. Справа тут не ў прынцыповасьці дырэктара, а ў фарбе — яна была адмысловая і зьнішчыць яе немагчыма.

Сяргей Ёрш,
фатаздымкі аўтара

Польскія дамы

Пра стварэньне і дзейнасьць Польскіх дамоў у Беларусі карэспандэнту «НН» распавядае намесьнік старшыні Саюзу палякаў Юзаф Пажэцкі.

«НН»: Навошта ў пяцітысячным Івянцы такі вялізны Польскі дом?

Юзаф Пажэцкі: Мы плянавалі, што там будзе школа зь некалькімі клясамі з польскай мовай навучаньня. Таму і такі вялікі будынак. Мы яго выкупілі і адаптавалі, калісьці гэта быў унівэрмаг.

«НН»: У якіх яшчэ гарадах Беларусі ёсьць такія дамы?

Ю.П.: Усяго ў краіне іх шаснаццаць. Найбольшыя — у Магілёве, Віцебску, тым самым Івянцы, Баранавічах, Лідзе, Шчучыне, Горадні, дзе месьціцца галоўны офіс Саюзу палякаў. Меншыя дамы ёсьць у Нясьвіжы, Барысаве, Ваўкавыску (там ён спалучаецца са школай), Поразаве ды інш. У Наваградку мы будынак здымаем, але з часам спадзяёмся выкупіць нейкае памяшканьне.

«НН»: Што ў Польскіх дамах адбываецца?

Ю.П.: Культурна-асьветніцкая праца згодна з нашым статутам. Там праводзяцца розныя імпрэзы, сустрэчы, выставы. У кожным Польскім доме ствараем ліцэй, дзе вывучаецца польская мова, гісторыя Польшчы.

«НН»: Ці перашкаджалі ўлады вашай дзейнасьці?

Ю.П.: Перашкодаў можа і няма, але праблемаў хапае. Здараюцца розныя сытуацыі. Напрыклад, з падаткамі. У тым жа Івянцы пажарная ахова запатрабавала, каб мы заплацілі падаткі — 3% ад кошту будынку.

«НН»: Які з дамоў дзейнічае найбольш пасьпяхова?

Ю.П.: Усе дамы працуюць пасьпяхова. Але мы маем шмат праблемаў па іх утрыманьні, нам ніхто ў гэтым не дапамагае. Утрымліваем мы іх самі, і гэта няпроста.

«НН»: Хто фінансуе будаўніцтва Польскіх дамоў?

Ю.П.: На 80% фінансуе варшаўская арганізацыя «Wspólnota polska». Астатнія грошы атрымліваем ад спонсараў.

«НН»: Ці ёсьць прыклады, калі на базе Польскіх дамоў дзейнічаюць беларускія арганізацыі?

Ю.П.: Выпадкі такія ёсьць. Напрыклад, некаторыя беларускія арганізацыі маюць юрыдычныя адрасы ў Польскіх дамах.

Гутарыў СЁ

10 кастрычніка пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 16.45, 0.15 «Мая краіна».
9.05 Маст. фільм «Тры дні Кондара».
11.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
12.10 Маст. фільм «Волга-Волга».
14.05 «Масква — Менск».
14.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку» (Канада).
16.05 «5х5».
17.05 Камэдыя «Кур'ер».
18.40 «Зь верай у Белую Русь».
19.05 Камэдыя «Пяць тузоў» (ЗША).
20.50 «Калыханка».
21.00 «Панарама».
21.40 Спэцыяльны рэпартаж. «Над прорвай у хлусьні». Фільм 1-ы «Горад сонца».
21.50 Маст. фільм «Вальмон».
0.30 Трылер «Спадарожніцы» (ЗША).

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўзр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Сэрыял..
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.50 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 23.10 «Менск і менчукі».
8.25 «Тэхналёгія».
8.35 Маст. фільм «Спуск у прорву».
10.15, 20.35 «Аўтапанарама».
10.30 «Тэатральныя гісторыі».
10.45 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
11.15, 12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.55, 18.40 «Пасажыр без багажу».
14.45 «Экасьвет» прадстаўляе... Відэафільм.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска».
16.50 Маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Мая жонка — гангстэр».
23.20 «Навіны СНД».
23.40 Кіно: трылер «Басэйн».

● АНТ

8.00, 9.0. 18.00, 20.30, 23.35 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50 Сэрыял «Спэцназ: Клінок».
10.45 Маст. фільм «Агнём і мячом».
12.30 Сэрыял «Твінісы».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45, 22.10 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.05 «Поле цудаў».
23.50 Баявік «Рабакоп-3».

● РТР

7.45 Сэрыял «Каменская-3. Калі багі сьмяюцца».
8.50 Аншляг.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.05 «Другая палова». Супэр-шоў.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Юрмаліна-2003». Частка 2-я.
22.35 Вынікі галаваньня — «Народны артыст — Ваш выбар!».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Фактар страху.
10.20 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.30 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.25 Сэрыял «Кодэкс гонару».
17.25 Адзін дзень за кулісамі НТВ.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай і Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.50 «10 гадоў НТВ». Сьвяточны канцэрт.
21.55 Маст. фільм «8 жанчын».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
15.35 «Гісторыя маёй сям'і». Дак. сэрыял.
16.30 «Набытак рэспублікі».
16.45 «Парадак слоў».
16.50 «Палацавыя тайны».
17.15 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
18.00 Навіны культуры.
18.20 «Тайны расейскай зброі».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.40 «Лінія жыцьця».
20.35 «Болей чым каханьне».
21.20 Маст. фільм «Кафка».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».
23.50 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял.

● Эўраспорт

8.15 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Жывая трансьляцыя.
11.15 Фэхтаваньне. Чэмпіянат сьвету. Куба. Дзень чацьвёрты. Паўтор.
12.30 Тэніс. АТР. Ліён. Чвэрцьфінал. Жывая трансьляцыя.
14.00 Тэніс. WTA. Фільдэрштад. Чвэрцьфінал. Жывая трансьляцыя.
17.00 Снукер. Кубак LG. Прэстан. Дзень сёмы. Жывая трансьляцыя.
19.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Сан-Рэма. Агляд.
20.30 «Формула». Аўтачасопіс.
21.00 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс.
22.00 Вэляспорт. Шаша. Чэмпіянат сьвету. Хемілтан. Групавая гонка. U-23. Жывая трансьляцыя.
0.00 «Сэрыі». Аўтачасопіс.
0.30 Ралі. Сан-Рэма.
1.00 Фэхтаваньне. Чэмпіянат сьвету. Куба. Дзень пяты. Жывая трансьляцыя.

11 кастрычніка субота

● БТ

7.35 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.
8.05 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.30 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Вязень замку Іф».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька».
11.10, 20.35 «Мая краіна».
11.25 Маст. фільм «Сьнягі Кіліманджара» (ЗША).
13.30 «Кропка».
14.10 Маст. фільм «Арыэль».
15.30 Дэтэктыў «Здача з трыма невядомымі».
17.40 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
18.25 Дэтэктыў «Забойства ва ўсходнім экспрэсе».
20.35 «Вакол плянэты».
21.30 Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Эўропы-2004. Галяндыя — Малдова. Жывая трансьляцыя з Галяндыі. У перапынку і па заканчэньні — «Трэці тайм».
23.40 Мэлядрама «Сырэны».

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта»: «Мачу Пікчу: у пошуках страчанага гораду інкаў» з цыклу «Ў пошуках забытага сьвету». Дак. фільм.
7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.35 Маст. фільм «Казка пра зоркавага хлопчыка».
9.50, 19.55 «СТВ-спорт».
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.15 «Анфас».
10.30 «Разам».
11.00 «Партрэт у інэр'еры».
11.15 «Экасьвет» прадстаўляе...
11.30 Дак. фільм «Я тут жыву».
11.55, 0.10 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял.
12.50 Камэдыя «О, калі б я быў багаты!».
15.05 «Дружная сямейка».
16.05 «Усё для цябе».
16.35 «Кляськa гумару».
17.05 «Галоўныя ролі».
18.00 Маст. фільм «Дасьпехі бога».
19.30 «24 гадзіны».
20.15 Маст. фільм «Адчайны».
22.10 «Навіны СНД».
22.25 «Арт-хаўз»: мэлядрама «Фэлікс і Лола».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Апошні герой: Выкананьне жаданьняў».
11.20 «Сканэр». «Як робяць добрае надвор'е».
11.50 «Ералаш».
12.10 «Неймаверныя прыгоды Жуля Вэрна».
13.00 Выратавальнікі. Тэрміновы выклік.
13.25 «Падарожжы натураліста».
13.55 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.20 Разумніцы й разумнікі.
15.00 Камэдыя «Сардэчна запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены».
16.20 Баявік «Дом ля дарогі».
18.20 Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Эўропы-2004. Зборная Расеі — Зборная Грузіі. Жывы этэр. У перапынку — «Час».
20.20 Нашы навіны.
20.45 Што? Дзе? Калі?
22.05 «Залаты грамафон».
23.05 Баявік «Вочы зьмяі».

● РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 «Круты маршрут».
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Каралева бэнзакалёнкі».
14.50 «Ха».
15.00 Камэдыя «Абрабаваньне».
17.00 «Сьвяточнае шоў Валянціна Юдашкіна».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Маст. фільм «Прывід».

● НТВ

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 Кватэрнае пытаньне.
10.55 Спорт «Лято 6 з 49».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Надвор'е на заўтра.
11.20 «Дзікі свет».
12.05 Камэдыя «Бэтховэн».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.00 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Сэрыял. «Калекцыя Даніэлы Стыл: большага каханьня не бывае».
17.05, 18.45 «НТВ: аўтапартрэт».
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.40 Баявік «Памры, але не цяпер».
22.20 «Пра гэта».

● Культура

11.10 Хто ў доме гаспадар?
11.40 «Мама». Маст. фільм.
13.00 «Сьляды на асфальце». «Казадзераза». Мультфільмы.
13.25 «Навука: стратэгія прарыву».
13.55 «Юнона і Авось». «Алілуя каханьню». Дак. фільм.
14.45 «Юнона і Авось». Фільм-спэктакль.
16.10 «Русалачка». Мультфільм.
16.40 «Крок насустрач». Маст. фільм.
17.55 «Рамантыка рамансу».
18.35 Магія кіно.
19.05 Блеф-клюб.
19.50 «Сфэры».
20.30 Сьмеханастальгія.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Галянтныя дамы». Маст. фільм.
23.00 «Фрак народу».
23.40 «Здагані вецер». Мультфільм.
23.55 «Рыцары сьмеху». «У пагоню!».

● Эўраспорт

8.15 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Жывая трансьляцыя.
11.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Шчасьлівая гадзіна». Паўтор.
12.15 Снукер. Кубак LG. Прэстан.
14.00 Тэніс. WTA. Фільдэрштад. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
17.00 Тэніс. АТР. Ліён. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
18.30 Снукер. Кубак LG. Прэстан. Дзень восьмы.
19.30 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
20.00 Вэляспорт. Шаша. Чэмпіянат сьвету. Хемілтан. Групавая гонка. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
23.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Спэцыяльны агляд.
1.45 Фэхтаваньне. Чэмпіянат сьвету. Куба. Дзень шосты. Жывая трансьляцыя.

12 кастрычніка нядзеля

● БТ

7.35 «Дастань зорку».
8.05 «Сузор'е надзеі». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.35 Арсэнал.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Вязень замку Іф».
9.55 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.00 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Смаляны. Белы замак Сангушкаў».
11.20 Маст. фільм «Зусім прапашчы».
13.05 Тэлеклуб «Ваша лято».
13.45 «Маскі-шоў».
14.05 Дак. сэрыял «На прыродзе з Стэфанам Пэйронам».
15.05 КВК. 1/3 фіналу Эўралігі.
16.40 «На скрыжаваньнях Эўропы».
17.20 Маст. фільм «Сабака на сене».
19.35 Камэдыя «Грэгуар Мулен супраць чалавецтва».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
22.30 Маст. фільм «Вясельле ў сэзон дажджоў».

● СТВ

6.25 «Дзікая плянэта»: «Гарыла». Дак. фільм.
7.20 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.45 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.10 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.30 Маст. фільм «Казка пра зоркавага хлопчыка».
9.40 «СТВ-спорт».
9.55, 20.20 «Аўтапанарама».
10.15 «Менск і менчукі».
10.25 «Сьвецкая хроніка».
10.40 «Філярманічны тыдзень».
10.45 «Запрашаем паскардзіцца...».
10.55 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.15 «Плянэта людзей».
11.30 «Свайго лёсу гаспадыня».
11.50, 0.00 «Каханьне імпэратара».
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Драма «Асуджаны».
15.05 «Дружная сямейка».
16.15 «Найлепшыя шоў сьвету».
17.15 «Галоўныя ролі». Заключная сэрыя.
18.25 «168 гадзін».
19.15 «Душой выкананы палёт». «Кармэн-сюіта».
19.45 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.40 «Асабісты інтэрас».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: драма «Танцы ў Блакітнай ігуане».
23.45 «Навіны СНД».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Таразана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
11.50 «Ералаш».
12.10 «Дачнікі».
13.00 Сьмехапанарама.
13.30 Юры Сянкевіч. «Калі заўтра на Марс».
14.05 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.30 Ток-шоў «Выбар».
15.15 «Вялікія бацькі».
15.45 «Прагулкі зь пячорным чалавекам» з цыкля «Жывая прырода».
16.50 Маст. фільм «Дзеці шпіёнаў».
18.20 «КВК-2003». Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.15 Баявік «Патруль часу».
23.15 Маст. фільм «Хваля жарсьці».

● РТР

8.25 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Японіі. Жывая трансьляцыя з Сузука.
10.25 «Гарадок».
10.55 «Сто да аднаго».
11.50 «Гульня слоў».
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Ўзброены і вельмі небясьпечны».
15.10 «Форт Баярд».
16.50 Клюб «Тэатар+ТБ».
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.00 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.25 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Сфэра».

● НТВ

9.10 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.20 «Апэльсынавы сок».
10.55 Гуляем у «Кено».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Надвор'е на заўтра.
11.20 Усё адразу!
12.10 Камэдыя «Бэтховэн-2».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.15 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: большага каханьня не бывае».
17.20 Маст. фільм «Вайна Харта».
20.00 «Надоечы».
21.30 «Фактар страху».
22.25 Маст. фільм «Дэкамэрон».

● Культура

11.00 Нядоўгія гісторыі.
11.15 «Рыцары сьмеху». «У пагоню!».
11.45 Прагулкі па Брадвэі.
12.10 «Ляпляндзкія казкі». Мультфільм.
13.25 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.55 «Партытуры не гараць».
14.25 «У сьвеце танцу». «Жыззэль». Фільм-балет.
16.25 «Астравы».
17.05 «Што рабіць?».
17.45 Зорныя гады «Ленфільму».
18.25 «Дэпутат Балтыкі». Маст. фільм.
19.55 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
20.20 «Культ кіно». «Чалавек з мармуру». Маст. фільм.
23.05 «Загадкі гісторыі». «Армія імпэратара». Дак. фільм.
23.55 Джэм-5.

● Эўраспорт

4.00, 13.00 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Паўтор.
6.00 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Жывая трансьляцыя.
10.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Адборачныя матчы.
14.00 Тэніс. WTA. Фільдэрштад. Фінал. Жывая трансьляцыя.
15.30 Тэніс. АТР. Ліён. Фінал. Жывая трансьляцыя.
17.00 Вэляспорт. Шаша. Чэмпіянат сьвету. Хемілтан. Групавая гонка. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
23.00 Футбол. Чэмпіянат сьвету па футболе сярод жанчын. ЗША. Фінал.
1.15 Аўтагонкі сэрыі «Карт». Мехіка.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

«Крамбамбуля» у «Казе»

12 кастрычніка праект «Крамбамбуля» будзе чарговы раз парушаць правілы айчыннага шоў-бізнэсу й закоціць сапраўднае музычнае шоў у КЗ «Менск». Зь вялікай колькасьцю прыемных неспадзяванак. Арганізатары абяцаюць наяўнасьць адной балерыны, адной сэкцыі бэк-вакалу, адной духавой сэкцыі, аднаго канфэрансье, адной опэрнай сьпявачкі ды інш. Музыканты абяцаюць таксама засьпяваць нарэшце беларускамоўны варыянт славутай «Belle», якая так і не ўвайшла ў альбом «Каралі раёну». Цана на шоў у «Казе» для айчынных канцэртаў таксама «сюрпрызная» — ад 8000 да 22000 руб. Такіх цэнаў на квіткі беларускі шоў-бізнэс яшчэ ня бачыў. Пачатак а 19-й.

Танцы зь «Цягні-Піхаямі»

16 кастрычніка ў клюбе «Рэактар» гурт «Цягні-Піхай» будзе прэзэнтаваць публіцы альбом рэміксаў на старыя песьні «Танцавальны». Таксама можна будзе пачуць сёе-тое новае: у прыватнасьці, кавэр на энэрэмаўскую «Песьню пра каханьне». У канцэрце возьмуць удзел «танцавальны» «Палац» з ды-джэем Рэем і Кірыл Слука. Пачатак у 19.00. Квіток каштуе 4000 руб. (танцпол), 7000 (столік).

Сяргей Будкін

праграма ТВ з 10 да 19 кастрычніка

13 кастрычніка панядзелак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 «36,6».
10.35 Падарожжа дылетанта. «Смаляны. Белы замак Сангушкаў».
11.05 «Шпілька».
11.30 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 Спэцыяльны рэпартаж. «Над прорвай у мане». Фільм 1-ы «Горад сонца».
12.25 Мэлядрама «Вясельле ў сэзон дажджоў».
14.20 Тэлеклюб «Ваша лято».
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
17.05 «Між іншым...»
18.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
19.05 Зона Ікс.
19.15 Камэдыя «Малпа, якая размаўляе».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Мэлядрама «Такое каханьне».
23.25 «Час спорту».
23.50 «Дастань зорку». Музычна-забаўляльная праграма.

● СТВ

6.30,15.20 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Кіно: камэдыя «Адна-адзіная».
10.10 «Асабісты інтэрас».
10.50 «Анфас».
11.10 «Турпаход».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Дыялёг з усім светам»: «Апокрыфы раньніх хрысьціян». Дак. фільм.
13.30, 16.30, 19.30, 22.50 «24 гадзіны».
13.55, 18.40 «Пасажыр без багажу». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.45 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Кіно: маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.55 «СТВ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 Кіно: баявік «Глядыятар-2000».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Сталічны футбол зь Сяргеем Алейнікавым».
23.40 Кіно: маст. фільм «Васьміног-2».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.40 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.55 Баявік «Патруль часу».
11.30 Сэрыял «Спэцназ: Паслушнік».
12.25 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
15.05 «Горад жанчын».
15.45, 23.55 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 Чакай мяне.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
21.50 «Той самы Захараў». Трансьляцыя юбілейнай вечарыны зь «Ленкому».

● РТР

7.45 Камэдыя «Ўзброены і вельмі небясьпечны».
9.35 У «Гарадку».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Каменская-3. Стыліст». 1-я сэрыя.
21.00 Сэрыял «Баязэт».
22.00 Весткі+.
22.20 «Мой срэбраны шар. Жонка Сталіна».
23.30 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Кодэкс гонару».
17.35 «Увага: вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Крумкачова слабодка».
19.50 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

● Культура

18.00 Навіны культуры з Ладай Арыстархавай.
18.20 «Хто мы?». «Габрэйскае пытаньне — расейскі адказ».
18.45 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.40 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
20.35 «Тым часам.
21.15 «Мэярхольдаўскія вечары». «Пчаляры». Спэктакль Цэнтру імя У.Мэярхольда.
22.30 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Разьдзел 1-ы.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.55 «Мастацтва фатаграфіі». Дак. сэрыял. «За кадрам. Фатографы на сваіх фатаграфіях».

● Эўраспорт

9.30 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Паўтор.
11.00 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Сан-Рэма. Агляд. Паўтор.
12.00 Взяўспорт. Шаша. Чэмпіянат сьвету. Хемілтан. Групавая гонка. Мужчыны. Паўтор.
13.00 Тэніс. АТР. Фінал. Вена.
14.00, 18.30, 23.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Адборачныя матчы.
17.00 Футбол. Чэмпіянат сьвету па футболе сярод жанчын. Фінал. Паўтор.
21.00 Снукер. Кубак LG. Прэстан.
1.30 Матагонкі. Гран-пры. Малайзія. Спэцыяльны агляд.

14 кастрычніка аўторак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.50 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Пакрова Прасьвятой Багародзіцы.
9.05 Мэлядрама «Такое каханьне».
10.45, 14.45, 16.45, 20.35, 23.25 «Мая краіна».
11.05, 18.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
12.10 «Зона Ікс».
12.25 Камэдыя «Малпа, якая размаўляе».
14.05 «Усё нармальна, мама!».
15.10 «...І спазнай сэрца маё». Дак. фільм.
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Мэлядрама «Дрэвы на асфальце».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды ня выйшла замуж».
23.40 «Кліп-абойма».
23.50 «Любы капрыз».

● СТВ

6.30, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.25, 23.00 «Тэхналёгія».
8.35 Кіно: баявік «Глядыятар-2000».
10.05 «Сталічны футбол зь Сяргеем Алейнікавым».
10.30 «Пакуль гарыць сьвечка...».
11.00 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Відавочца».
13.55, 18.40 «Пасажыр без багажу». Сэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Кіно: маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.45 Кіно: баявік «Аўганец».
23.10 «Навіны СНД».
23.30 Кіно: драма «Зладзеі».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Маст. фільм «Эпоха здрады».
11.25 Дыснэй-клюб: «Кім Пяць-з-плюсам».
15.05 «Горад жанчын».
15.45, 0.15 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Сканэр».
18.30 «Чалавек і закон».
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Апошні прычал».
22.05 Сэрыял «Спэцназ: Замах».
23.25 «Ня толькі пра футбол».
23.45 «На футболе».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Стыліст».
8.45 «Не сумуй!».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Баязэт».
22.00 Весткі+.
22.20 «Замах на нябожчыка».
23.30 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Іх норавы».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Кодэкс гонару».
17.35 Тэрыторыя выжываньня.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Тонкасьці бізнэсу».
19.40 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
15.25 «Праваслаўная сталіца». «Імпэратрыцы і юродзівая». Фільм 5-ы.
15.55 «Шлях». Дак. фільм.
16.50 Улада факту.
17.15 «Вакзал мары».
18.00 Навіны культуры з Ладай Арыстархавай.
18.20 «Тайны расейскай зброі». «Успаміны пра зброю будучыні».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.45 Ток-шоў «Аркестравая яма».
20.25 «Уяўны музэй Міхаіла Шамякіна».
21.10 «Лэдзі Макбэт Мцэнскага павету». Маст. фільм.
22.30 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Разьдзел 2-і.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.50 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял.

● Эўраспорт

9.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
10.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс. Паўтор.
12.00, 17.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
13.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Шчасьлівая гадзіна».
14.00 Футбол. Чэмпіянат сьвету па футболе сярод жанчын. Жанчыны. Фінал. Паўтор.
15.30, 19.30 Тэніс. WTA. Дзень другі. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
18.00 Футбол. Зборнік Лігі чэмпіёнаў. Паўтор.
21.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Шчасьлівая гадзіна». Паўтор.
22.00 Бокс. ТВА. Італія. Жывая трансьляцыя.
0.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс.
0.45 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Канзас.
1.45 «Сэрыі». Аўтачасопіс.

15 кастрычніка серада

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 Маст. фільм «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды ня выйшла замуж».
10.45, 13.40, 17.05 «Мая краіна».
11.05, 18.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
12.20 Мэлядрама «Дрэвы на асфальце».
14.10 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Баявік «Па-за законам».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Плянэта Ка-Пэкс».
23.40 «Акадэмія зласлоўя».
23.55 Кліп-абойма.
0.10 Ноч з Тамарай Лісіцкай.

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Менск і менчукі».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Кіно: баявік «Аўганец».
10.25 «Запрашаем паскардзіцца».
10.35, 20.25 «Аўтапанарама».
10.55 Дак. фільм «Шлях да здароўя».
11.10 «Закон і крымінал».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Такая прафэсія».
13.55 «Пасажыр без багажу». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Кіно: маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
18.05 Дак. фільм «Сымон Будны. Паэма».
18.40 «Смак забойства». Тэлесэрыял.
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.45 Кіно: баявік «Вірус-забойца».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Драма «Каралева Хрысьціна».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Спэцназ: Замах».
10.45 Драма «Крыжакі».
11.40 «Ня толькі пра футбол».
12.00 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
15.00 «Горад жанчын».
15.45, 0.15 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». Тэорыя неймавернасьці. «Тэлепатыя».
18.40 Сьмехапанарама.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Апошні прычал».
22.05 Сэрыял «Спэцназ: Зламаная страла».
23.25 Прэм'ера. «Чалавечыя інстынкты». Фільм 3-і.

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Стыліст».
8.45 Сам сабе рэжысэр.
9.45, 22.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Баязэт».
22.00 Весткі+.
22.20 Аўтарытэт.
23.05 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Кулінарны паядынак.
10.20 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Кодэкс гонару».
17.35 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: Бывай, малпа, ці Прывід опэры». Частка 1-я.
19.50 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
15.25 «Праваслаўная сталіца». «Цудоўнае стагодзьдзе».
15.55 «Берасьцейская гета». Дак. фільм.
16.35 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
16.45 «Айчына і лёсы».
17.15 Што граем.
18.00 Навіны культуры з Ладай Арыстархавай.
18.20 «Тэатральны ліцэй». Фільм 1-ы. «Напачатку было...»
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.45 «Апокрыф». Ток-шоў.
20.25 «Астравы».
21.05 «Некалькі дзён з жыцьця І.І.Абломава». Маст. фільм. 1-я сэрыя.
22.15 «Pro memoria». Капэла.
22.30 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Разьдзел 3-і.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.50 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял.

● Эўраспорт

9.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Сан-Рэма. Агляд. Паўтор.
10.30 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
11.00 Бокс. ТВА. Паўтор.
12.30 Сьпідвэй. Гран-пры. Нарвэгія.
13.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
15.30, 19.30 Тэніс. WTA. Дзень трэці. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
18.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
21.15 Алімпійскі часопіс.
21.45 Гольф. US PGA. Лас-Вэгас. Спэцыяльны агляд.
22.45 Гольф.
23.15 Ветразевы спорт.
0.00 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубку УЭФА. Агляд.

16 кастрычніка чацьвер

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.05, 16.45, 23.15 «Мая краіна».
9.05 Маст. фільм «Плянэта Ка-Пэкс».
11.05, 18.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
12.15 Баявік «Па-за законам».
14.15 «Кропка».
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.10 Драма «Абмен».
20.50 «Калыханка».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Французкі бокс».
23.30 «Кліп-абойма».
23.40 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча. «Вэнэцыя Кшыштафа Занусі». Частка 1-я.

● СТВ

6.25. 15.20 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Тэма дня».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Кіно: баявік «Вірус-забойца».
10.20 «Партрэт у інтэр'еры».
10.40 «Без макіяжу».
11.05, 20.25 «Фільм, фільм, фільм».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Усё для цябе».
13.55, 18.40 «Смак забойства». Сэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.45 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Кіно: маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Плянэта людзей».
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 Кіно: баявік «Адрэналін».
22.00 «Душой выкананы палёт». «Кармэн-сюіта».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Кіно: баявік «Зорка Джайпура».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Спэцназ: Зламаная страла».
10.45 Драма «Крыжакі».
11.40 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.00 «Горад жанчын».
15.45, 0.05 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Расейскі экстрым».
18.40 «Бяз тэрміну даўнасьці». «Робін Гуды» па-наску».
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Апошні прычал».
22.05 Сэрыял «Спэцназ».
23.25 Крэмль-9. «Пад грыфам «Захоўваць вечна».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Стыліст».
8.45 Пакой сьмеху.
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Баязэт».
22.00 Весткі+.
22.20 «Гістарычныя хронікі» зь Мікалаем Сванідзэ. «1903. Акадэмік Паўлаў».
23.30 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Кватэрныя пытаньне: «У стылі даміно».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Кодэкс гонару».
17.35 «Прафэсія — рэпартэр».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: Бывай, малпа, ці Прывід опэры». Частка 2-я.
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 «Да бар'еру!». Ток-шоў.

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
15.25 «Праваслаўная сталіца». «Рамантык на троне».
15.55 «Спадарожнікі», «Зямля абяцаная». Дак. фільмы.
16.50 «Пецярбург: час і месца». «Астранамічны музэй Пулкаўскай абсэрваторыі».
17.15 «Царская лёжа». Балет.
18.00 Навіны культуры з Ладай Арыстархавай.
18.20 «Тэатральны ліцэй». Фільм 2-і. «Галіны і карані».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.45 «Культурная рэвалюцыя».
20.40 «Эпізоды».
21.20 «Некалькі дзён з жыцьця І.І.Абломава». Маст. фільм.
22.30 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.55 «Сьвятыні хрысьціянскага сьвету». «Дрэва жыцьця».

● Эўраспорт

9.30 Гольф. US PGA. Лас-Вэгас. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
10.30, 19.00 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубку УЭФА. Агляд. Паўтор.
12.30 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубку УЭФА.
15.30, 21.00 Тэніс. WTA. Дзень чацьвёрты. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
17.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Бразылія. Жывая трансьляцыя.
22.30 Бокс. Чэмпіянат WBA. Эрфурт.
0.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Бразылія. 1/8 Фіналу. Жывая трансьляцыя.

17 кастрычніка пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!». 8.45, 10.40, 13.45, 16.45, 18.45, 23.35 «Мая краіна».
9.05 Маст. фільм «Французскі бокс».
11.05 Сэрыял «Ніра Вульф і Арчы Гудвін».
12.10 Мялядрама «Абмен».
14.05 «Масква — Менск».
14.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
15.10 «Унівэрсіяда-2003».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 Маст. фільм «Шлях у парадыз».
19.05 Маст. фільм «Інспэктар-разява».
20.50 «Калыханка».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Спэцыяльны рэпартаж. «Над прорвай у мане». Фільм 2-і «Жыцьцё ў СІЗА».
21.50 Камэдыя «Каханьне і іншыя непрыемнасьці».
23.50 Трылер «Прусакі».

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 18.20 «Менск і менчукі».
8.25. 23.05 «Тэхналёгія».
8.35 Кіно: баявік «Адрэналін».
9.55, 20.40 «Аўтапанарама».
10.15 «Дзікая плянэта»: «Атлянтыда. Тайны мінойскай эпохі» з цыклу «Ў пошуках страчанага сьвету». Дак. фільм.
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.55, 18.40 «Смак забойства». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Кіно: маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
21.00 Кіно: камэдыя «Халасьцяк».
23.15 «Навіны СНД».
23.35 Кіно: трылер «Небясьпека ў хаце».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.50 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Спэцназ».
10.45 Драма «Крыжакі». Заключная сэрыя.
11.40 Сэрыял «Твінісы».
15.00 «Горад жанчын».
15.45, 21.05 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Жарт за жартам».
18.50 «Поле цудаў».
20.00 Час.
22.30 «Што? Дзе? Калі?».
0.05 Баявік «Вірус».

● РТР

7.45 Сэрыял «Каменская-3. Стыліст».
8.45 Аншляг.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.05 «Другая палова».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Юрмаліна-2003».
22.35 Вынікі галасаваньня «Народны артыст — Ваш выбар!»

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Фактар страху».
10.20 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Дэтэктыў «Яна напісала забойства».
17.30 «Нацыянальная бясьпека: адкіды і прыбыткі».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Ніколі не кажы «ніколі».
22.45 Супэрбокс: Оскар Дэ Ла Хоя супраць Патрыка Шарпэнцье.
23.25 Начныя музы.
23.55 «Стыль ад...».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
15.25 «Заведная Расея». «У лябірынтах волскай дэльты».
15.50 «Дакумэнтальная камэра». «Міхаіл Літвякоў: 24 праўды ў сэкунду».
16.30 «Набытак рэспублікі». ЦСДФ.
16.50 «Палацавыя тайны».
17.15 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
18.00 Навіны культуры з Ладай Арыстархавай.
18.20 «Тэатральны ліцэй». Фільм 3-і. «Юнацтва — гэта помста».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.45 «Лінія жыцьця».
20.40 «Дваранскае гняздо». Маст. фільм.
22.25 «Водны знак». Відэафільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».
23.50 Афіша на заўтра.
23.55 «Сьвятыні хрысьціянскага сьвету». «Пакроў».

● Эўраспорт

6.15 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Жывая трансьляцыя.
9.15 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Паўтор.
10.30, 13.00 Ралі. Корсыка. Паўтор.
11.00 Сьпідвэй. Гран-пры. Нарвэгія. Паўтор.
12.00, 20.00, 1.45 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубку УЭФА. Паўтор.
13.30 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубка УЭФА. Агляд. Паўтор.
15.30, 21.00 Тэніс. WTA. Чвэрьфінал. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
17.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Бразылія. Чвэрьфінал. Жывая трансьляцыя.
21.00 Тэніс. WTA. Чвэрьфінал. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
23.00 «Самы дужы чалавек». Гран-пры. Канада.
0.30 «Формула». Аўтачасопіс.
0.45 «Фэрары». Аўтачасопіс.
1.15 Ралі. Корсыка.

18 кастрычніка субота

● БТ

7.35 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча. «Вэнэцыя Кшыштафа Зануссі». Частка 1-я.
8.05 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.30 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Вязень замку Іф».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька».
11.10 Маст. фільм «Кароль-Драздавік».
12.50 «Апошні пялёстак». Мультфільм.
13.15 «Кропка».
13.55 Сэрыял «Эпоха Станіслаўскага».
15.10 Мастацкая гімнастыка. Міжнародны турнір сэрыі Гран-пры. Дзіцячыя спаборніцтвы «Baby Cup».
16.40 Маст. фільм «Агнявы стралок».
18.00 «Маскі-шоў».
18.40 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.25 Маст. фільм «Цікі амэрыканец».
21.15 «Вакол плянэты».
21.45 «Мая краіна». Ток-шоў.
22.35 Дэтэктыў «Неабвержныя ўлікі».

● СТВ

6.20 «Дзікая плянэта»: «Вайна і канфлікт» з цыклу «Вынаходкі старажытных». Дак. фільм.
7.15 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.40 «Супэрпарасяа». Мультсэрыял.
8.05 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.30 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы».
9.50, 19.55 «СТВ-спорт».
10.05 «Рэактыўны бокс».
10.20 «З дакладных крыніц».
10.35 «Разам».
11.05 «Партрэт у інтэр'еры».
11.20 «Падарожжа ў Дудуткі». Відэафільм.
11.50, 0.30 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял.
12.50 Камэдыя «Закаханы з уласнага жаданьня».
14.30 «Дыскавэры» на СТВ»: «Лінія палёту». Дак. фільм.
15.00 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.00 «Усё для цябе».
16.30 «Клясыка гумару».
17.00 «Лёсу свайго гаспадыня».
17.20 «Хіт-момант. Прэм'ер-выпуск».
17.45 Кіно: трагікамэдыя «Прывітаньне, артыст!».
19.30 «24 гадзіны».
20.15 Кіно: камэдыя «Кабэльшчык».
22.00 «Навіны СНД».
22.15 «Арт-хаўз»: драма «Гатэль «Мільён даляраў».

● Лад

8.05 Мультыклюб.
9.00 «Мір вашаму дому».
9.10 Правінцыйныя гісторыі.
9.35 Наша спадчына. «Мірскі замак». Частка 1-я.
9.50 «Мая Беларусь».
10.05 Мялядрама «Трапяткія сэрцы». 1-я сэрыя.
11.30 Здароўе.
11.55 Мультфільм «Вясёлы гарод».
12.10 Мультсэрыял «Трышчан ды Іжота — забытая легенда».
12.35 Маст. фільм «Прыгоды Пятрова і Васечкіна звычайныя і неймаверныя».
14.45 «Ёсьць толькі міг...»
15.15 «Настаўніцкая». Забаўляльна-пазнавальная праграма.
15.25 «Эх, показка, показка».
15.40 «Сьпявай, душа!» «Куточак мой родны...».
16.05 Сэрыял «Век танцу».
17.00 «Росчырк часу».
17.15 Міжнародны конкурс мадэльераў-дызайнэраў і мадэльных агенцтваў «Белая амфара-2003». Частка 1-я.
17.40 «Іншыя танцы».
17.45 Маст. фільм «Беражыце жанчын». 1-я сэрыя.
18.50 Маст. фільм «Сакрэтны фарватэр». 1-я сэрыя.
20.00 «Рэгіён».
20.30 Камэдыя «Блізьняты».
21.55 Дэтэктыў «Шарада».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 Фільм з цыклу «Цікавае кіно».
11.20 «Проста сьмех!».
11.50 «Ералаш».
12.10 «Мурашы-забойцы».
13.00 «Праграма перадач на ўчора».
13.45 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 Разумніцы й разумнікі.
14.50 Маст. фільм «Паварот лёсу».
16.30 «Бяз тэрміну даўнасьці»: «Робін Гуды» па-нашаму».
17.00 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга.
18.55 «Апошні герой». «Канец гульні.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Розыгрыш».
22.00 «Залаты грамафон».
23.05 Баявік «Пекла».

● РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 Круты маршрут.
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Кантрабанда».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Растоў» (Растоў-на-Доне) — «Зэніт» (Санкт-Пецярбург). Жывая трансьляцыя з Растова-на-Доне.
17.00 Праграма «Вясёлы канцэрт-2».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Баявік «Загнаны».

● НТВ

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 Кватэрнае пытаньне.
10.55 Спорт «Лято 6 з 49».
11.0. 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.15 Надвор'е на заўтра.
11.20 «Дзікі сьвет».
12.05 Камэдыя «Бэйб».
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: толькі раз у жыцьці».
17.05 «Найноўшая гісторыя: любіце радзіму — маці вашу».
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Баявік «Чырвоны зьмей».
21.05 Баявік «Дом ля дарогі».
23.35 Начныя музы.
0.05 «Стыль ад...».

● Эўраспорт

6.15 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Жывая трансьляцыя.
9.15 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс. Паўтор.
10.15 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Паўтор.
11.00 Футбол. Першыя матчы другога раўнду Кубку УЭФА. Паўтор.
12.00 Ралі. Корсыка. Паўтор.
12.30 Супэргоначны ўік-энд. Кубак сьвету. Монца. Жывая трансьляцыя.
13.30 Скачкі на батуце. Чэмпіянат сьвету. Гановэр.
14.30 Тэніс. WTA. 1-ы паўфінал. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
16.00 Тэніс. WTA. 2-і паўфінал. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
17.30 Скачкі на батуце. Чэмпіянат сьвету. Гановэр. Жывая трансьляцыя.
19.30 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
20.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Бразылія. Паўфінал.
22.30, 23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
1.15 Ралі. Корсыка.

19 кастрычніка нядзеля

● БТ

7.35 «Дастань зорку». Музычна-забаўляльная праграма.
8.05 «Сузор'е надзеі». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.35 Арсэнал.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Вязень замку Іф».
9.55 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.00 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Косава. Родныя мясьціны Тадэвуша Касьцюшкі».
11.20 Маст. фільм «Жыцьцё і дзіўныя прыгоды Рабінзона Круза».
12.55 Тэлеклюб «Ваша лято».
13.35 «Маскі-шоў».
14.00 Дак. сэрыял «Эпоха Станіслаўскага».
15.05 Спартыўныя танцы. Чэмпіянат сьвету. Фармэйшн.
15.45 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
16.25 Маст. фільм «Ён разводзіцца, яна разводзіцца».
19.00 Маст. фільм «Зорная брама».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
22.30 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта»: «Востраў пінгвінаў». Дак. фільм.
7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарасяа». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.35 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены».
9.45 «СТВ-спорт».
10.00, 20.20 «Аўтапанарама».
10.20 «Менск і менчукі».
10.30 «Сьвецкая хроніка».
10.45 «Філярманічны тыдзень».
10.50 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.00 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.15 «Плянэта людзей».
11.30 «Без макіяжу».
11.50, 0.05 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Маст. фільм «Зямля Санькікава».
15.05 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.05 «Найлепшыя шоў сьвету» з Урмасам Отам.
17.00 «Іншае жыцьцё». Тэлесэрыял.
18.25 «168 гадзін».
19.15 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
19.45 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.40 «Асабісты інтэрас».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: мэлядрама «Агні «Сьвятога Эльма».
23.50 «Навіны СНД».

● Лад

8.05 Мультыклюб.
9.00 «Не зявай!».
9.40 Дак. сэрыял «Ахоўнікі прыроды.
10.05 Мэлядрама «Трапяткія сэрцы».
11.25 Сад мары.
11.55 Мультсэрыял «Трышчан ды Іжота».
12.20 Маст. фільм «Канікулы Пятрова і Васечкіна звычайныя і неймаверныя».
14.35 «Іншыя танцы».
14.40 Дак. сэрыял «У розных строях».
15.05 «Бюро знаходак». Іранічныя замалёўкі.
15.30 «Сьвятло далёкай зоркі. Тамара Бастун».
16.00 Сэрыял «Век танцу».
16.55 «Імгненьні асобы». Гістарычныя дасьледаваньні.
17.20 Міжнародны конкурс мадэльераў-дызайнэраў і мадэльных агенцтваў «Белая амфара-2003». Частка 2-я.
17.45 Камэдыя «Беражыце жанчын». 2-я сэрыя.
18.50 Сэрыял «Сакрэтны фарватэр».
20.00 Навіны.
20.10 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
20.25 Камэдыя «Дзяўчына з характарам».
21.45 Маст. фільм «Аповесьць пра бедных закаханых».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Служу Айчыне!
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
11.55 «Ералаш».
12.10 Апошні праект Юрыя Сянкевіча. «Калі заўтра на Марс».
12.40 «Дачнікі».
13.30 Сьмехапанарама.
14.00 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.25 Ток-шоў «Выбар».
15.05 КВК. Вышэйшая ліга.
17.25 Прагулкі зь пячорным чалавекам у цыкле «Жывая прырода».
18.30 Маст. фільм «Дзеці шпіёнаў-2. Востраў няспраўджаных надзей».
20.30 Контуры.
21.15 Маст. фільм «Шосты дзень».
23.25 Камэдыя «Камуфляж».

● РТР

9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Матыльда».
15.15 Гульня «Форт Баярд».
17.00 Юбілейная вечарына, прысьвечаная 30-годзьдзю ансамблю МУС.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.00 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.25 Маст. фільм «Дзікі, дзікі Вэст».
22.35 Маст. фільм «Абіцель зла».

● НТВ

9.10 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.20 «Апэльсынавы сок».
10.55 Гуляем у «Кено».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.10 Надвор'е на заўтра.
11.15 Усё адразу!
12.05 Маст. фільм «Стрынгер».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.10 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: толькі раз у жыцьці».
17.15 Злачынства ў стылі «мадэрн»: маскоўская пачвара.
17.50 Маст. фільм «К-9, альбо Собачая работа».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.

● Эўраспорт

5.00 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Жывая трансьляцыя.
9.00, 15.00 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Паўтор.
9.30 Ралі. Корсыка. Паўтор.
10.00, 16.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат сьвету. Монца. Жывая трансьляцыя.
11.00 Матагонкі. Гран-пры. Аўстралія. Паўтор.
13.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Францыя. Жывая трансьляцыя.
14.00 Супэрспорт. Чэмпіянат сьвету. Францыя. Жывая трансьляцыя.
17.45 Тэніс. WTA. Фінал. Цюрых.
18.45 Скачкі на батуце. Чэмпіянат сьвету. Гановэр.
19.30 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Францыя.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат сьвету. Монца. Спэцыяльны агляд.
21.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Бразылія. Фінал.
22.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Шарлот.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
1.15 Ралі. Корсыка.

Падпіска

Нагадваем, што падпіскаю газэта абыходзіцца таньней.
Падпісны індэкс 63125.
Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».

Дык падпісвайся!

«Наша Ніва» запрашае
- да супрацы выпускнікоў і
- студэнтаў унівэрсытэтаў — людзей
- беларускіх, якія хочуць стаць
- журналістамі.

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16
Рэклямныя расцэнкі:
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.
Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку бланку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

Ахмед Закаеў: На Кадырава глядзяць як на халуя

Беларусам не звыкаць да слова «фарс» у характарыстыцы выбараў. У ацэнках выбараў прэзыдэнта ў Чачэніі вельмі часта гучала гэтае азначэньне. «Галасаваньне мёртвых душаў» — характэрны загаловак у нямецкай «Frankfurter Rundschau». Як падае праваабарончая арганізацыя «Чачэнскі камітэт нацыянальнага выратаваньня», з усяе колькасьці чачэнскіх уцекачоў у Інгушэціі (а іх там, пводлеа розных падлікаў, да 100 тыс.) прагаласавалі толькі 60.

Прэсавы сакратар Дзярждэпартамэнту ЗША Рычард Баўчэр назваў выбары ў Чачэніі «страчанай магчымасьцю», што выклікала рэзкую рэакцыю расейскага МЗС. Адразу пасьля выбараў да народу зьвярнуўся Аслан Масхадаў. Ён заявіў, што чачэнскія маджахеды ня спыняць змаганьня супраць расейскіх войскаў, пакуль тыя знаходзяцца на тэрыторыі Чачэніі.

Пра чачэнскія выбары і пэрспэктывы ўрэгуляваньня канфлікту карэспандэнтка «НН» пагутарыла зь віцэ-прэм'ерам ураду Масхадава, яго прадстаўніком у замежжы Ахмедам Закаевым.

КАНСТАНЦІН ЗАУРАЖЫН (-ИЗВЕСТИЯ-)

«НН»: Як чачэнцы, што жывуць за мяжою, ацэньваюць вынікі прэзыдэнцкіх выбараў?

Ахмед Закаеў: «Выбары» — замоцна сказана пра гэты фарс.

«НН»: Кадыраў належыць да аднаго з буйных чачэнскіх тэйпаў. Ці ўплывае гэта ў Чачэніі на магчымасьці палітыка?

А.З.: Антычачэнская прапаганда пераканала ўвесь сьвет, што чачэнцы — ня нацыя, не народ, а нейкія плямёны, якія маюць сваіх правадыроў і гатовыя за іх у агонь і ваду. Гэта абсалютна ня так. У цяперашняй Чачэніі тэйпавы фактар ня мае ніякага значэньня. Тое, што Кадыраў належыць да пэўнага тэйпу, — гэта праблема Кадырава й тэйпу, да якога ён належыць. Бо ўсе нармальныя чачэнцы пагарджаюць Кадыравым як нацыянал-здраднікам. Гэтаксама і ў іншых нацыяў. У вашай гісторыі гэта было, вы павінны ведаць, што здраднікі маюць асаблівую прыроду і стаўленьне да іх, незалежна ад нацыянальнасьці, ва ўсіх народаў аднолькавае. Згадайце паліцаяў. Кадыраў — гэта здраднік, які ў такі цяжкі момант становіцца катам свайго народу. Чачэнцы — гэта звычайны народ, звычайныя эўрапейцы, хаця доўгі час яны жылі ў надзвычайна цяжкіх умовах.

«НН»: Ці можна гаварыць пра магчымасьці нейкай самастойнай дыпляматыі Чачэнскай Рэспублікі пры Кадыраву?

А.З.: Ясна, што не. Пуцін сам у гэтым пераканаўся пасьля спробы выцягнуць Кадырава ў міжнародную палітыку як самастойнага дзеяча. Гэтая спроба правалілася. У ЗША далі дакладную ацэнку таму, што робіць Пуцін, акрэсьлілі стаўленьне да Кадырава. Як бы яго Пуцін ні называў — прызначаны, «абраны», — ад гэтага існасьць Кадырава не зьмяняецца, як і стан рэчаў у Чачэніі. Палітычныя імітацыі, якія Крэмль праводзіць з так званымі рэфэрэндумамі, амністыяй і гэтак далей, — сытуацыі не мяняюць. Прадстаўнік, сёньня прызначаны лідэрам, правадыром чачэнскага народу, ня можа быць успрыняты дэмакратычным сьветам як асоба самастойная. На Кадырава глядзяць як на халуя Пуціна. Нават унутры краіны зь ім дыялёгу ніхто ня будзе весьці. Таму я кажу пра вялікую памылку Пуціна — спробу навязаць чачэнскаму народу і ўсяму сьвету Кадырава як самастойную асобу.

«НН»: Цяпер, калі Крэмль гаворыць пра легітымнага прэзыдэнта й пачатак працэсу стабілізацыі, эўрапейскія арганізацыі могуць зьменшыць сваю ўвагу да сытуацыі з правамі чалавека ў Чачэніі?

А.З.: Сама пазыцыя эўрапейскай супольнасьці, АБСЭ, ПАРЭ, якія ня выказалі жаданьня ўдзельнічаць у «фарсе», сьведчыць, што істотнай зьмены ў ацэнцы чачэнскіх падзеяў ня будзе. Усё будзе адпавядаць каньюнктуры, якую сёньня вызначаюць Злучаныя Штаты ў змаганьні з тэрарызмам. Калі Пуціну й Кадыраву дасюль не ўдалося перавесьці законных патрабаваньняў чачэнскага народу ў катэгорыю змаганьня зь міжнародным тэрарызмам, то і надалей ім гэта ня ўдасца. Каб жа чачэнская вайна завяршылася заўтра, чачэнцы з свайго боку, я пераканаць, пачалі б дамагацца міжнароднага расьсьледаваньня злачынстваў, зьдзейсьненых на тэрыторыі Чачэніі, і прыцягненьня да адказнасьці злачынцаў, незалежна ад нацыянальнасьці. Ці зло чынілася з боку чачэнцаў, ці з боку акупацыйных войскаў — усе вінаватыя павінны быць пакараныя. Пакуль гэтага не адбудзецца, вайна ня скончыцца. Бо дагэтуль за ўсе злачынствы, што дзеяліся ў Чачэніі, ніхто не адказаў. Нават так не стаяла пытаньне. Беспакаранасьць спараджае ўсё новыя й новыя пакаленьні, якія на чачэнскай крыві робяць сабе кар'еру.

«НН»: Ахмедзе, ці ёсьць небясьпека ўплыву расейскай культуры (пры такой магутнай групоўцы расейскіх войскаў) на фармаваньне мэнтальнасьці маладога пакаленьня чачэнцаў?

А.З.: Безумоўна, вайна не адраджае, не будуе, а разбурае ня толькі будынкі, але й псыхіку, культуру, побыт. Такая небясьпека ёсьць. Ня ўсё расейскае было чужым для чачэнцаў, шмат якія чачэнцы выхоўваліся на расейскай культуры, ганарацца тым, што спазналі гэта. А тое, што цяпер адбываецца ў Чачэніі, гэта нельга назваць расейскай культураю. Гэта тое гідкае, што ў сабе акумулюе сёньняшняя палітыка Крамля. Я ня думаю, што ўсё гэта можа зынакшыць мэнтальнасьць чачэнскага грамадзтва. Але ёсьць вялікая праблема — усё расейскае сёньня цэлым пакаленьнем успрымаецца як варожае й зьненавіднае. І гэтая праблема будзе стаяць доўга. Чым раней у Расеі знойдуцца сілы, якія пакладуць канец гэтай бойні, тым большы ў нас шанец у пэрспэктыве прымірыць два народы. Шараговыя расейцы не павінны несьці адказнасьці за тое, што робяць палітыкі. Але ж тое, што адбываецца, чыніцца пры ўхвале эліты. У адным апытаньні каля 70% расейцаў сказалі, што выступаюць за спыненьне вайны й пачатак мірнага працэсу. Калі толькі гэтыя сілы стануць у Маскве ўплывовымі, расейцы з чачэнцамі будуць сустракацца й кантактаваць. Думаю, павінна прыйсьці новае пакаленьне лідэраў.

«НН»: У часе першай чачэнскай вайны ў недзяржаўных газэтах Беларусі можна было прачытаць, што чачэнцы змагаюцца й за нашую незалежнасьць...

А.З.: Я пераканаць, што сёньня Чачэнія ваюе ня толькі за сваю свабоду, але й свабоду некаторых краінаў СНД. А можа, і шырэй. Калі б чачэнцы зьмірыліся з тым, што навязвае Крэмль, Расея пайшла б далей на Каўказе, а таксама й да Ўкраіны, Беларусі. Але нам не зразумелая пазыцыя кіраўнікоў краінаў СНД. Сёньня вырашаецца пытаньне ня толькі незалежнасьці Чачэніі, але й далейшай расейскай палітыкі. Палітычная неабачлівасьць — так я магу сказаць. Калі б мы былі слабыя, скарыліся, адмовіліся ад свайго права на дзяржаву, сувэрэнітэт многіх краінаў, які й сёньня вельмі сумнеўны, быў бы моцна ўрэзаны.

Гутарыла Вольга Караткевіч

21 кастрычніка ў Лёндане пачнуцца фінальныя дэбаты ў судзе ў справе Ахмеда Закаева — Расея патрабуе яго экстрадыцыі. Абарона пасьпяхова акрэсьліла гэтую справу як палітычна матываваную. У падтрымку Закаева выступілі расейскія палітыкі Іван Рыбкін, Асламбек Аслаханаў, Руслан Хасбулатаў, праваабаронцы Сяргей Кавалёў і Валерыя Навадворская. Адвакат Закаева Фіцджэралд падкрэсьлівае, што ягоны падабаронны перасьледуецца за ролю ў чачэнскім супраціве, а таксама, што суд у Расеі не гарантуе Закаеву бясьпекі.

Познань абяцае дапамогу

У VII Днях навуковай кнігі ў Познані ўдзельнічалі й беларусы. У тамтэйшым культурным цэнтры «Замак» 2—4 кастрычніка свае выданьні дэманстравалі 80 выдавецтваў, асноўная частка якіх належыць польскім унівэрсытэтам. Арганізатарам кніжнага кірмашу зьяўляецца навуковае выдавецтва Познаньскага ўнівэрсытэту імя Міцкевіча.

Ёсьць і ў нас у Беларусі традыцыя засноўваць выдавецтвы пры навучальных установах, але ніводнае зь іх ня можа пахваліцца такой колькасьцю і якасьцю выданьняў, як у польскіх калег.

3 кастрычніка ў рамках кніжных Дзён была наладжаная дыскусія з удзелам беларускіх і чэскіх калегаў. Дні навуковай кнігі адбываюцца пад патранатам рэктара Познанскага ўнівэрсытэту Станіслава Лоранца, таму пан рэктар асабіста ўдзельнічаў у міжнародным «круглым стале». Склад беларускай дэлегацыі ўдала ўзмацнілі тамтэйшыя студэнты зь Беларусі. Увогуле нашыя землякі эфэктыўна інтэграваліся ў Познань, яны ўтварылі ў гэтым горадзе Беларускі культурна-асьветны цэнтар, сябрамі якога зьяўляюцца нават мясцовыя студэнты-палякі. Кіруе цэнтрам Віталь Воранаў.

Дзейнасьць гэтых хлопцаў і дзяўчат прыносіць надзвычайныя вынікі. Нядаўна засьпяваў па-беларуску познанскі рок-гурт «Triquetra» — гэтым летам ён стаўся адным зь ляўрэатаў «Басовішча». А на цэнтральнай Рынкавай плошчы, на той самай, дзе на вежы гарадзкой ратушы штодзень мераюцца сіламі легендарныя познанскія «koziołki», можна набыць бел-чырвона-белы сьцяжок. І вам патлумачаць, чый гэта такі прыгожы сымбаль.

Ініцыятарам запрашэньня беларусаў на познанскія Дні навуковай кнігі быў прафэсар Багуслаў Бакула. Доўгі час ён дасьледаваў украінскую літаратуру, а сёлета пачаў вывучаць і беларускую.

Ведаючы, што праф.Бакула зьяўляецца яшчэ і актыўным выдаўцом, можна спадзявацца, што неўзабаве ў Польшчы зьявяцца кнігі беларускіх аўтараў. А пакуль у познанскіх кнігарнях іх няма. Ёсьць украінскія (Забужка ляжыць амаль у кожнай кніжнай краме), ёсьць расейскія (палякі асабліва любяць Пялевіна).

І яшчэ пра беларусаў у Познані. Напярэдадні Дзён навуковай кнігі ў гонар 750-годзьдзя наданьня Познані Магдэбурскага права Лявон Тарасэвіч размляваў калёны мясцовага Вялікага тэатру імя Манюшкі. Праграма Дзён запрашала паглядзець на гэты незвычайны твор.

Алесь Аркуш

● НАВІНЫ ●

Пасол Нямеччыны пра супрацу з ЭЗ

Пасол Нямеччыны Ганс Фрык падчас сустрэчы бізнэс-колаў Нямеччыны і Беларусі заклікаў беларускіх вытворцаў да актыўнейшае працы на нямецкім рынку. А беларускі ўрад — да лібэралізацыі ўмоваў супрацы з інвэстарамі з Эўразьвязу. Пасьля пашырэньня ЭЗ ягоная доля ў замежным гандлі Беларусі вырасьце да 35%.

БТ

Гаек у Антвэрпэне

5 кастрычніка беларуская грэка-каталіцкая супольнасьць Антвэрпэну й іншых мясьцінаў Бэнілюксу сабралася на Боскай Літургіі ў царкве Сьвятога Сэрца Ісусавага. Служыў архімандрыт Сяргей Гаек, апостальскі візытатар для грэка-каталікоў Беларусі. У Літургіі ўдзельнічала больш за 70 вернікаў. У казані архімандрыт гаварыў пра абавязак кожнага хрысьціяніна несьці веру, надзею і любоў. Архімандрыт выказаў найлепшыя зычэньні айцу Яну і ўсёй парафіі, прывітаў дзетак зь нядзельнай школкі, якая існуе пры царкве.

Аркадзь Васілеўскі, Антвэрпэн

Сукенка тваёй бабулі

Восеньскія настроі ўплятаюцца ў штодзённы рытм, задаючы новы тон сваркам у крамных чэргах і хуткім частым мабільным тэлефанаваньням. Задаючы новы гук нашым музычным цэнтрам, новыя колеры нашым паласатым шкарпэткам і новыя назвы выданьням, першую старонку якіх мы адгортваем штоночы «на сон».

Восень — час сталасьці. Гэта зорны час паўналетніх і прафэсійная пара паэтаў з самагубцамі. І пакуль нястрымныя вечна юныя дачнікі ўчыняюць «закрыцьцё сэзону», зьдзіраючы плёнку з парнікоў і скуры з растлусьцелых за лета трусоў, не па гадах дарослыя, мы падхопліваем прастуды і натхненьні… Гарачыя канфлікты сканчаюцца цёплымі прымірэньнямі і простымі пацалункамі з адной бурбалкай паветра на дваіх, а агульны вецер восені-2003 мяняе назву «пераменаў» на «супакаеньне» і не сьпяшаецца зрываць далоні кляновых лістоў са старых каронаў.

Ужо амаль месяц, як лета адгрымела курортнымі начамі, ранішнімі зьлівамі, імклівымі аўтамабільнымі падарожжамі і новымі звычкамі сыходзіць назаўсёды. Восень — самы час латаць парваныя дачыненьні, зашываць раны і залечваць укусы. Восень — час пасьлядоўных, упэўненых у новай раніцы людзей, чыё жыцьцё не залежыць ад надвор'я і коштаў на начную дыскатэку. Людзей практычных і амбіцыйных. Якія не раскідаюцца грашыма, а трацяць іх гэтак жа асэнсавана, як і зарабляюць. Тым часам юныя і «зялёныя» ўпадаюць у мэлянхалічна-калядэпрэсіўныя станы чаканьня іншых дзён і новых радасьцяў.

Восеньню ў моду вяртаюцца сапраўдныя заняткі і захапленьні зь мясцовым калярытам: відэагульні разам са звычкай «пагуляць на кампе» саступаюць месца настольным партыям у «Манаполію» і «косьці», а дэманстраваць свой патрыятызм на майках (і майтках) увосень куды актуальней, чым хваліцца новай статуэткай маладога Сідхартхі Гаўтамы ці зорна-паласатай кайстрай цераз плячо.

Восеньскія тэндэнцыі-рэтра ў вопратцы «завісьлі» недзе паміж стылем дзяўчат 60-х і «чувакоў па мэтале» пачатку 90-х. Абутак нібыта ўзяты зь неданошанага арсэналу бабуліных «лодачак» і невысокіх устойлівых чаравікаў на тоўстым абцасе з клясычнымі зашпількамі. Так што пазычыць будзе ў каго. І нічога дзіўнага, калі пытаньне «Гэта твая новая сукенка?» загучыць як «Гэта сукенка тваёй бабулі?».

Бісэрныя паясы і фэнечкі зноў па-за модай. Хіпі, дзякуй Богу, вернуцца на вуліцы з патрабаваньняў сваёй ідэалёгіі, а ня першых павеваў сусьветных модных вырашэньняў. Адзеньне ў духу рок-сэйшнаў раньніх 90-х: чорны колер, мэтал і скура. Усё досыць груба, аднак менш агрэсіўна: атлясныя спадніцы з ланцугамі, кляпаныя камізэлькі, клясычныя чорныя дзягі з масіўнымі спражкамі. Колеры модна скрыжоўваць у пары, найбольш своечасовыя «кактэйлі» — пясочны+шэры, бледна-жоўты+бледна-ружовы, чырвоны+сіні, а таксама пэрманэнтна актуальны чорны зь бела-крэмавым. Парфума спакойная, крыху сумная і цалкам восеньская: «Lacroix Bazar Summer Fragrance» — для настальгічных успамінаў, «Chanson Calme de la Mer» — для пяшчотных судакрананьняў падушачкамі пальцаў, «L'eau par Kenzo» — для ціхага засяроджаньня, «Davidoff Echo» — для шпацыраў праз ужо зусім хуткія зацяжныя дажджы.

У адрозьненьне ад парфумавых крамаў, цырульні восеньню'03 — пад пагрозай банкрутства: у модзе адрошчваць валасы, прычым натуральнага колеру.

Існаваньне робіцца ўсё мабільнейшым: дарагая вячэра з трох страваў у шыкоўнай рэстарацыі для сучасных спатканьняў пасуе куды менш, чым абход за вечар усіх мясцовых бараў, у кожным зь якіх каштуеш па тры кактэйлі. Доўгія лісты, адасланыя Інтэрнэтам, чытаць няма часу, таму кароткія паведамленьні на мабілу з утрыманьнем 0% «левай» інфармацыі вітаюцца ахвотней. Аўтастоп застаецца на долі старых бадзягаў і экстрэмалаў рознага веку — усе астатнія выбіраюць паветраныя падарожжы, падчас якіх можна атрымаць падобныя да касманаўцкіх цюбікі з маслам і сочывам.

Восень — пара суцішэньня. Пара абмакваць сваю мядзьведжую лапу ў каністру зь мёдам і рыхтаваць бярлогі на халодныя часы, заклейваючы вокны сваіх інтэрнатаў скотчам, каб не падхапіць якое віруснае інфэкцыі. Зрэшты, хвароба сёлетняй восені не прастуда і не анарэксія, а бяссоньне. Чым яшчэ можна хварэць у горадзе на Нямізе (па-літоўску «nemiga» — бяссоньне)? Праз пару тыдняў яно дасягне проста касьмічных маштабаў, таму паапякуйцеся, каб пад рукой былі:

1. Рамонкавая гарбата з лыжкай мёду — ужытая цёплай, яна дапаможа заснуць і насьніць дарагіх твараў.

2. Дыск Brainstorm «A Day Before Tomorrow» — поўны недавыказанага паўночнага смутку, самы восеньскі ангельскамоўны прадукт латыскай музыкі напоўніць вязьніцу вашага нясну стомай і жаданьнем утыркнуцца носам у плюшавыя зьвяры вашае спачывальні.

3. А цікавае чытво паспрыяе правабіць паўначы, ня думаючы пра перавагі сну над НЯСНОМ.

Дарэчы, пра чытво. Сярод модных аўтараў па-ранейшаму Каэльё і Гізэр Грэм (Heather Graham), сярод любімых — Булгакаў, Кізі і сёстры Брантэ. Аўтсайдэры не чытаюць увогуле, а вяжуць пухматыя каляровыя гольфы, каб сустрэць першыя мінусавыя тэмпэратуры яркімі і рэвалюцыйна-гарачымі.

Восень расклейвае па сьценах мапы і календары, восень вяртае з марскіх адпачынкаў апошніх дантыстаў і чыноўнікаў. Самадастатковыя і моцныя воляй ліцэісты падарожнічаюць па горадзе ў пошуках ведаў (ці адно аднаго?) і да позьніцы вартуюць свае хатнія працы; першакурсьнікі ўнівэрсытэту асвойваюць здаровы дзённы сон на задніх шэрагах лекцыйных заляў, а старэйшыя курсы падграбаюцца, каб са спазьненьнем пачаць новыя абедзенныя сэсіі ва ўнівэрсытэцкай сталоўцы: Турцыя і Парыж цяпер могуць пачакаць, роўна ж як і бабуліна вёска, дзе ўжо дакопваюць бульбу...

Як бы там ні было, тэндэнцыі — не рэлігія, і кожны з нас застаецца пры ўласным выбары. Апошнія парады: набыць якасны бальзам для вуснаў, комплексныя вітаміны, паслугу «Галасавая пошта» і не забывацца ўкінуць парасон на дно пляцака перад тым, як выйсьці ў сьвет прынцыпова новай (або чарговай — гэта як каму пашанцуе) паненкі Восені.

Teda Lee

Легінсы вяртаюцца

У чорным-чорным горадзе на чорным-чорным подыюме жыла чорная-чорная мода... Гэта ня новая дзіцячая жахалачка, а ўборы восені-2003. У восеньскай моды — дэпрэсія. У калекцыях «прэт-а-партэ» дамінуюць шэры, карычневы і чорны колеры. А дызайнэры апраўдваюцца тым, што чорны — каралеўскі колер. Нават насычаныя чырвоныя, жоўтыя і зялёныя сполахі, што часам урываюцца ў калекцыю, нагадваюць бэнзынавыя плямы на змрочнай вадзе калюжыны.

Галоўная тэндэнцыя сэзону — абараніць цела, ператварыць вопратку ў надзейны панцыр, каб зьберагчы ўнутраную жаноцкасьць. Таму ў парыскіх мадэльераў сёлета такія папулярныя рыцарскія латы, кальчугі і іншае Сярэднявечча зь лёгкім дамешкам футурызму і «Зоркавых войнаў». Але гэта на подыюме. А ў зону цікаўнасьці простых сьмяротных зноў вяртаецца стыль «мілітары».

Вопратка прадстаўленая двума варыянтамі: «трэнч-коўт» і «бомбэр». Першы ўвайшоў у моду на пачатку мінулага стагодзьдзя, і насілі яго генэралы («трэнч-коўт» — паўшынэль), а пасьля апранулі першыя модніцы — Марлен Дытрых, Грэта Гарба, Одры Хёпбэрн. «Трэнч-коўт» — кароткі двухбортны плашч з адкладным каўняром, пагонамі, манжэтамі і накладнымі кішэнямі, на таліі абавязкова зацягваецца поясам. Мода ўсьміхаецца ня толькі даўганогім прыгажуням. Правільна скроены плашч з акуратна павязаным поясам дапаможа схаваць хібы фігуры.

Другая фішка сэзону — «бомбэр», ён жа «авіятар», «куртка лётчыка» другой сусьветнай — кароткая, да таліі, свабодная, на прытачным поясе, з адкладным каўняром і засьцежкай-маланкай. Шыецца «бомбэр» з скуры ці непрамакальных матэрыялаў і мае цёплую падкладку, у адрозьненьне ад «байкера» — «курткі матацыкліста». Той шыецца толькі з скуры і падкладкі ня мае. У гэтых куртках адлюстравалася агульная тэндэнцыя восеньскай моды: прыўзьнятая лінія таліі й пашырэньне плячэй, шырокі «верх» і кароткі «ніз» у абцяжку. «Бомбэр» павінен быць аздоблены адкладным футравым каўняром. Маленькія кавалачкі футра ў нечаканых месцах — прыкмета моднай восені. Нагадваю слова — гаржэтка. Футравыя шалікі можна насіць замест каўняра і зь вячэрняй сукенкаю, і з строем у стылі гранж.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На сваё месца нарэшце вярнулася талія. Хутчэй за ўсё, мы апошняе лета адхадзілі ў нагавіцах, што не зусім прыкрывалі… Вы ведаеце, пра што я. І дызайнэры падкрэсьліваюць гэты факт зыркімі колерамі паясоў, якія быццам крычаць: «Я тут, на таліі! Гэта маё законнае месца!» — і зьяўляюцца маленькай мажорнай аддушынай у змроку восеньскай дэпрэсіі.

Спадніцы скокнулі ўверх, тое самае зрабілі боты. У модзе зноў экстрэмальнае міні. А каб ногі ня мерзьлі, іх прыкрываюць ботамі-панчохамі незвычайнай вышыні. Адзінае выключэньне ў такой цыбата-абцасістай модзе — кароткія боты на пляскатай падэшве. І калі вы выбралі боцікі, што не прыкрываюць каленяў, ці, папросту, туфлі, халодна вам усё адно ня будзе. Бо ў моду вяртаюцца «легінсы». Для тых, хто не засьпеў моды сярэдзіны 80-х, паведамляю: «легінсы» — шчыльныя панчохі без ступні, нешта накшталт тонкіх рэйтузаў, носяцца звычайна зь міні. Яны ўвасабляюць жаданьне прыкрыць аголеныя ногі і не паказацца вельмі сарамяжлівай. У «легінсах» на музычны Алімп узыходзіла Мадонна.

Знаёмы неяк казаў: «Прачытаў у часопісе, што ў модзе міні. Выйшаў на вуліцу — а дзяўчаты ўсе ў штанах». Так, дзяўчаты, нягледзячы на законы, што дыктуе мода, мы маем права насіць штаны. І вузкія, у абцяжку, і расклёшаныя, толькі без матроскай зухаватасьці, і клясычныя, лепш з адваротамі ўнізе. Памятайце адно: талія вярнулася на сваё месца.

Пальчаткі павінны быць доўгія, у экстрэмальным выпадку да локця. А на галаву начапіце кепку: вэльвэтавую, скураную, цьвідавую.

Ф.Собак

За пяцьдзясят кілямэтраў ад восені

За драўлянымі сьценамі дачнае прыбіральні-«шпакоўні» — восень. Эльфійскім поступам цікаеццца паўз намоклае лісьце, далікатна шамаціць рызманамі яблыневых шведраў, блiскучымі вачыма валацужных сабак назірае за крумкачамі, што выдзёўбваюць кісла-сьпелую абляпіху з распаранай зямлі, марудны казюркамі поркаецца ў крывавым ложку каліны... Гэта не пэрсаніфікацыя. Восень сапраўды жывая. І яна жыве на маім лецішчы. На маім восенішчы.

Ейны твар падобны да твару маёй маці, калі яна ляжыць колькі хвілінаў перад сном з расплюшчанымі вачыма.

Яна гэткая ж жывая, як сусед — стары вайсковец, што адзін сядзіць тут да самых маразоў. Прачынаецца а пятай, робіць гімнастыку, падкармлівае напаўздзічэлых сабак і выпальвае па два пачкі за дзень. Яны гаспадараць удваіх — стары і восень.

Пры канцы лета п'яны старшыня дачнага таварыства за дзьве пляшкі замовіў бульдозэр, які разрыў зарослую пажарную сажалку, каб «прыдаць правільную геамэтрычную форму». Цягам дзесяці гадоў людзі абсаджвалі яе дрэўцамі, запускалі карасіную драбязу. Цяпер сажалка мае правільную геамэтрычную форму. Праўда, вады ў ёй — па шчыкалатку.

Сусед усё ня можа прывыкнуць да кучы зямлі й ламачча, што зьявілася акурат у яго пад акном, і зрэдчас мармыча сабе пад нос мацюкі на адрас гора-старшыні.

Палячы пад кволым верасьнёўскім дажджом, адчуваю наперад цеплыню машыны, што хутка павязе мяне ў горад. За пяцьдзясят кілямэтраў ад восені. Яна ж застанецца тут. Яе не забярэш, нібы замерзлае кацянё з круглымі вочкамі зь лесьвічнай клеткі. І, цьмяна ўяўляючы свой цяперашні ўзрост — 22 ці 12? — уздрыгваю ад раптоўнага адкрыцьця: *яна будзе чакаць.*

Еду, напоўнены ціхай урачыстасьцю. Зь японскае магнітолы сьпявае асеньні гурт «ДДТ», у суладзьдзі з бонгавым дробатам дажджу. З-пад дворнікаў зьлятае ліст каліны, што разьвітальным пацалункам прысмактаўся да ўспацелага шкла. Кабета ў сьмешным ружовым дажджавіку робіць нязграбныя пасы з абочыны і разгублена ўсьміхаецца, нібы просіць за нешта прабачэньня. Спыніцца й забраць яе, прамоклую, з часночным пахам, і ўсю дарогу слухаць словы падзякі... Імпульсіўна дадаю газу, пачуваючыся поўным мярзотнікам. У люстэрка задняга агляду кідае апошні дакорлівы позірк восень.

Анатоль Івашчанка

PHOTO.BYMEDIA.NET

Залатая восень

Дзякуючы лагоднаму верасьню, а таксама доўгаму «бабінаму лету» прырода сёлета адклала на два-тры тыдні надыход «залатой восені». Менавіта так называем мы час, калі дрэвы й хмызьняк апранаюцца ў пярэсты строй. Доўжыцца гэта каля месяца, пакуль ліставыя пароды ня скінуць апошняе ўбраньне. Штуршком да гэтага зьяўляюцца некалькі дзён з моцнымі ранішнімі прымаразкамі.

Наагул, сярэднясутачныя тэмпэратуры ў гэты час вагаюцца ад +4 да +12°С. Ападкі ідуць, згодна з назіраньнямі, кожны другі дзень, але ж вядома, якімі працяглымі бываюць кастрычніцкія дажджы. Адбываецца такое калі звычайны ў гэты час моцны цыклён з Атлянтыкі «завісае» над Беларусяй пры адсутнасьці ветру. Вядома ж, дажджы па паўдня не дадаюць настрою ўсім нам, але для расьлін яны неабходныя, асабліва пасьля сьпякотнага лета. У 2002 г., напрыклад, мінімальны ўзровень вады (які завецца межаньню) на большасьці рэк краіны назіраўся ў верасьні і быў анамальна нізкі. Невядома, што было б, калі ня моцныя дажджы менавіта ў «залатую восень».

Здараюцца і іншыя зьявы. Восень 1965 г. была падобная на гэтую: цёплая й павольная. А 11 кастрычніка на значнай частцы краю пайшлі моцныя сьнегапады, якія нарабілі шмат шкоды. Лісьце амаль усё было на дрэвах, і сьнег зь лёгкасьцю ламаў галіны. А пасьля растаў.

А ў 1955-м прыкладна такімі ж днямі ў Беларусі здараліся моцныя грымоты. У Менску навальніца адбывалася ажно два дні — першы й апошні раз за стагодзьдзе.

Юры Фралоў

Сэкс тут і цяпер: абмеркаваньне на форумах

Нумар «Нашай Нівы», прысьвечаны беларускаму сэксу, актыўна абмяркоўваўся на інтэрнэт-форумах (www.nn.by, www.knihi.com, www.litara.net). Вось некаторыя вытрымкі:

sciply, 10.09.2003, 10:37

Пасьля чытаньня сэкс-нумару ў мяне нарадзіўся афарызм: «Творчы чалавек — гэта той, каму хочацца пісаць пра сваё наведваньне прастытутак».

Мікола, 12.09.2003, 4:22

Напэўна, паны Луцкевічы, Уласаў і іншыя пачынальнікі «першай беларускай газэты» перавярнуліся б у сваіх магілах, калі б пабачылі, ЯКІ характар нададзены цяпер іх некалі беларуска-адраджэнскай газэце… Гэты нумар — амаль спрэс пра сэкс і эротыку. Дык жа трэба чакаць, што наступны будзе прысьвечаны хіба што рознай жрачцы, а паанаступны мусіць быць пра ўсялякае пітво… Далей можна зрабіць нумар пра сродкі асабістай гігіены і г.д…

Вядома, у Беларусі патрэбны выданьні эратычныя ды аб эротыцы, гэтаксама як і пра жратву-пітво, сродкі гігіены і аб усім такім падобным. І яны ёсьць — вось цяпер «Нашу Ніву» відавочна трэба лічыць апошнім дадаткам у іх шэрагу.

Але шкада, што ў выніку ПЕРАРАДЖЭНЬНЯ цяпер фактычна ЗЬНІКЛА ў Беларусі тое беларуска-нацыянальна-адраджэнскае выданьне, якое мы раней ведалі як «Нашу Ніву». І яшчэ: несумленна ТАКОЙ цяперашняй «НН» выводзіць свой радавод ад «НН» братоў Луцкевічаў і г.д.

ZmiLa, 12.09.2003, 10:30

Беларускай культуры патрэбна ўсё. І сэкс таксама. «НН» ня будзе цалкам палітычнай газэтай. Гэта — беларуская газэта. Пра беларускае жыцьцё. А ў ім ёсьць і сэкс, і нацыяналізм. То гэта ўсё будзе і ў «НН». Ня плач.

Azef, 12.09.2003, 10:33

Хрэна вам, спадарства!

1. Нумар пра ежу ўжо быў. Спадзяюся, зробяць і яшчэ (прынамсі, хацелася б).

2. Перараджэньня тутака ніякага няма. Вы бачылі падшыўкі «НН» пачатку XX стагодзьдзя? Дзе там выдаўцы ўнікалі надзённых праблемаў сваіх чытачоў? Хіба там не пісалі пра сельскую гаспадарку? Хіба там не вялі асьветніцкай працы наконт гігіены ў побыце?

Здыміце ружовыя акуляры з сваіх ільсьністых пысаў. Паглядзіце праўдзе ў вочы.

Наконт адраджэнства… Вы, вядома, можаце бясконца адраджаць. Але чым у такім разе вы адрозьніваецеся ад будаўнікоў камунізму — гэтага «сьветлага заўтра чалавецтва»? Не адраджаць трэба, а нармальна жыць. Вы, старпёры, усё яшчэ мерыцеся 80-мі гадамі мінулага стагодзьдзя. Прачніцеся — ёсьць маса маладых людзей, якія вырасьлі не пры савецкай уладзе, а пры Рэспубліцы Беларусі. «НН» слушна робіць, што арыентуецца на моладзь, на ейныя інтарэсы.

сузі, 12.09.2003, 13:12

Трэба пісаць пра сэкс, і пра новыя кірмашы, і пра сэрвіс у прыбіральнях, і пра бутыкі з сэканд-хэндамі, і пра хітрыя спосабы разбагацець ды не паказаць сайго багацьця, і пра інтэр'еры, і пра суіцыды, і пра бздуры й лухту, і пра літаратуру й мікалёгію. А адраджэньне разам з лысымі бяззубымі рупліўцамі ў шэрых куртачках і ношаных басаножках астабрыдлі яшчэ пазалетась.

rydel.net, 12.09.2003, 15:10

Як шмат хто кажа, САПРАЎДНАЯ «НН» памерла. Пытаньне толькі ў тым, калі. Усе называюць розныя даты — 1994, 1996, 1997. Але факт, што «НН» «ісьцінная» няма ўжо даўно. Гэта зусім іншая газэта, якая мае тую самую назву, што і ГАЗЭТА НАША НІВА.

Мікола, 12.09.2003, 15:11

«Надзённымі праблемамі сваіх чытачоў» «НН» пачатку стагодзьдзя займалася менавіта так і таму, як то было б мэтазгодна для прамоцыі й рэалізацыі вельмі відавочнай сацыяльна-палітычнай нац.-адраджэнскай праграмы. А НЕ таму, каб забабіць кагосьці на «смажанінку». Вы гэтага пункту ў старой «НН» хіба не заўважылі?..

«Наконт адраджэнства... Вы, вядома, можаце бясконца адраджаць… Не адраджаць трэба, а нармальна жыць».

Цудоўна! Я згодны, што і жыць таксама трэба нармальна. Так, дарэчы, і стараюся. Але пісаць пра гэтае «нармальна жыць» — справа газэтаў «Менскі Бульвар», «Віцебскі Самавар», «Новы Кілбасны Агляд» і часопісу «Месячны Дзённік Здаровага Сэксу». А НЯ «НАШАЙ НІВЫ»! Дык жа «Кілбасных Аглядаў» у нас ёсьць і заўсёды будзе. Я ж шкадаваў, што вось ня маем болей такой газэты, як «Наша Ніва».

anna, 12.09.2003, 17:23

У «НН-сэкс» мяне ўразіў не Бартосік, а Вольга Караткевіч. Радком «Сэксу хочуць усе». Ня столькі безапэляцыйнасьцю, колькі недакладнасьцю.

аяш, 12.09.2003, 18:06

Вывад: ня плысьці па чужым, навязаным нам цячэньні, як гэта робіць амаральная частка «адраджэнцаў» (выраджэнцаў).

Ёмкі Дзядзька, 14.09.2003, 08:52

Як сказаў Пазьняк на пачатку 90-х, «у Беларусі эротыкі няма і ніколі не было!»

Пачытаўшы гэты форум, мне падалося, што сапраўды гэта так, прынамсі для старэйшага пакаленьня беларускіх патрыётаў. А што тады ў Беларусі было? Бульба (з XVIII—XIX ст.), зямелька гарапашная, конік кульгавы ды саха. (Чытайце клясыкаў, вэтэраны адраджэньня).

Дык гайда на вёску ўсімі суполкамі, адродзім сапраўдную Беларусь, тую, што засела ў генэтычнай памяці, пра якую сьняцца сны ў гарадзкіх ложках. Чаго ж Вы, большасьць старой інтэлігенцыі, ёй здрадзілі — уцяклі ў горад, да гвалту і сэксу, тэлевізараў і спакусаў?

НЕ — ЭРОТЫЦЫ І СЭКСУ! ТАК — БУСЛУ І КАПУСЬЦЕ!

fuf, 14.09.2003, 11:34

Думаю, што тут як з палітыкамі. Ці ў Беларусі няма свайго Жырыноўскага або Тыміньскага? Ёсьць і блазны, і дэбілы. Але ўся рэч у стаўленьні грамадзтва да іх. У Беларусі ўсё, што кажа беларускі Жырык (які-небудзь Касьцян), — гэта дзяржаўная палітыка, а ня простая дурасьць. Лукашэнка, натуральна, — галоўны эксцэнтрык. Але жыцьцё ў нас — чорна-белае. Няма россыпу рознакаляровых шарыкаў. Таму і сэкс у адраджэнскай газэце ў нас успрымаецца як «блазан у парлямэнце». Паколькі ж у нашым парлямэнце ўсе па вызначэньні — дзяржаўныя мужы, дык мы ня можам з усяго гэтага парагатаць або пакпіць, а з сур'ёзным тварам кажам пра перараджэньне «парлямэнту» — адраджэнскай газэты. Насамрэч праблема ў ракурсе, зь якога глядзім на гэта ўсё мы самі. Увесь народ.

Чытачка АРХЭ, 17.09.2003, 22:29

Тэма сэксу ў творчасьці жанчын — рэч досыць спрэчная. Quod licet bovi, non licet Jovi.

Я на свае вочы бачыла, як за эратычныя (добра напісаныя!) вершы крытыкавалі дзяўчыну. Увага: крытыкавалі менавіта за зварот да такой тэмы. Хлопец сказаў прыблізна так: «Вось у Жыбуля — гэта жартоўна, а ў цябе сур'ёзна… Замуж табе трэба...»

anna, 18.09.2003, 9:24

Вяртаецца беларус з камандзіроўкі. Жонка адчыняе дзьверы і чмокае яго ў шчаку. Беларус:

— І да чаго такая оргія?

Гэта я па ТВ-канале «Расея» пачула.

Juraś, 20.09.2003, 20:10

Ubačyŭ ja hety numar. Miarzota. Niejkija jašče dzieŭki z hołymi cyckami, bolšaść tekstaŭ — čarnucha prymityŭnaja, kali b nia mova, ja b padumaŭ, što heta nia «Naša Niva», a niejkaje rasiejskaje спідынфо. Nie, niaŭžo HETA «Naša Niva»??? Hołaja dzieŭka — najbrydčejšaje hledzišča ŭ śviecie! Seks — haniebny dehieneratyŭny zaniatak! Dałoŭ erotyku i seks!!!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Геаграфія Глёбуса

Усьлед за тоўстымі глянцавымі «Творамі» Глёбуса выйшла наступная кніга сэрыі: танчэйшыя, але такія ж глянцавыя «Сшыткі». Не хацелася б, каб наступнай кнігай былі «Лісты». Не хацелася б таксама, каб ад кніжкі да кніжкі пагаршалася якасьць паперы.

Агульны настрой «Сшыткаў» — адпачынкавы, ненавязьлівы. У большай частцы гэта рэфлексіі, выкліканыя летнімі падарожжамі. Чытаць найлепш у спакойнай абстаноўцы зь любой старонкі.

Глёбус багата зрабіў для таго, каб ізноў навучыць беларуса правільна лічыць кілямэтры. Бо ад Менску да Барсэлёны бліжэй, чым да Якуцку, а да Вільні — чым да Бранску і г.д. На Каталёнію, Рым, Парыж і Лёндан сучасьнікі глядзяць праз Глёбусавы акуляры, паралельна засвойваючы тое, што між радкоў. А між радкоў — беларуская постканяніяльная тэорыя, сфармуляваная ў маскоўскіх малюнках ды крымскіх замалёўках яшчэ годзе так у 92-м.

Глёбусавы падарожжы ў вялікай меры ўнутраныя: яны не набываюць тым большую каштоўнасьць, чым далейшы аўтар ад дому. Пра вандроўку ў Ракаў напісана зь няменшым кайфам, чым пра Эгіпэт.

Той, каму ўсё гэта нецікава, можа паглядзець «карцінкі». На іх ёсьць сам аўтар і яго творчасьць, ёсьць голыя дзеўкі (здыманыя і маляваныя), ёсьць нават бюст Гётэ.

Усё гэта разам, у спалучэньні з накладам у тысячу асобнікаў і цаной 15 тысяч рублёў, дазваляе зрабіць выснову: кніжка заўважная. Іначай нельга: назваўся Глёбусам — круціся як хочаш.

P.S. Фота аўтара на форзацы — а la спалоханы Аляхновіч.

Яўген Квач

Насалода Міцкевічам

Працяг са старонкі 6.

Ды чаго дзівіцца, што пан Урбанкоўскі з скрыгатам зубоўным згадвае пра беларускае паходжаньне Вешчуна, пра беларускія рэаліі і матывы ў ягонай творчасьці, абмінае вядомае выказваньне пра нашую мову ў Калеж дэ Франс, калі нават сын Паэта — Уладзіслаў — прыклаў нямала намаганьняў, каб дарэшты спольшчыць свайго бацьку-ліцьвіна.

Новы зборнік Міцкевіча, як і надрукаваная летась кніга ягонага аднакашніка Ігната Дамейкі, дае матэрыял для роздуму. Здаецца, што ў прадмове беспадстаўна гаворыцца пра «беларускіх паноў» Верашчакаў: яны не атаесамлялі сябе з «простым людам». Эмілія Плятэр — не беларуская Жанна д'Арк: і не атаесамляла сябе зь людам, і паўстаньне 1831 г. было для буйное шляхты апошнім рокашам, а не рэвалюцыяй. (Дарэчы, род Плятэраў можа быць паказальным у сэнсе дэградацыі. Даўшы такую слаўную дачку, ён у 1863 г. нічым ня ўславіцца, у 1904 г. Адам, Аляксандар, Мар'ян і Юры Плятэры будуць пляскаць у ладкі на адкрыцьці помніка Кацярыне II у Вільні, а ў 1926 г. граф Плятэр разам зь іншымі панамі будзе шукаць у Пілсудзкага ўправы на Сялянска-работніцкую грамаду.) Дый філяматы — не беларуская моладзь: ня зь люду. У першай палове XIX ст. яшчэ цьвёрды быў падзел нашае краіны на Літву і Беларусь. І філяматы пачуваліся ліцьвінамі, людзьмі паходжаньня рускага, а нацыі польскае. А вось Ян Баршчэўскі пачуваўся сынам Беларусі, хоць, ізноў жа, нацыі польскае.

Мы можам услаўляць Міцкевіча як песьняра тае Літвы — Навагрудчыны, Панямоньня, як пачынальніка рамантызму. Але пісаць, што Міцкевіч ня стаў «цалкам беларускім паэтам» толькі дзеля таго, што «не было яшчэ ні беларускага чытача, ні беларускага выдаўца», рызыкоўна. Чытач быў: беларускае сялянства ўжо азвалася голасам Паўлюка Багрыма. І больш за 50% шляхты ў побыце карысталіся беларускаю. З другога боку, Адам Завадзкі і Ёкель Дворац не былі беларускімі выдаўцамі, але друкаваць кнігі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча не адмовіліся. Ды згадаем, што менавіта Дунін-Марцінкевіч першы аб'яднаў у сваёй сьвядомасьці Літву і Беларусь ды сьведама «пад старасьць зрабіўся песьняром беларускага народу». А для гэтага трэба было, каб літаратура сапраўды дэмакратызавалася, каб Марцінкевіча падтрымліваў Уладзіслаў Сыракомля. Міцкевіч ня стаў цалкам беларускім паэтам, таму што да гэтага не дасьпела грамадзкая сьвядомасьць і, калі быць пасьлядоўным, грамадзкае быцьцё таксама.

Зь філямацкае пары ў тутэйшым «польскім грамадзянстве» акрэсьліліся дзьве лініі: міцкевічаўская і дамейкаўская. Адна праз Дуніна-Марцінкевіча і Сыракомлю вяла да Францішка Багушэвіча, братоў Луцкевічаў і Янкі Купалы, другая — да графоў Плятэраў і Тышкевічаў, князёў Любамірскіх і Радзівілаў, Сапегаў і Чартарыйскіх, якія прасілі колішняга беларуса Пілсудзкага (сам называў сябе беларусам) і распаўсюдніка кніжак Багушэвіча распраўіцца зь беларусамі. Гэтыя людзі ў найлепшым разе маглі нешта даць чужым народам, свайму ж — нічога.

Да такіх высноваў прывяла мяне новая кніга Міцкевіча, якую ўклаў, пракамэнтаваў і забясьпечыў прадмоваю Кастусь Цьвірка. А чытаць Вешчуна — заўсёды асалода. Шчасьлівы той, хто ведае польскую. Калі ж не, тады трэба разгарнуць гэтую кнігу.

Анатоль Сідарэвіч

ДЫСКАГРАФІЯ

Аранжавае сонца

Оранжевое солнце. Краскі (р), Real Rec. 2003

Папсавікі як матылькі — зьмяняюць адзін аднаго літаральна штодня, і стала замацавацца сярод гэтых усіх дзявочых-хлапечых камандаў амаль немагчыма. А «Краскі» ў такіх варунках выдалі трэці альбом і амаль запісалі чацьверты.

Альбом «Оранжевое солнце» не зусім звычайны, бо атрымаўся ён у выніку віртуальнага эксперымэнту: на пачатку лета на сайце выдаўца і прамоўтэра «Красак» кампаніі «Real Records» быў абвешчаны конкурс на стварэньне найлепшага рэміксу на ранейшыя песьні «Красак». Найболей удалыя рэміксы (15 трэкаў) можна пачуць на гэтым альбоме (калі, вядома, вам цікава слухаць рэміксы на танцавальную музыку). Акром гэтага ёсьць на дыску тры новыя творы (на загалоўную песьню альбому днямі быў зьняты кліп).

«Краскі» тым часам перакладаліся на ангельскую мову і паехалі з турам па Нямеччыне і Галяндыі.

Сяргей Будкін

МЕНСКАЯ ПРЭМ'ЕРА

Чатыры бандыты без сабакі

Расейскае кіно 90-х ступеньню «чарнушнасьці» нагадвае прозу Юр'я Станкевіча. Яшчэ ў перабудовачны час «праўда жыцьця» пачала настойліва выпіхваць з экрану «пазытыў» і ўрэшце выпхнула зусім. Нават дзіцячае кіно, якое паводле азначэньня павінна быць сьветлым, зьвялося да фільмаў пра беспрытульнікаў і малалетніх злачынцаў («Прывітаньне ад Чарлі-трубача», «Спартак і Калашнікаў»).

Вось і ў новым фільме «Бумэр» рэжысёр-дэбютант Пётар Буслоў зьвяртаецца да жыцьця напаўкрымінальных «нізоў». Фільм апавядае пра чатырох «крутых» сябрукоў, якія не падзялілі сяго-таго зь яшчэ круцейшымі ды змушаныя былі кінуцца ва ўцёкі на ўгнаным «бумэры» (ці, па-простаму, аўтамабілі «BMW»). Яны думаюць, што змогуць пересядзець заваруху ў правінцыі, але... аўтары фільму вырашылі ня быць паблажлівымі да сваіх герояў.

На расейскую правінцыю ў расейскіх фільмах лепей не глядзець. Праўда, успомніўшы Станкевіча, спадзяешся, што павінен быць і іншы, нармальны бок. У «Бумэры» гэты бок ледзьве праступае. Сымпатыю выклікае вобраз Сабачыхі (на здымку) — народнай лекаркі, да якой «браткі» зьвяртаюцца па дапамогу, калі аднаго зь іх пратыкаюць адкруткай дальнабойшчыкі. А вось міліцыя ў фільме падаецца безь ніякіх сьветлых фарбаў — суцэльныя хабарнікі і круцялі.

Стваральнікі «Бумэру», відавочна, хацелі паказаць гледачам, што нічога прывабнага ў жыцьці крутых няма, што яны зазвычай кепска скончаюць. Вартая задума. Вось толькі ці дасягаецца пастаўленая мэта? Бо гледачам даводзіцца суперажываць бедным «браткам», якім скрозь не шанцуе. А ад суперажываньня няпроста перайсьці да асуджэньня.

Галоўныя пэрсанажы быццам і калярытныя па-свойму, «пабраткоўску», але індывідуальнасьці ім не стае. А калі дадаць амаль аднолькавую вопратку і гаворку на аднолькава ўзорнай «фені», то нескладана зблытаць аднаго «героя» з другім.

Фільм глядзіцца дастаткова цікава, але «адкрыцьцём» мне не падаўся. Хоць ён і ўзяў касавы рэкорд апошніх гадоў: зборы пераваліл за мільён даляраў.

Іван Пятроў

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Азёры Беларусі ў легендах і паданьнях / Склад., запіс, апрац. А.Ненадаўца. — Менск: Беларусь, 2003. — 327 с. — (Мой родны кут). 3500 ас.

Нарач, Князь-возера, Нешчарда й яшчэ сотні азёраў праз прызму паэтычнага народнага сьветаўспрыманьня. 2800 руб.

Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе: Асобныя выданьні: Бібліяграфія / Беларускі ін-т навукі й мастацтва; Склад. З.Кіпель, В.Кіпель. — Нью Ёрк—Менск, 2003. — 584 с.

Астаповский В., Божанов В., Малиновский В. История белорусской государственности: Учеб. пособие / Академия управления при президенте. — Минск, 2002. — 192 с. 200 ас.

Утварэньне Рэчы Паспалітай аўтары дапаможніка называюць інкарпарацыяй ВКЛ у Каралеўства Польскае. Разьдзел, прысьвечаны ня дужа спрыяльнаму для нацыянальнай дзяржаўнасьці пэрыяду 1795—1917 г., носіць сьціплы назоў «Дзяржаўна-прававыя адносіны Беларусі й Расеі».

Документы по истории православной церкви на Беларуси XVIII—XX в. в фондах государственных архивов Республики Беларусь: Межархивный справочник / Авт.-сост. О.Добычина и др. — Минск: БелНИИДАД, 2003. — 284 с.

Шарков А. Архипелаг ГУПВИ: Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944—1951 г. — Минск: Тесей, 2003. — 168 с.: ил. 1000 ас.

У адбудове разбуранага вайною Менску ўдзельнічалі нямецкія ваеннапалонныя. Але ж былыя вайскоўцы Вэрмахту працавалі ня толькі на аднаўленьні сталіцы: па ўсёй тэрыторыі Беларусі дзейнічала сетка лягераў для інтэрнаваных і палонных. Кніга ўпершыню асьвятляе гэтую старонку гісторыі. Пытайцеся ў «Акадэмкнізе». Цана 9000 руб.

Тацяна Вабішчэвіч

Джон Максвэл Кутзэе

Эсэ пра цэнзуру

Зьдзяйсьненьне абразы

Прадмова

Пісьменства не квітнее пад цэнзурай. Гэта ня значыць, што вырак цэнзара, ці ўнутранага вобразу цэнзара, — гэта адзіны ці нават галоўны чынньнік ціску на пісьменьніка: ёсьць формы ціску, успадкаваныя, набытыя ці накінутыя самому сабе, якія могуць адчувацца больш пакутліва. Могуць нават быць выпадкі, калі вонкавая цэнзура падбівае пісьменьніка на цікавыя шляхі ці спрыяе вынаходлівасьці. Але Эзопавы хітрыкі, на якія правакуе цэнзура, зазвычай ня больш як дасьціпныя; тады як перашкоды, якія пісьменьнікі здольныя наклікаць самі на сябе, пэўна, досыць шматлікія і разнастайныя, каб не шукаць дадатковых.

Тым ня менш, для агульнага дабра, для дабра дзяржавы час ад часу ўсталёўваюцца мэханізмы рэгуляваньня і кантролю, якія, паводле бюракратычнай завядзёнкі, растуць і ўмацоўваюць самі сябе. Пісьменьніку цяжка стрымаць недаверлівую ўсьмешку, назіраючы за маштабнасьцю такіх мэханізмаў. Калі выявы, простыя цені, сапраўды настолькі небясьпечныя, думае ён, тады пэўна, што адэкватнымі контрзахадамі былі б іншыя выявы, контрвыявы. Калі насьмешка зьневажае дзяржаву, калі блюзьнерства абражае Бога, калі парнаграфія прыніжае пачуцьці, дык, пэўна, досыць было б узьняць мацнейшыя і больш пераканаўчыя контргаласы на абарону аўтарытэту дзяржавы, на хвалу Бога, на ўзьвялічаньне цнатлівага каханьня.

Гэты адказ цалкам адпавядае тэлеалёгіі лібэралізму, які верыць у адкрыцьцё рынку спаборным сілам, бо ў доўгатэрміновай пэрспэктыве рынак хіліцца да дабра, гэта значыць да прагрэсу, які лібэралізм разумее ў гістарычным і нават мэтафізычным сьвятле. Гэта цалкам супярэчыць сьветагляду больш строгіх плыняў ісламу, юдаізму і пратэстанцкага хрысьціянства, якія — заўважаючы спакусьлівую і д'ябальскую сілу ў корані моцы выявы і таму ня маючы падставаў спадзявацца, што ў вайне выяваў, вайне бяз правілаў, добрыя выявы здабудуць перамогу, — уважаюць за лепшае забараняць ідалаў.

Тут мы дасягнулі зыходнага пункту спрэчкі аб правох індывідуума як супярэчных правам калектыўнага. Спрэчка досыць даўняя, каб не разглядаць яе тут падрабязна, і да яе мне няма чаго дадаць, апроч, хіба што, перасьцярогі ад тае маральнае чуйнасьці, якая прыводзіць да вызначэньня ўразьлівых групаў людзей дзеля абароны іх ад шкодаў, прыроду якіх ад гэтых людзей належыць хаваць. Бо (гэта аргумэнт проста ведаць зло — значыць пакутаваць ад яго. Я маю тут на ўвазе найперш дзяцей, хаця гэты ж аргумэнт прыводзіць і ў дачыненьні да гэтак званых «легкаверных». Мы заклапочаныя тым, як абараніць дзяцей, у значнай меры — як абараніць іх ад іхнай бязьмежнай цікаўнасьці да полавых пытаньняў. Але мы не павінны забываць, што дзеці ўспрымаюць кантроль над іхнымі дасьледаваньнямі — кантроль, які паводле азначэньня ня можа дакладна назваць тое, што забаронена, — не як абарону, а як фрустрацыю. Ці ня могуць дзеці з тых захадаў, якія дарослыя робяць, каб не дапусьціць задавальненьня дзіцячай цікаўнасьці, лягічным чынам выснаваць, што іхная цікаўнасьць вартая асуджэньня; а з тлумачэньняў, якімі дарослыя абгрунтоўваюць абмежаваньне іхнай свабоды, — хісткіх тлумачэньняў — ці ня могуць яны выснаваць, што іх лічаць няздольнымі паводзіцца маральна? Ці ня можа этычная крыўда, зробленая дзіцяці ў гэтым працэсе, быць трывалейшай, чым любая шкода, якую дзіцё можа пацярпець, ідучы сьледам за сваёй цікаўнасьцю?

Гэта ня ёсьць ані аргумэнтам за, ані аргумэнтам супраць таго, каб хаваць сэксуальна выяўныя матэрыялы ад дзяцей. Гэта рэфлексія пра суадносіны розных шкодаў, пра балянс эфэмернасьцяў, пра выбар паміж злом і злом. Робячы такі выбар, мы маглі б уключаць у нашыя разьлікі тэзу, што рэчы, якія дарослыя робяць адно аднаму ці зь целамі адно аднаго, ня толькі інтрыгуюць ці бянтэжаць малое дзіця, але й падаюцца яму звыродлівымі і сьмешнымі, аж да дурасьці; а таксама ўвагу, што — незалежна ад таго, ці дзіцяці ўдаецца блякаваць думку, што і ягоныя бацькі могуць рабіць тое, што робяць людзі на карцінцы, — маці ці бацьку цяжка не праектаваць гэтай думкі на дзіця і, зноў перажываючы яе празь дзіця, не адчуваць зьбянтэжанасьці, сораму і нават злосьці. Ня варта нам забываць і пра тое, хто найбольш зьбянтэжаны, калі бесстороньняму пагляду дзіцяці адкрываюцца відовішчы грубай дарослай аголенасьці. Гэта складаны момант; але ці не ўваходзіць у нашае жаданьне хаваць такія відовішчы ад дзіцяці жаданьне не апусьціцца, паводле ўласнай асацыяцыі, у вачах дзіцяці, ня стаць аб'ектам дзіцячай агіды ці кпіны? Макс Шэлер разрозьнівае аголенасьць Афрадыты, выяўленай з такой пачцівасьцю, што здаецца, вакол яе статуі покрыва цноты, і «дэанімацыю», альбо страту душы, якая адбываецца, калі прымітыўная або дзіцячая цікаўнасьць страчаная і на аголенае цела глядзяць дасьведчаныя вочы. Ён зьвязвае дэанімацыю з тым, што ён называе «апэрцэптыўным вылучэньнем» полавых органаў зь цела: калі яны ўжо не ўспрымаюцца як адно цэлае зь целам, ані яшчэ не ўспрымаюцца як «абсягі выражэньня ўнутраных жарсных рухаў», полавыя органы — асабліва, можна зацеміць, мужчынскі орган, падобны з выгляду да нейкай высунутай кішкі, — рызыкуюць стаць аб'ектамі агіды. Ня дзіва, што нам хочацца ахаваць дзяцінства ці дзяцей, абараняючы іх ад гэткіх відовішчаў; але чые пачуцьці мы баронім у першую чаргу — іхныя ці нашы ўласныя?

Полавыя органы, заўважае Сьвяты Аўгустын, рухаюцца незалежна ад волі. Часам яны рэагуюць на тое, на што нам ня хочацца, каб яны рэагавалі; часам яны застаюцца «мёртвымі», калі мы хочам іх ужыць. Ад гэтай непаслухмянасьці плоці, пазнакі падзеньня, ня вольны ніхто, нават вартаўнікі нашых нораваў. Цэнзар, які абвяшчае забарону ці то на непрыстойнае відовішча, ці то на іранічную імітацыю, падобны да мужчыны, які спрабуе ўстрымаць свой пэніс ад эрэкцыі. Гэтае відовішча сьмешнае, такое сьмешнае, што неўзабаве ён стае ахвяраю ня толькі свайго непакорлівага чэлеса, але і настаўленых на яго пальцаў ды сьмеху людзей. Таму інстытут цэнзуры мусіць атачаць сябе другаснымі забаронамі абразы яго годнасьці. Ад раздражненьня да сьмеху з раздражненьня і да забароны сьмеху з раздражнёнага — надта добра ўсім вядомае разьвіцьцё падзеяў у тыраніі, якое дае нам дадатковыя падставы для перасьцярогаў.

Што да вышэйпададзенага параўнаньня, хіба няма патрэбы зазначаць, што той, хто абвяшчае забарону, не абавязкова мусіць быць мужчынам. Чалавек, які абвяшчае забарону, гэткім чынам заяўляе права на фалас, але фалас у яго зямной форме пэніса. Займаючы пазыцыю цэнзара, ён у выніку стае сьляпым катом, тым, хто стаіць у цэнтры кола ў гульні ў сьляпога ката. Цягам часу, пакуль павязка сьляпога, якая служыць яго пазнакай, узвышае яго і не дае яму перадаць ягоную ролю далей, ягоны кон — быць дурнем, які спатыкаецца, зь якога сьмяюцца і ад якога ўцякаюць. Каб панаваў дух гульні, дух дзіцяці, цэнзар мусіць прыняць сваю ролю клоўна, каралявать усьляпую. Цэнзар, які адмаўляецца быць клоўнам, які зрывае павязку сьляпога і вінаваціць ды карае насьмешнікаў, не гуляе ў гульню. Такім чынам ён стае, паводле Эразмавага парадоксу, сапраўдным дурнем, ці, хутчэй, фальшывым дурнем. Ён дурань, бо ён ня ведае, што ён дурань, бо ён думае, што, стоячы ў цэнтры кола, ён — кароль.

Дзеці як такія не нявінныя. Мы ўсе былі дзецьмі і ведаем — калі ня лічым за лепшае забыць, — у якой малой ступені мы былі нявіннымі, якія рашучыя пэдагагічныя захады спатрэбіліся для таго, каб зрабіць нас нявіннымі, як часта мы спрабавалі ўцячы са сцэнічнай пляцоўкі дзяцінства і як няўмольна нас загнялі назад. Годнасьць таксама ня ёсьць прыроджана ўласьціваю нам. Безумоўна, мы нараджаемся бяз годнасьці і мы бавім досыць часу самі з сабой, схаваныя ад вачэй іншых, робячы рэчы, якія мы робім, калі мы самі з сабой, каб ведаць, у якой малой ступені мы можам шчыра прэтэндаваць на годнасьць. Мы таксама досыць бачым жывёлінаў, якіх шануюць за іхную годнасьць (катоў, напрыклад), каб ведаць, якімі камічнымі могуць быць прэтэнзіі на годнасьць.



AP

Нявіннасьць — гэта стан, у якім мы хочам трымаць нашых дзяцей; годнасьць — гэта стан, на які мы прэтэндуем самі. Абразы нявіннасьці нашых дзяцей ці годнасьці нашых асобаў ёсьць нападамі не на нашую экзыстэнцыйную істоту, а на канструкцыі — канструкцыі, паводле якіх мы жывём, але, тым ня менш, канструкцыі. Я не хачу гэтым сказаць, што абразы нявіннасьці ці годнасьці ня ёсьць сапраўднымі абразамі ці што гвалт, якім мы на іх адказваем, ня ёсьць сапраўдным, у сэнсе шчыра адчуваным. Парушэньні сапраўдныя; аднак тое, што парушаецца, — гэта ня нашая сутнасьць, але фундамэнтальная фікцыя, якую мы больш ці менш шчыра вызнаём, фікцыя, якая, зусім магчыма, неабходная для справядлівага грамадзтва, — маецца на ўвазе выдумка, нібыта чалавечыя істоты маюць годнасьць, якая адрозьнівае іх ад жывёлаў і гэтым абараняе іх ад абыходжаньня зь імі як з жывёламі. (Магчыма нават, што мы дажывём да дня, калі й за жывёламі будзе прызнаная годнасьць і забарона будзе перафармуляваная ў забарону абыходжаньня з жывой істотай як з рэччу.)

Фікцыя годнасьці дапамагае вызначыць людзкасьць, а статус людзкасьці дапамагае сфармуляваць правы чалавека. Такім чынам, ёсьць рэальны сэнс у цьверджаньні, што абраза нашай годнасьці б'е па нашых правах. І тым ня менш, калі, балюча закранутыя такой абразай, мы ўстаём на абарону сваіх правоў і патрабуем сатысфакцыі, добра было б узгадаць, наколькі беспрадметнай ёсьць годнасьць, на якой грунтуюцца гэтыя правы. Забываючы, адкуль паходзіць нашая годнасьць, мы можам апынуцца ў позе такой жа камічнай, як поза сярдзітага цэнзара.

Жыцьцё, кажа Эразмава «Пахвала дурасьці», гэта тэатар: кожны з нас мае прамаўляць свой тэкст і гуляць сваю ролю. Актор аднаго тыпу, прызнаючы, што ён удзельнічае ў спэктаклі, тым ня менш будзе працягваць гуляць; актор іншага тыпу, шакаваны адкрыцьцём таго, што ён удзельнічае ў ілюзіі, паспрабуе сысьці са сцэны і з п'есы. Другі актор памыляецца. Бо па-за тэатрам нічога няма, няма альтэрнатыўнага жыцьця, да якога можна было б далучыцца, пакінуўшы гэтае. Шоў, так бы мовіць, — адзінае шоў у горадзе. Усё, што можна зрабіць, — гэта працягваць гуляць сваю ролю, хоць, магчыма, з новым усьведамленьнем ролі, усьведамленьнем камічнасьці.

Такім чынам, мы апынаемся перад парай парадоксаў у духу Эразма. Годнасьць, вартая павагі, — гэта годнасьць бяз годнасьці (досыць адрозная ад несьвядомай ці натуральнай годнасьці); нявіннасьць, вартая павагі, — гэта нявіннасьць безь нявіннасьці. Што да самой павагі, спакусьліва прыпусьціць, што гэта залішні панятак, хоць для функцыянаваньня тэатру жыцьця ён можа аказацца абсалютна неабходным. Сапраўдная павага ёсьць разнавідам каханьня і можа быць залічаная да формаў каханьня; паважаць кагосьці — значыць, між іншым, прабачаць гэтай асобе нявіннасьць, якая па-за тэатрам была б фальшывай, і годнасьць, якая была б сьмешнай.

Пераклаў з ангельскай Алесь Пяткевіч, паводле http://www.press.uchicago.edu/Misc/Chicago/111741.html

---

Джон Максвэл Кутзэе нарадзіўся ў Паўднёвай Афрыцы ў 1940 г. Вывучаў матэматыку і ангельскую мову ў Кейптаўнскім унівэрсытэце; пераехаўшы па скончэньні ўнівэрсытэту ў Лёндан, працаваў праграмістам. Ад 1965-га жыў у ЗША, дзе атрымаў ступень доктара лінгвістыкі і некалькі гадоў працаваў выкладчыкам. Пасьля вяртаньня ў Паўднёвую Афрыку працуе выкладчыкам Кейптаўнскага ўнівэрсытэту. Ён аўтар раманаў, зборнікаў эсэ. Кутзэе — пісьменьнік складаны, і папулярны найперш у акадэмічных колах, дзе ён лічыцца за найвыбітнейшага паўднёваафрыканскага пісьменьніка. Літаратуразнаўцы часта параўноўваюць Кутзэе з Дастаеўскім і Кафкам. Кутзэе быў першым пісьменьнікам, які двойчы атрымаў брытанскую літаратурную прэмію «Букер»: упершыню — у 1983 г. за раман «Жыцьцё і час Майкла К.», другі раз — у 1999 г. за раман «Ганьба» («Disgrace»). Швэдзкія акадэмікі, што прысудзілі Кутзэе літаратурнага Нобэля-2003, у абгрунтаваньні свайго выбару адзначылі выкшталцоную кампазыцыю, зьмястоўнасьць дыялёгаў і аналітычную бліскучасьць твораў Кутзэе, а таксама тую бязьлітасную крытыку «хорсткага рацыяналізму і вонкавай маральнасьці заходняй цывілізацыі», якой поўныя ягоныя творы. Кутзэе ніколі не паўтараецца ў тэматыцы і кампазыцыі сваіх твораў. Ён не столькі пясьняр, колькі мысьляр самоты чалавечай, але і годнасьці людзкой, нягледзячы на самоту.

Беларусы — найхарашэйшыя

Андрэй Аджба з Бабруйску перамог у міжнародным конкурсе «Містэр Мадэль Сьвету» ў намінацыі «Найхарашэйшы твар». Найпрыгажэйшы хлопец Зямлі працуе на Бабруйскім шынным камбінаце, вучыцца завочна на маскоўскім юрфаку, валодае каратэ, сустракаецца з адзінаццікласьніцай. А нарадзіўся ён у мястэчку Косава.

Дзьмітры Каява зь Менску выйграў Кубак Беларусі па бодыбілдынгу і фітнэсе. Спаборніцтва праходзіла ў Пінску. На сёлетнім чэмпіянаце Эўропы нашая зборная заняла чацьвертае месца.

ВІКТАР ПРАШУК

Дзьмітры Каява

Кумір культурыстаў **Арнольд Шварцэнэгер** таксама перамог. На гэты раз — 134 кандыдатаў на пасаду губэрнатара Каліфорніі. Выбарцы прагаласавалі за датэрміновую адстаўку ўжо былога губэрнатара Дэвіса і абралі «Шварца». За яго агітавала жонка і нават цешча — сястра Джона Кенэдзі. У 1990-я ў беларускія СМІ была запушчаная «качка» наконт таго, што Шварцэнэгер — пазашлюбны сын Радаслава Астроўскага, прэзыдэнта Беларускай цэнтральнай рады. Нібыта вядомы калябарант у 1944-м уцякаў праз Аўстрыю на Захад і на кароткі час затрымаўся ў доме маці Арнольда. Не ўлічыў толькі аўтар вэрсіі, што Шварцэнэгер нарадзіўся ў 1947-м.

Пятру Пільневічу, герою леташніх «Дажынак», а пасьля — судовых разборак, зьменшылі пакараньне. Судзьдзі палічылі, што ў фальшаваньні вынікаў жніва ён вінаваты, але турму замянілі на папраўчыя работы. Прыпіскі ж рабіліся ня ў полі, а ў раённых ды абласных кабінэтах. І адтуль добра відаць, як цягаюць Пільневіча па судах.

Расейцы зацанілі Сідорскага

Сяргея Сідорскага пасьля спрэчкі з Касьянавым запаважалі ў Маскве. Расейская газэта «Ведомости» назвала яго чалавекам тыдня — «каржакаватым, упэўненым у сабе мужыком», які ўмее адстойваць інтарэсы краіны.

Барысаўскі хлапец прапіўпрагуляў за пару месяцаў 50 тыс. даляраў. Разам з двума братамі ён скраў з офісу свайго цесьця-прадпрымальніка сэйф. Адвёз у лес, адчыніў і па-братэрску падзяліў 70 тыс. даляраў, што там былі. Па дзясятцы (тысячаў) даў братам, за пятнаццаць купіў джып, а астатнія прасадзіў у менскіх кабаках. Чым і прыцягнуў увагу органаў.

Валер'ю Фралову і **Ўладзімеру Парфяновічу** з дэпутацкай групы «Рэспубліка» на літоўска-беларускай мяжы наладзілі пэрсанальны ператрус. Шукалі валюту «на фінансаваньне палітычных партыяў», якую дэпутаты нібыта везьлі зь Літвы. Знайсьці не знайшлі, але й не прабачыліся. Які парлямэнт, такая і недатыкальнасьць. Але ж я вам скажу — калі грошы апазыцыі пачынаюць вазіць генэралы…

Ільхам Аліеў пойдзе на прэзыдэнцкія выбары ў Азэрбайджане замест бацькі Гейдара, які «верыць сыну як самому сабе». Асноўны канкурэнт Аліевых Расул Гуліеў зьняты з дыстанцыі. Ільхам абяцае стварыць 600 тыс. працоўных месцаў, разабрацца зь беспрацоўем і беднасьцю ды павялічыць валавы ўнутраны прадукт на 150% за пяць гадоў. Азэрбайджанцам якраз упару відэльцы, каб здымаць локшыну з вушэй, але народ у СНД жыве даверлівы. Яшчэ адзін такі абяцаў, што сярэдні заробак у Беларусі ў 2006 г. складзе 250 даляраў.

Як украсьці 182 мільёны

Самага багатага чэха Віктара Кожанага, амэрыканскі суд абвінавацiў у крадзяжы 182 млн даляраў. Гэтулькі грошай амэрыканскія інвэстары ўклалі праз рукі Кожанага ў «акцыі» азэрбайджанскага нафтавага канцэрну «Сокар». Кожаны ў 1998 г. абяцаў ім, што за даверaныя яму грошы ён выкупіць азэрбайджанскія прыватызацыйныя чэкі, якія праз пару месяцаў мусілі быць выменяныя на акцыі канцэрну. Аднак Баку не прыватызавала нафтавага канцэрну, а Кожаны пачаў тлумачыць раззлаваным інвэстарам, што яго ашукаў прэзыдэнт Азэрбайджану Гейдар Аліеў. Сярод інвэстараў, падманутых хітрым чэхам, — нават Калюмбійскі ўнівэрсытэт. Сам Віктар, цяпер ірляндзкі грамадзянін, жыве на Багамах.

Рамана Продзі, старшыня Эўракамісіі, заявіў, што пытаньне пра ўваходжаньне Украіны ў ЭЗ стаіць на парадку дня. Трэба толькі, каб краіна «зрабіла гэта магчымым».

Расейскі акадэмік **Віталь Гінзбург**, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі ў галіне фізыкі, хоча аддаць прэмію праўнукам. «Тэнісіст можа выйграць гэтыя грошы за адну гульню. Для мяне, вядома, гэта вялікія грошы, як і для любога расейца, які не зьяўляецца жулікам ці магнатам», — кажа навуковец.

Ганну Марыю Чаабу, 12-гадовую дачку найбагацейшага румынскага цыгана, аддалі замуж безь яе згоды. Пра вясельле было дамоўлена, калі Марыя мела сем гадоў, яе бацька нават атрымаў 500 залатых манэтаў выкупу. Бедная дзяўчына плакала, уцякала з царквы, кідалася да рэпарцёраў — усё дарэмна. А **Фрэдэрык**, прынц дацкі, у траўні ажэніцца з аўстралійкай Мэры Дональдсан. Пазнаёміліся яны на алімпіядзе ў Сыднэі. 31-гадовая юрыстка Мэры будзе першай аўстралійкай на эўрапейскім троне. Але ці апошняй? Дзесьці ў Аўстраліі пасьвіць авечак яшчэ адзін кавалер — брытанскі прынц Гары.

СМ

● КРЫЖАВАНКА ●



ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 5. Аконны ўзор з каляровага шкла. **6.** Бяз гэтае лінейкі крывой лініі не намалюеш як след. **10.** Залатая ... **11.** ... падзяляўся на якабінцаў, жырандыстаў і «балота». **12.** Беластоцкі беларускі тыднёвік. **13.** Можа быць страхавы, а можа быць і 007. **17.** Драпежная жывёлінка сямейства куніц. **19.** Першая беларуская опэра для дзяцей (напісаў Рыгор Пукст). **20.** Ён ёсьць у электрычнай лямпачцы, але мы яго ня бачым. **21.** Галоўны горад Татары. **25.** Старэйшына на Каўказе. **26.** Усё воднае покрыва зямлі або яго частка паміж мацерыкамі. **27.** Атрутна-лекавая расьліна з жоўтымі кветкамі. Дапамагае ад хваробаў страўніка, адпуўвае пацукоў. **30.** Азіяцкі антыпод мэліярацыйнае канавы. **32.** Сястра геамэтрыі. **33.** У нас ён «Нац...», у Расеі — «Цэнтра...». **34.** Загадчык карабельнае гаспадаркі, традыцыйна камандуе з дапамогай сьвістка або дудкі. **35.** Расейскі калега Эзопа і Ляфантэна.

ПА ВЭРТЫКАЛЯХ: 1. Інструмэнт для разразаньня дрэва; рыба; жонка, схільная да маралізатарства. **2.** Бавоўняная тканіна ўзорыстага пляценьня, а таксама непрадныя нагавіцы, папулярныя ў савецкі час. **3.** Насельнікі Рэспублікі Сахі. **4.** Ён мышэй баіцца. **7.** Вецер разбуральнай сілы. **8.** Сутыкненьне машынаў, караблёў. **9.** Маладняковец-доўгажыхар, пераклаў Шата Руставэлі. **14.** Вымова, павучаньне, якое «чытаюць». **15.** Заедак пад гарэлку ці віно. **16.** Найдаўжэйшая паралель. **18.** Князь Міхал Клеафас. **22.** Сталіца Турцыі. **23.** Парода сабакаў, выведзеная для паляваньня на мядзьведзяў. Вызначаецца зборкамі скуры на целе. **24.** Ім забіваюць казла. **28.** Расплаўленая агнявая маса ў нетрах Зямлі. **29.** Прасоленая і правяленая або правэнджаная хрыбтовая частка асятра ці лосося. **31**. Маладзевая перадача на БТ у пачатку 90-х. **33.** У табліцы Мендзялеева ён стаіць пасьля хлёру.

Склала Ада Плаўская

ЖАРТ

Павдлое вныікаў дсаелдаванньяў андаго англеськага ўінэрвыстэту, ня мае знчаэньня, у яікм пардаку рамзьешчаыня лтіары ў солве. Глаонўае, каб пешрая і аопншая літраы блыі на мецсы. Ішныя лтіары мгоуць сяатць у пноўым бсепраадку, усё андо тсэкт чтыаццеа без парблемаў.

Пырчныай гэатта зьяляўцца тое, што мы чыатем ня кжоную лірату псаабкоу, а ўсё совла.

Памыляюцца тыя, хто лічыць, нібыта ў Іраку йдзе вайна дэмакратыі супраць дыктатуры; гэта ўсяго толькі спрэчка гаспадарчых суб'ектаў.

● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

ВІТАНЬНІ

Анатоль, віншую з Днём настаўніка! Андрэй

КАНТАКТЫ

Алесю Бакачу з svtl@tut.by: не магу выканаць Вашу замову. Таму што Ваша е-скрыня не прымае e-mail-ы. Harrier@tut.by

IN MEMORIAM

Vasil Kiendyš

1 kastryčnika na 96-m hodzie zyćcia ŭ štacie Masačusets (ZŠA) pamior zasłužany na carkoŭnaj i nacyjanalnaj adradženskaj nivie biełaruski dziajač — a.pratapraśviter Vasil Kiendyš. Ad 1968-ha da 1973-ha hodu jon kiravaŭ parafijaj BAPC u Hajlend Parku dy ŭśled da 1981-ha byŭ kiraŭnikom parafiji Katedralnaha Saboru Śv.Kiryły Turaŭskaha ŭ Bruklinie. Paśla piacidzionnaje pracy ŭ pramysłoŭaści rehularna dajaždžaŭ na adpravy ŭ abiedźvie carkvy ažno z dalokaha Masačusetsu. Zyćcio i pastyrskaja dziejnaść a.Pratapraśviciera vartyja pierajmańnia ŭ paru našaje carkoŭnaje j nacyjanalnaje biady, prykład achviarnaści ŭ słužbie Bohu j Baćkaŭščynie. Niachaj ža naš Zbaŭca Isus Chrystos praz malitvy Božaje Maci i ŭsich Śviatych Biełaruskaje Ziamli daść dušy niezabytnaha ajca Vasila Kiendyša zasłužany supačyn u raji dy paspryjaje, kab našaja carkoŭnaja j nacyjanalnaja sprava, na jakuju jon pracavaŭ, abiarnułasia ŭ žyćcio.

Barys Daniluk

Падкажыце, калі ласка, дзе можна знайсьці тэксты песень Зьміцера Бартосіка. Вельмі патрэбна. BSM siarguk@tut.by

Нацыянальны цэнтар творчасьці дзяцей і моладзі (вул. Кірава, 14, аўд.308) працягвае набор дзяцей і моладзі ў гурток дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вырабы са скуры, графіка, малюнак, жывапіс. Аўторак, 15.00-20.00, чацьвер, 15.00-20.00

Студэнтка прыме ў падарунак кампутар. Пэйдж.: 233-00-00, аб. 21739

Малады Фронт —змагайся за Радзіму! Т.: 8-029-755-69-90, 201-93-14 (Зьміцер), 211-00-00, аб.89545 (Барыс)

«Гарадзенская вандроўка» запрашае 12 кастрычніка на экскурсію «Таямніцы Гарадніцы». Збор ля Лялечнага тэатру а 12.00 гадзіне

ПРАДАМ

Новую каляску-джып вытворчасьці Польшча. Кошт 100$. Т.: (8-01773) 6-44-43

Жаночы парасон (новы, каляровы). Т. (у Гомелі): 45-11-51

Здыму аднапакаёвую кватэру (раён ст.м.«Усход» або Ўручча). Нядорага. Т.: 8-029-410-00-23

Беларускія кнігі, CD, аўдыё, відэа, значкі ёсьць у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю з 9.00 да 13.00

ЗБМ «Беларускі Шлях»

запрашае на падарожжа

«Замкі Беларусі»

19 кастрычніка (нядзеля) па маршруце:

Менск – Валожын – Дуды – Іўе – Ліпнікі – Ліда – Навагрудак – Любча – Шчорсы – Мір – Менск.

11 кастрычніка: Будслаў – Крывічы – Нарач – Камай – Паставы – Дунілавічы – Лучань – Глыбокае.

Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)

ПРАЦА

Нямецкая ды ангельская мовы. Кантрольныя работы, пераклады, рэпэтытарства (5 курс МДЛУ). Т.: (01773) 6-32-95

Праца за мяжой — гэта рэальнасьць! Для атрыманьня анкеты і інфармацыі дашліце капэрту з Вашым адрасам. А/с 107, 210026, Віцебск

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі парыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3475. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 11.00 8.10.2003.

Замова № 5204.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а